ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 28 (2814) • Пятніца, 9 ліпеня 1976 г. • Цана 8 кап.

# ШТУРМ КАСМІЧНАЙ ПРАСТОРЫ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

## На арбіце — касмічны карабель «Саюз-21»

Як паведамлялася, у адпаведнасці з праграмай даследаванняў у калязямной касмічнай прасторы 6 ліпеня 1976 года ў 15 гадзін 09 мінут маскоўскага часу ў Савецкім Саюзе ажыццёўлены запуск касмічнага карабля «Саюз-21», які пілатуецца экіпажам у саставе камандзіра карабля, Героя Савецкага Саюза, лётчыка-касманаўта СССР палкоўніка Валынава Барыса Валянцінавіча і бортінжынера падпалкоўніка-інжынера Жолабава Віталія Міхайлавіча.

Праграмай палёту карабля «Саюз-21» прадугледжваецца правядзенне сумесных эксперыментаў з арбітальнай навуковай станцыі «Салют-5», выведзенай на калязямную арбіту 22 чэрвеня 1976 года.

7 і 8 ліпеня касмічны карабель «Саюз-21» працягваў палёт.

Паводле даных тэлеметрычнай інфармацыі і дакладаў касманаўтаў бартавыя сістэмы карабля функцыяніруюць нармальна.

Касманаўты Б. В. ВАЛЫНАЎ і В. М. ЖОЛАБАЎ пася паспяхова праведзенай у строга разліковы час стыкоўкі і пераходу на борт арбітальнай навуковай станцыі «Салют-5» прыступілі да раскансервацыі і праверкі навуковай апаратуры.

Экіпаж даў высокую ацэнку абсталяванню і камфортным умовам, якія падтрымліваюцца ў герметычных адсеках.

Самаадчуванне таварышаў Валынава і Жолабава добрае. Палёт касмічнага карабля «Саюз-21» працягваецца.

## МАРШРУТАМ ЛЕНІНСКІМ...

*Прарваў зямное*
*прыцягненне,*
*Дарогу ў космасе прасек*
*Магутнай сілай апрылення*
*Савецкі мужны чалавек.*

*Пра гэта толькі сніў і марыў*
*Старэнькі свет і новы свет,*
*А наш праслаўлены Гагарын*
*Праклаў да зорак першы*
*след.*

*Сярпа і Молата дзяржава*
*Паслала зноў сваіх сыноў*
*Яшчэ вышэй узнесці славу,*
*Яна нібыта з перуноў.*

*Адлітая, грыміць над светам,*
*Пад ясным сонцам і зарой*
*Ляціць імклівасцю ракеты,*
*Зіхціць нязгаслаю красой.*

*Маршрутам ленінскім да*
*мэты*
*Вядзём крылаты свой палёт,*
*Пішчотай ленінскай*
*сагрэты*
*Радзіма наша і народ.*

*Таму не цуд, таму не дзіва*
*Палёт імклівы да планет.*
*На нашу зорную Радзіму*
*Глядзіць з надзеяй белы*
*свет.*

Антон БЯЛЕВІЧ.

## Старонкі біяграфій

### Палкоўнік ВАЛЫНАЎ Барыс Валянцінавіч

Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР Барыс Валянцінавіч Валынаў нарадзіўся ў 1934 годзе ў Іркуцку. Пасля заканчэння Валгаградскага ваеннага авіяцыйнага вучылішча служыў у авіяцыйных часцях Савецкай Арміі.

У атрад касманаўтаў Б. В. Валынаў залічаны ў 1960 годзе. Неаднаразова быў дублёрам камандзіраў касмічных караблёў.

У 1968 годзе без адрыву ад работы ў Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў ён паспяхова закончыў Ваенна-паветраную інжынерную акадэмію імя М. Я. Жукоўскага.

Свой першы касмічны палёт Барыс Валянцінавіч зрабіў у студзені 1969 года ў якасці камандзіра карабля «Саюз-5».

Б. В. Валынаў — член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1958 года.

Жонка касманаўта Тамара Фёдараўна — інжынер. Сын Валынавых — 18-гадовы Андрэй — студэнт Маскоўскага інстытута інжынераў транспарту. Дачка — 11-гадовая Таццяна — школьніца.

### Падпалкоўнік ЖОЛАБАЎ Віталій Міхайлавіч

Віталій Міхайлавіч Жолабаў нарадзіўся ў 1937 годзе ў вёсцы Збур'еўка Херсонскай вобласці.

Пасля заканчэння Азербайджанскага інстытута нафты і хіміі ў 1959 годзе стаў афіцэрам Савецкай Арміі. Працаваў інжынерам-выпрабавальнікам у розных вайсковых часцях.

У атрад касманаўтаў Віталій Міхайлавіч быў залічаны ў студзені 1963 года. Прайшоў поўны курс падрыхтоўкі да касмічных палётаў, быў дублёрам бортінжынера арбітальнай навуковай станцыі «Салют-3».

В. М. Жолабаў — член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1966 года. У 1974 годзе без адрыву ад работы ў Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў ён паспяхова закончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна.

Жонка касманаўта Лілія Іванаўна — інжынер. Дачка Жолабавых — 14-гадовая Алена — школьніца.

# ЗБОР ТВОРАЎ Івана ШАМЯКІНА

**Выдавецтва «Мастацкая літаратура» рыхтуе да выдання новы збор твораў Івана Шамякіна. Карэспандэнт штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» звярнуўся да рэдактара збору Пятра Шаўцова з просьбай расказаць пра гэтае выданне.**

*— Вядома, што ў 1965—1966 гадах выдавецтва «Беларусь» выдала пяцітомнік твораў Івана Шамякіна. За прайшоўшы час народны пісьменнік апублікаваў цэлы шэраг твораў, сярод якіх раманы «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», аповесці «Першы генерал», «Браняпоезд «Таварыш Ленін», «Шлюбная ноч», «Гандлярка і паэт». Сёння мы ўжо не можам ўявіць беларускай літаратуры без гэтых твораў. Зразумела, нельга ўявіць і збору твораў пісьменніка без іх.*

*Новае выданне збору твораў Івана Шамякіна будзе шасцітомным. Яго складуць раманы і аповесці. Будуць прадстаўлены і апавяданні. Але тыя, якія таксама можна назваць аповесцямі. Зусім не ўключаюцца ў новы збор твораў п'есы, кінасцэнарыі, артыкулы і ўвогуле публіцыстычныя творы, што з'явіцца вызначальным для шасцітомніка.*

*Выданне разлічана на тры гады, пачынаючы з 1977, і закончыцца напярэдадні шасцідзесяцігадовага юбілею народнага пісьменніка. Першыя два тамы выйдуць у пачатку 1977 года. Цяпер яны знаходзяцца ў вытворчасці. Трэці і чацвёрты тамы выйдуць у 1978, а пяты і шосты — у 1979 гадах.*

*Адкрываецца шасцітомнік Ленініянай, творамі, гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі — аповесцямі «Першы генерал» і «Браняпоезд «Таварыш Ленін», якія разам з раманам «Глыбокая плынь» складаюць змест першага тома. У першым жа томе змяшчаецца артыкул доктара філалагічных навук Паўла Дзюбайлы «Крыніца творчасці — сучаснасць», у якім аналізуецца творчасць раманіста Івана Шамякіна.*

*У другім томе чытачы знойдуць раман «Крыніцы», аповесць «Ах, Міхаліна, Міхаліна», апавяданні «Матрос з «Алега», «Хлеб», «Бацькі і дзеці», «Дзівак-чалавек», «Аксана», «Першае спатканне», «Дзеці настаўніцы», «Непрыгожая».*

*У трэцім томе — пенталогія «Трывожнае шчасце», у чацвёртым — раман «Сэрца на далоні» і аповесць «Шлюбная ноч», у пятым — раман «Снежныя зімы» і аповесць «Гандлярка і паэт», у шостым — раман «Атланты і карыятыды».*

*Неўзабаве ў кнігарні паступіць рэкламны плакат і праспект шасцітомнага збору твораў Івана Шамякіна і пайсюль пачнецца прыём падпіскі, але і сёння можна ўжо аформіць падпіску ў кнігарнях падпісных выданняў.*

*Арыентыровачны кошт выдання 7 руб. 80 кап. Кошт аднаго тома — 1 руб. 30 кап. Пры афармленні падпіскі ўносіцца плата ў размеры кошту аднаго тома, гэта значыць — адзін рубель 30 капеек. Задатак улічваецца пры атрыманні апошняга, шостага тому збору твораў.*

# УЗНАГАРОДА МАСКОЎСКАМУ ТЭАТРУ

Больш чым тры тыдні з нязменным поспехам ідуць у Мінску гастролі Дзяржаўнага ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Массавета. Майстры маскоўскай сцэны паказалі мінчанам і гасцям беларускай сталіцы дванаццаць лепшых пастановак. Тры з іх— прэм'еры, спецыяльна прымеркаваныя да паездкі ў Беларусь. Больш чым 65 тысяч гледачоў пабывалі на спектаклях гэтага праслаўленага драматычнага калектыву. Вядучыя артысты тэатра сустракаліся з рабочымі мінскіх прадпрыемстваў, працаўнікамі вёскі, творчай інтэлігенцыяй, воінамі.

5 ліпеня Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. А. Сурганаў прыняў кіраўнікоў і групу артыстаў тэатра. Ён уручыў Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, якой калектыў тэатра імя Массавета ўзнагароджаны за вялікую работу па мастацка-эстэтычнаму абслугоўванню працоўных горада Мінска ў перыяд гастролей.

У цёплай, сяброўскай гутарцы Ф. А. Сурганаў пажадаў тэатру новых вялікіх поспехаў у яго творчай дзейнасці.

Ад імя калектыву галоўны рэжысёр тэатра, народны артыст СССР, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР, Герой Сацыялістычнай Працы Ю. А. Завадскі выказаў сардэчную падзяку за высокую ўзнагароду і цёплы прыём, аказаны тэатру на беларускай зямлі.

●

Спектаклем «Дзень прыезду — дзень ад'езду» В. Чарных, прысвечаным XXV з'езду КПСС, завяршыліся 6 ліпеня мінскія гастролі Дзяржаўнага ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Массавета. З творчасцю вядомага драматычнага калектыву краіны, які паказаў дванаццаць твораў рускіх, савецкіх і зарубежных аўтараў пазнаёміліся дзесяткі тысяч працоўных беларускай сталіцы.

Пасля заканчэння завяршальнага спектакля гледачы, якія сабраліся ў зале Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, узнагародзілі ўдзельнікаў прадстаўлення гарачымі апладысментамі ,паднеслі ім букеты кветак. Ад імя ўсіх беларускіх аматараў тэатральнага мастацтва міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч сардэчна падзякаваў калектыву тэатра імя Массавета за радасць творчых сустрэч, высокае сцэнічнае майстэрства, якія ён падарыў працоўным Беларусі, і пажадаў дарагім гасцям новых вялікіх поспехаў у іх высакароднай дзейнасці. Галоўны рэжысёр тэатра Ю. А. Завадскі выказаў пачуцці шчырай удзячнасці ўсіх удзельнікаў гастролей за цёплы прыём, аказаны ім на беларускай зямлі, і высокую ацэнку іх працы.

На заключным прадстаўленні тэатра імя Массавета прысутнічалі таварышы П. М. Машэраў, Ф. А. Сурганаў, Ц. Я. Кісялёў, А. Н. Аксёнаў, У. Е. Лабанок, Н. Л. Сняжкова.

**БЕЛТА.**

# СУСТРЭЧЫ

Гэта было цікавае і карыснае мерапрыемства. Ажыццявілі яго рэдкалегія часопіса «Неман» і Дзяржкамітэт Савета Міністраў БССР па прафтэхадукацыі. У Барысаўскім тэхнічным вучылішчы № 121 адбылося выязное пасяджэнне рэдакцыйнай калегіі часопіса, які дарэчы, трымае шэфства над прафесіянальна-тэхнічнымі вучылішчамі рэспублікі. Адбылася сустрэча пісьменнікаў з навучэнцамі і выкладчыкамі тэхнічнага вучылішча. Галоўны рэдактар часопіса «Неман» А. Макаёнак расказаў аб творчых планах рэдакцыі. Свае новыя вершы прачыталі паэты Б. Спрынчан і Г. Бубноў.

Са словамі шчырай падзякі выступілі дырэктар вучылішча Р. Еўзельман, бібліятэкарка Г. Жукоўская, навучэнкі Т. Пажытка і Л. Федарчук.

У рабоце пасяджэння выязной рэдкалегіі часопіса «Неман» прыняў удзел старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па прафтэхадукацыі Л. Максімаў.

**П. БАРОДКА.**

●

У індустрыяльным тэхнікуме выступілі віцебскія літаратары. Тэма гаворкі: «Пісьменнік і пяцігодка». Паэт Д. Сімановіч расказаў навучэнцам аб рабоце з'езда пісьменнікаў рэспублікі, пазнаёміў з творчасцю мясцовых празаікаў і паэтаў. Пасля свае вершы прачыталі У. Немізанскі, У. Папковіч, Ю. Доктараў.

# НОВЫ ДОМ КУЛЬТУРЫ

Новы Дом культуры пабудаваны на цэнтральнай сядзібе калгаса імя Калініна Слуцкага раёна. У ім—глядзельная зала на чатырыста месц, бібліятэка, спартыўная зала, пакоі для работы гурткоў мастацкай самадзейнасці.

# *Весткі з Міншчыны*

### ТВОРЧАСЦЬ СЯБРОЎ

Выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва народных умельцаў з літоўскага горада Папявежыса адкрылася ў цэнтральнай бібліятэцы імя Н. К. Крупскай горада Маладзечна. На ёй экспануецца звыш дваццаці работ народных майстроў. Гэта — посцілкі Р. Зелтынене і Г. Шукене, пасценныя панно Р. Мілярэне і іншыя.

### ЦІКАВАЯ ПАЕЗДКА

У горадзе Валгаградзе пабывалі ўдзельнікі народнага мужчынскага хору і народнага вакальнага ансамбля «Журавінка» вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ». Яны выступілі з канцэртамі ў Валгаградскім Палацы культуры прафсаюзаў, а таксама па мясцоваму тэлебачанню.

### ПРА МУЗЕЙ У ІВЯНЦЫ

У кіёскі «Саюздруку» вобласці паступіў у продаж буклет «Музей Ф. Э. Дзяржынскага». У ім расказваецца аб абласным музеі Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага, які знаходзіцца ў г. п. Івянец

# *РАДЫЁСПЕКТАКЛЬ «МІНСКІ НАПРАМАК»*

На Беларускім радыё адбылася прэм'ера, якая прысвечана 32-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Спектакль па раману народнага пісьменніка рэспублікі, лаўрэата Ленінскай прэміі І. Мележа «Мінскі напрамак» паставіла галоўны рэжысёр рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач С. Гурыч. У ім прынялі ўдзел акцёры тэатра імя Янкі Купалы і іншых тэатраў Мінска. Музыку напісаў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР І. Лучанок, вершы песень — народнага паэта Беларусі П. Панчанкі.

У апошнія гады радыёслухачы пазнаёміліся таксама са спектаклямі па творах М. Лынькова, І. Шамякіна, А. Савіцкага, І. Навуменкі і іншых беларускіх пісьменнікаў.

**І. ПАУЛЮКОЎСКІ.**

# ДРУЖАЦЬ ХІМІКІ З ТЭАТРАМ

Акцёры Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра добрыя шэфы шматтысячнага калектыву вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя У. І. Леніна. Закончыўся другі навучальны год універсітэта культуры, тэатральны факультэт якога плённа працуе ў тэатры.

Заняткі наведвала больш за сто рабочых інжынераў, тэхнікаў і служачых прадпрыемства. Апошнюю суботу кожнага месяца, калі адбываліся заняткі, у аб'яднанні «Хімвалакно» назвалі «Днём тэатра». На спектаклі прыходзяць не толькі слухачы універсітэта культуры, але ўсе, хто любіць, хто цікавіцца мастацтвам. Пры жаданні можна пабываць за кулісамі, паглядзець, як рыхтуюцца акцёры да спектакля, як устанаўліваюцца дэкарацыі, хто «загадвае» шумавымі эфектамі. Перад спектаклем рэжысёр чытае лекцыю. Пасля прагляду пастаноўкі паладжваецца абмеркаванне спектакля.

Вялікую цікавасць, напрыклад, выклікала лекцыя рэжысёра Л. Казлоўскага «Савецкі тэатр — актыўны памочнік партыі, магутны сродак ідэйнага выхавання працоўных». Запомнілі слухачы расказ рэжысёра А. Раеўскага аб гісторыі Магілёўскага абласнога тэатра, лекцыю галоўнага рэжысёра тэатра Ю. Міроненкі «Як ствараецца спектакль».

У абмеркаванні спектакляў «Развітанне ў чэрвені», «Мінулым летам у Чулімску», «Апошняя інстанцыя» і іншых актыўны ўдзел прымалі машыніст аднаго з цэхаў прадпрыемства А. Пупейка, старшы майстар вытворчасці штапельнага валакна А. Марозава, намеснік начальніка тэхаддзела В. Бяцяева, дырэктар Дома культуры В. Будняцкі і іншыя.

Слухачы тэатральнага факультэта сустрэліся з драматургам А. Дзялендзікам, які быў госцем калектыву драмтэатра.

Рэжысёры і акцёры часта бываюць у гасцях у хімікаў. Рабочыя гаснінна прымалі артыстаў А. Рудакова, С. Бульчыка, Ю. Труханава, В. Сівіцкага і іншых. Такія сустрэчы адбываюцца ў чырвоных кутках цэхаў. Акцёры паказваюць сцэны са спектакляў, расказваюць пра сваю работу над роллю. Хімікі ў сваю чаргу знаёмяць дарагіх гасцей з вытворчасцю, з прадукцыяй, якую выпускае іх прадпрыемства.

**Л. ЗАКАШАНСКІ.**

# *КНІГА НА СЛУЖБЕ ПЯЦІГОДКІ*

**На здымку: на кніжных прылаўках багаты выбар літаратуры.**

Фота Ул. КРУКА.

У гэтыя дні, калі савецкія людзі прыкладаюць вялікія намаганні для выканання гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, асабліва ўзрос попыт на творы класікаў марксізму-ленінізму, грамадска-палітычную літаратуру, навукова-тэхнічныя, сацыяльна-эканамічныя выданні. У іх—адказ на надзённыя пытанні нашага жыцця, тое, што дапамагае быць свядомым будаўніком камуністычнага грамадства.

З мэтай больш паспяховай прапаганды і распаўсюджвання матэрыялаў XXV з'езда КПСС і іншай грамадска-палітычнай, навукова-тэхнічнай, сацыяльна-эканамічнай і вытворчай літаратуры ў Заводскім раёне беларускай сталіцы праходзіць свята, пад дэвізам «Кніга на службе пяцігодкі».

Арганізатары гэтага важнага мерапрыемства — Заводскі раённы камітэт партыі, Мінскі абласны кнігагандаль, гарадское аддзяленне таварыства аматараў кнігі.

Урачыстае адкрыццё свята адбылося 6 ліпеня на плошчы каля Палаца культуры аўтамабільнага завода. На ім выступіў сакратар Заводскага райкома партыі П. М. Садоўскі.

Пра выданне грамадска-палітычнай і спецыяльнай літаратуры ў рэспубліцы, пра кантакты выдавецкіх работнікаў з прамысловымі прадпрыемствамі раёна гаварылі намеснік старшыні Дзяржкамвыда Р. А. Ткачук, галоўны рэдактар выдавецтва «Навука і тэхніка» М. М. Акаловіч.

«Наша свята, — сказаў лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, старшыня праўлення Мінскага гарадскога аддзялення аматараў кнігі Генадзь Бураўкін, — звязана з выдатнай падзеяй у жыцці савецкага народа — XXV з'ездам КПСС. І прыемна, што праходзіць яно каля гіганта беларускай індустрыі».

Ажыўлена было ля кніжных столікаў. Вялікім попытам карысталіся ў наведвальнікаў творы класікаў марксізму-ленінізму, выданні прамоў і артыкулаў Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, відных партыйных і дзяржаўных дзеячаў, дзесячаў замежнага камуністычнага і рабочага руху, матэрыялы XXV з'езда КПСС.

Наведвальнікі маглі пазнаёміцца і з тэматычнымі планамі выдавецтваў краіны і рэспублікі, зрабіць папярэднія заказы.

У плане свята, якое працягнецца да 14 ліпеня, — тэматычныя выстаўкі, выстаўкі-продажы кніг, чытацкія канферэнцыі, літаратурныя вечары, сустрэчы з пісьменнікамі і выдавецкімі работнікамі, якія адбудуцца на аўтамабільным, трактарным, маторным, шарыкападшыпнікавым заводах, у будаўнічым трэсце № 5 і ў іншых вытворчых калектывах Заводскага раёна, а таксама ў месцах масавага адпачынку працоўных.

Будуць праведзены і грамадскія агляды па лепшым пярвічнаю арганізацыю таварыства кнігалюбаў і бібліятэку прадпрыемства па прапагандзе і распаўсюджванню літаратуры ў інтэрнатах, рабочых і вытворчых калектывах.

Завершыцца свята раённай навукова-практычнай канферэнцыяй па праблемах планавання, выпуску і распаўсюджвання навукова-тэхнічнай і вытворчай літаратуры. На яе будуць запрошаны перадавікі і наватары вытворчасці, навукова-тэхнічныя работнікі і служачыя прадпрыемстваў, работнікі бібліятэк, прадстаўнікі пярвічных арганізацый таварыства кнігалюбаў, дырэктары народных кніжных магазінаў.

**І. ВІШНЕЎСКІ.**

Валянцін ЛУКША

# ЗДЗЯЙСНЕННЕ

ПРАЦА — вышэйшае прызванне чалавека — заўсёды была, ёсць і застанецца самай ганаровай яго справай. У народзе нездарма гавораць: «Праца чалавека трымае і ўзбагачае, а гультайства псуе».

Праца ўпрыгожвае чалавека. Гэта — аксіёма. Хто з нас з заміраннем сэрца не сачыў за віртуознай работай мантажніка-высцінніка, зваршчыка, машыніста вежавага крана, экскаватарыстыка? У працы чалавек далучаецца да галоўнай сілы, якая пераўтварае свет. У ёй і толькі ў ёй раскрываецца глыбінная духоўная сутнасць асобы. І чым больш сумленныя адносіны людзей да працы, тым больш высокія іх пачуцці і перыванні.

Праца — душа нашага імклівага руху наперад, арганізуючая і рухаючая сіла грамадства.

Новы этап у гістарычным летапісе нашай краіны — дзесятая пяцігодка — пачаўся на трывалым грунце, з высокіх рубяжоў эканамічнага і сацыяльнага развіцця, якія ўзяты, дзякуючы паслядоўнаму выкананню прадвызначэнняў XXIV з'езда КПСС.

Мы ўвайшлі ў наступны этап жыцця, наступны этап камуністычнага будаўніцтва, этап здзяйснення рашэнняў гістарычнага XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, за работай якога з неаслабнай увагай сачылі не толькі мы, але і ўсе людзі добрай волі на планеце. Сачылі і захапляліся велічыню нашых планаў, грандыёзнасцю перспектыў, па шмат разоў учытваліся ў лаканічна і дакладна сфармуляваную галоўную задачу дзесятай пяцігодкі: яна «заключаецца ў паслядоўным ажыццяўленні курсу Камуністычнай партыі на ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове дынамічнага і прапарцыянальнага развіцця грамадскай вытворчасці і павышэння яе эфектыўнасці, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадукцыйнасці працы, усямернага паляпшэння якасці работы ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі».

Векапомныя справы нашага народа, яго скіраванасць у будучыню прыпялі канкрэтнае выражэнне ў зацверджаных з'ездам «Асноўных напрамках развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады».

Савецкія людзі, поўныя аптымізму і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні з вялікім энтузіязмам актыўна ўключыліся ў рэалізацыю планаў партыі Леніна. Струменяць вогненныя патокі металу ў ліцейных цэхах, новыя кіламетры сярэбраных рэек кладуцца на трасе магістралі веку — БАМе, сотні тон «каменю ўрадлівасці» — сільвініту — падымаецца з шахт Салігорска. Клопатамі аб будучым ураджаі заняты працаўнікі сяла.

Жыць і працаваць... Простыя, усім зразумелыя словы. У нашым панятці — словы-сінонімы. Бо неад'емныя жыццё ад працы, праца ад жыцця. А для гэтага, мы добра разумеем, трэба дадаць яшчэ адно слова. Слова — сінонім працы і жыцця — Мір.

Праца і жыццё пад мірным небам... Запаветная мара чалавецтва. Чацвёртае дзесяцігоддзе савецкія людзі не знаюць вайны. І ўсё гэта дзякуючы міралюбіваму знешнепалітычнаму курсу нашай дзяржавы, Камуністычнай партыі, нястомнага змагара за мір Леаніда Ільіча Брэжнева.

Думамі аб міры, сонцы, дні наступным былі прасякнуты глыбокі і ўсеабдымны Справаздачны даклад ЦК КПСС XXV з'езду, выступленні дэлегатаў і гасцей партыйнага форуму. Думамі аб міры, стваральнай працы напоўнены сэрцы ўсіх савецкіх людзей.

Прыслухайцеся да рытмічнага пошуму заводскіх цэхаў, да руплівай працы на жывёлагадоўчых фермах і палях і вы адчуеце, што ў рабочы рытм нашай краіны ўлілася новая, святочная нота. Савецкія людзі працуюць з асаблівай энергіяй і настойлівасцю, з сапраўднай гордасцю за свае штодзённыя справы — менавіта іх праца, майстэрства, энергія і натхненні былі галоўнай тэмай высокай партыйнай размовы ў Крамлі.

Выдатнай адзнакай велічы працоўнага подзвігу народа з'явілася адкрыццё Усесаюзнай Дошкі гонару на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Сярод лепшых з лепшых на ёй прадстаўлена больш за трыццаць калектываў Беларусі — пераможцаў спаборніцтва, правафланговых дзевятай пяцігодкі — ордэна Леніна калгас «Аснежыцкі» Пінскага раёна, ордэна Леніна Аршанскі льнокамбінат, Лукомльская ДРЭС імя 50-годдзя СССР, Бабруйскі лясгас, Мінскі паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа, эксперыментальная база «Вусце» Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства, Мастоўскае раённае аб'яднанне «Сельгастэхніка», Гомельскі ордэна Леніна завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Беларускае аб'яднанне па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў «Белаўтамаз», Магілёўскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга мясакамбінат...

Цалкам і поўнасцю адабраючы перспектывы нашага развіцця, мільёны будаўнікоў новага грамадства ад усяго сэрца заяўляюць: «Планы партыі — гэта нашы планы, справа партыі — гэта наша кроўная справа!».

Па-дзелавому, з энтузіязмам пачаў наш народ дзесятую пяцігодку. Практыка сацыялістычнага спаборніцтва ўзбагацілася каштоўным вопытам творчага пошуку, многімі патрыятычнымі пачынаннямі. Так, перадавыя брыгады Маскоўскага завода імя Уладзіміра Ільіча выступілі з ініцыятывай: «Пяцігодцы якасці — рабочую гарантыю». Шырокае распаўсюджанне атрымалі пачыны ленінградцаў — «Ад высокай якасці работы кожнага — да высокай эфектыўнасці працы калектыву», прадпрыемстваў Львоўскай вобласці па распрацоўцы і ўкараненню комплекснай сістэмы кіравання якасцю прадукцыі, працаўнікоў сяла Алтайскага краю і Растоўскай вобласці, якія выступілі пачынальнікамі спаборніцтва за максімальнае выкарыстанне рэзерваў саўгаснай і калгаснай вытворчасці.

Увасабленнем творчай актыўнасці мас, іх імкнення паспяхова ажыццявіць прадвызначэнні партыі з'яўляюцца павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы, сустрэчныя планы, дагаворы аб садружнасці, развіццё настаўніцтва...

Творчая, дзелавая атмасфера, — вось, бадай, самая характэрная прыкмета нашага сённяшняга дня. Перадавыя калектывы рэспублікі, як і ўсёй нашай краіны, працуюць над выкананнем напружаных сацыялістычных абавязацельстваў па датэрміноваму і высакаякаснаму выкананню заданняў першага года дзесятай пяцігодкі. Сярод іх — мінскія аўтамабілебудаўнікі, аршанскія тэкстыльшчыкі, наваполацкія нафтахімікі, брэсцкія дываноўшчыкі, працаўнікі палёў і фермаў...

— Дзевятую пяцігодку наша брыгада завяршыла яшчэ ў красавіку 1974 года, — сказаў брыгадзір мантажнікаў Гродзенскага домабудаўнічага камбіната, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Міхаіл Сямёнавіч Цярэшка. — За пяцігоддзе намі зманціравана 225 тысяч квадратных метраў жылля. Выпрацоўка ж на аднаго рабочага складае 83 тысячы 600 рублёў у год. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў сярод будаўнікоў краіны. Дзесятую, юбілейную пяцігодку мы выпрацавалі выканаць за тры гады і восем месяцаў. Для гэтага зроблена ўжо нямала. Датэрмінова асвоілі тэхналогію мантажу новай серыі дзевяціпавярховых дамоў.

А кіраўнік механізаванага звяна па вырошчванню бульбы калгаса «Шлях Леніна» Бабруйскага раёна, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Р. Курлянчык, выказваючы думкі сваіх калег, дадаў:

— Наша звяно будзе вырошчваць бульбу на сарака гектарах. Летась сабралі з кожнага гектара па 308 цэнтнераў клубняў. Сёлета наша абавязацельства — атрымаць не менш, чым па 315 цэнтнераў...

Актыўная жыццёвая пазіцыя, самаадданая праца на карысць Радзімы. Што больш узвышае чалавека! Робіць яго Чалавекам, гаспадаром сваёй краіны, свайго лёсу.

Згадваю, як сёння раніцай руплівай хадой прыйшоў на рыштаванні Наваполацкага хімічнага волата Мікалай Сямёнавіч Кускоў. Засяроджанасць на твары, жывыя, усмешлівыя вочы. Упэўнены, што і ў гэты будзённы, але ў той жа час і велічны дзень пяцігодкі калектыў, які ўзначальвае чалавек са сцяжком дэпутата Вярхоўнага Савета БССР на лацкане пінжака, працуе плённа, на выдатна. Чаму такая ўпэўненасць? Менавіта таму, што ў традыцыі Кускова і яго калег працаваць так, а не інакш, менавіта ў той жа актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Памятаю, як васемнаццаць гадоў таму прыехаў русявы разанскі хлопец Кускоў на Полаччыну да сваякоў жонкі Марыі. Нафтабуд тады рабіў першыя крокі. Прыглядзеўся Мікола да будоўлі, падзівіўся яе маштабам і, што называецца, «прыкіпеў» да гэтай зямлі. Узначальваў камсамольска - маладзёжную брыгаду па ўзвядзенню першых кварталаў горада, працаваў на рыштаваннях вытворча-тэхнічнай базы, нафтаперапрацоўчага завода, хімічнага камбіната... Не памятаю, каб калі адступіў перад цяжкасцямі Мікалай Кускоў. Не было такога. Яго, сціплага, сумленнага працаўніка, выдатнага арганізатара неаднаразова выбіралі ў партыйны камітэт, дэпутатам мясцовага Савета. Цяпер ветэран ордэна Леніна трэста № 16 Нафтабуда Мікалай Сямёнавіч Кускоў — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, ардэнаносец, усімі паважаны чалавек.

— Пяцігодка, — гаворыць ён, — не толькі наша агульная справа, але і справа кожнага з нас. Як будзе працаваць кожны — залежыць не канчатковы вынік.

Дакладныя думкі, слушныя.

У брыгадзіра Мінскага паліграфічнага камбіната імя Я. Коласа Мікалая Мікалаевіча Зянькова маштабы меншыя. Не тое, што ў Кускова — завод, горад, рэспубліка. Але і на сваім рабочым месцы Зянькоў знайшоў сябе. Выхаванец прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча паліграфістаў № 32, ён у дасканаласці авалодаў прафесіяй, стаў настаўнікам моладзі.

— Галоўнае, — кажа Зянькоў, — не тое, дзе працуеш, а як працуеш. Бо ў кожнай справе трэба знайсці рамантыку, сябе, працаваць творча, з агеньчыкам.

Сваёй самаадданай працай савецкія людзі закладваюць трывалую базу паспяховага ажыццяўлення планаў дзесятай пяцігодкі. Бо кожны працаўнік Краіны Саветаў памятае вялікі ленінскі запавет: ісці абавязкова далей, дабівацца абавязкова большага. І наш 255-мільённы савецкі народ, згуртаваны Камуністычнай партыяй у непарушную працоўную сям'ю, рубеж за рубяжом бярэ ўсё новыя вышыні ў камуністычным будаўніцтве.

**Мы ў працы**
**заўсёды ўпартыя.**
**І ў сэрцах**
**мільёнаў людзей:**
**Здзейснім планы**
**ленінскай партыі,**
**Бо прызвання**
**няма**
**вышэй!**

**«Пяцігодку за тры з паловай гады» — пад такім дэвізам на галоўным прадпрыемстве Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя У. І. Леніна працуе звыш трохсот рабочых. Сярод іх тыя, хто задае тон у спаборніцтве за датэрміновае завяршэнне пяцігадовага задання, — камсамолка Надзея Чыкава (на здымку). Ужо два гады носіць яна ганаровае званне — «выдатнік якасці». А нядаўна на конкурсе прафесіянальнага майстэрства перамотчыц прадпрыемства Надзея Чыкава заваявала званне — «лепшая па прафесіі».**

Фота А. НІКАЛАЕВА. (БЕЛТА).

## Мечыслаў ШАХОВІЧ

### ЯНКУ КУПАЛУ

Нібы на свята, на спатканне
Іду. Такая цішыня,
Што чую песняра дыханне
У рытме сённяшняга дня.

Вятры, вы крылы тут складзіце!
На міг напружу слых і зрок:
І ажыве ён у граніце —
І нам насустрач зробіць крок.

І заіскрацца сонцам вочы —
І з новай песняй да людзей
Ён пойдзе. Мы за ім пакрочым,
У хату родную — музей.

Гасцінна дзверы Ён расчыніць —
І хвалявання не суняць.
Сюды ракой жывою хлыне
Яго вялікая радня...

Я адчуваю пульс паэта
У кожным вершы і радку.
І ўжо не мне, а ўсяму свету
Паэт працягвае руку...

Звіняць ягонай ліры струны.
Пясняр прарочыць праз гады.
Што набліжаецца Камуна —
Даць людзям шчасце назаўжды!

Ягоных песень звон, лавіна —
У нашым сэрцы і крыві.
Не зарасце сюды сцяжына
Людской пашаны і любві.

## Вячаслаў ДАШКЕВІЧ

### ПРЫВІЛЕЯ

У паэтаў перад чужымі
і хатнімі,
Перад усімі астатнімі
Ёсць адна прывілея:
Вы, мусіць, чулі,—
Нічога не мець
апроч чыстай кашулі,
Жыць сярод буры,
жыць сярод грому
І не зайздросціць нікому,
нікому.

## Юрка ГОЛУБ

### МІХАСЬ ВАСІЛЁК

А быў ён родам нездалёк —
Там Котра хвалю сцеле,
Дзе жыў на свеце Васілёк,
Або Міхась Касцевіч.

Рука трымала, як магла,
Пяро і тапарышча,
Бывала, брала і наган,
Як час у лес засвішча.

Яму у шуме баравым
Схілялі думкі голаў,
І да высокай галавы
Спяшалі беды голі.

Хадзілі чуткі і лісткі,
Шалела зброя ўлады.
І шлях да слова быў цяжкі:
Твой верш, яе—прыклады.

У звоне родных бальшакоў
Ля бацькавай Бабро́ўні
Ён не сустрэў бальшавікоў
З букетамі на броні.

На волі вёскі і браты,
А тут — дратоў да скону,
І Васілёк парваў драты
Нямецкага палону.

Ён партызаніў,
Галадаў,
Араў,
Пісаў адозвы...
Тапіла ў Нёмане вада
Варожыя абозы.

Жыццё, як бёрны, ён валок,
Акрузе ўзводзіў сцены.
Тужыў на свеце Васілёк,
Па метрыцы — Касцевіч.

...Бабро́ўня плавае ў садах,
І пах, і шлях зялёны.
Была паэту ў гарадах
Бабро́ўня не замглёнай.

Ён зведаў хмелю юны клёк,
Меў стог замест пасцелі.
Спяваў і плакаў Васілёк
Па прозвішчу Касцевіч.

А быў ён родам нездалёк,
Не вёў радком гавэнды.
Хадзіў па свеце Васілёк,—
Чалавек-легенда.

## Раіса БАРАВІКОВА

### СВІТАННЕ Ў ПАРКУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Галінка трапяткая ўпала,
Як недапісаны радок.
Сад вераснёвы і Купала,
Лісця зжаўцелага грудок.

Ля вадаспаду, што за сцежкай,
Таксама восеньскі агонь!
Русалка пырсне там не ўсмешкай,
А плачам тоненькім на скронь.

Забаваў летніх шчабятуха,
Як многа слёз яшчэ пралье!
Паблізу незнаёма-глуха
Аб камень Свіслач хваляй б'е!

А я прыцішваю дыханне...
Ля ліпы, дзе лісця грудок,
Купала шэпча на світанні
Свой недапісаны радок.

## Мікола СІСКЕВІЧ

### НА МЯДЗЕЛЬШЧЫНЕ

*Максіму Танку*

Калі сінее ярка неба,
І лес ад летняй стомы млоскі,
То адчуваю—як мне трэба
Прыехаць хоць на дзень у вёску.

Дзе ўсё—маё, дзе ўсё—знаёма.
І развітанні, і сустрэчы,
Сцяжынка, што вядзе да дома,
І матчыны худыя плечы...

Садоў бялюткіх завіруха,
У бэзе патанаюць вёсны...
Дзе салаўіны шчэбет слухаў—
Азёрам б'юць паклоны сосны.

І ноч ад свежасці акацый
Становіцца такой духмянай!
Бягу з маладзіком вітацца
На тую росную паляну.

Дзе сустракаў на золку ранне,
Дзе ў соты раз былі адкрыты
І радасць першага кахання,
І водар спеючага жыта.

Бягу з вялікае дарогі
На луг мурожны і квяцісты.
І горкі дым маёй трывогі
Становіцца прыемна чысты.

На кожным кроку—шчасця сведкі...
Паэзіяй Максіма Танка
Бары аблашчаны, палеткі
І партызанскія стаянкі.

## Генадзь ДЗМІТРЫЕЎ

Летнім ранкам
У ціхім садочку ля хаты,

## ТУРЫСТАМ— ПРА НАРОДНАГА ПАЭТА

Паміж дубовым гаем, па якім пекалі любіў гуляць Якуб Колас, і філіялам яго музея ў Мікалаеўшчыне знаходзіцца турысцкая база «Высокі бераг». Наведвальнікі яе з цікавасцю робяць паходы па Коласавых мясцінах, слухаюць гутаркі пра яго творчасць. І, вядома, з вялікай радасцю сустракаюцца з дзядзькам Юзікам. Іосіф Міхайлавіч па-майстэрску чытае не толькі вершы Коласа, а і беларускія гумарэскі, апавяданні Чэхава.

А нядаўна ў гэтых мясцінах адбылося чарговае раённае свята працы і песні. На ім таксама гучала несмяротнае слова народнага песняра.

**М. ГРЫЦАН.**

# ДУМЫ АБ ЧАЛАВЕЧАЙ ГОДНАСЦІ

**Выступаючы на творчым вечары народнага паэта БССР Пімена Панчанкі, Ніл Гілевіч падкрэсліў чалавечнасць яго паэзіі, з'яву, якую ён лічыць асабліва важнай і прывабнай. Мабыць, гэта асноўнае для большасці нашай сучаснай савецкай паэзіі, а пасля XXV з'езда КПСС, калі стварэнне матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей высокай якасці, усебаковае развіццё і камуністычнае выхаванне чалавека пастаўлены як агульная народная задача, значэнне баявой, праўдзівай і разам з тым глыбока чалавечнай паэзіі з кожным годам будзе ўзрастаць.**

**Пісьменнік шырокага дыяпазону і многіх здольнасцей, чалавек працавіты і добрасумленны, Н. Гілевіч увайшоў у сваю творчую сталасць (у гэтым годзе яму споўніцца 45 гадоў) з вялікімі набыткамі. Падагульняць іх, мабыць, яшчэ рана, творчасць — дарога адкрытая і наперадзе ў аўтара будуць новыя дасягненні, але, каб даць уяўленне аб галоўных кірунках яго працы, не будзе лішнім сёе-тое прыгадаць.**

**Пачынаючы з кнігі «Песня ў дарогу» (1957) і ўключаючы апошнюю «Актавы» (1976),**

Н. Гілевіч. Актавы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1976.

**Н. Гілевіч выдаў чатырнаццаць кніг паэзіі, апроч таго, некалькі кніг для дзяцей. Тут ёсць і лірыка, і сатыра, і нават вершаваная камедыя («Формула іржавіны» ў зборніку «Як я вучыўся жыць», 1974). Шырока вядомы ён таксама і як перакладчык, асабліва як папулярызатар і даследчык балгарскай літаратуры, перш за ўсё паэзіі, сучаснай і класічнай, — кнігі «Ад стром балканскіх» (1965), «Скарб» (1967), «Чарадзейны ліхтарык» (1968, для дзяцей), «Хай зоры ць дзень» (1973). Нарэшце трэці кірунак яго працы, які шмат у чым залажыў асновы і вызначыў прынцыпы яго ўласнай творчасці, — гэта фальклор, беларуская народная паэзія.**

**Тут Н. Гілевіч праявіў сябе і як нястомны арганізатар-збіральнік, і як пільны даследчык: «Песні сямі вёсак» (1973), «Песні народных свят і абрадаў» (1974), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975) і інш. Яго ўклад у фальклярыстыку не толькі багаты сам па сабе, ён жывы, дзейсны, пранізаны захапленнем і любоўю.**

Свае погляды на фальклор і яго ролю ў літаратуры і ў выхаванні сучаснай моладзі Н. Гілевіч сфармуляваў у артыкуле «Ненапісаныя кнігі», надрукаваным у газеце «Праўда» ад 13 верасня 1975 г. Ён піша: «Цікавасць да мастацкай творчасці народа ў нашы дні прыкметна ўзмацняецца. Якраз цяперашнія ўмовы духоўнага жыцця чалавека спрыяюць таму, што ён усё больш і больш цягнецца душой да натуральнасці, да спрадвечнага хараства прыроды, а таксама і да першароднай прыгажосці народнай творчасці». І яшчэ адна вытрымка адтуль: «Глыбока змястоўная народная паэзія—зброя, якая і цяпер не старэе ў барацьбе са спабізмам, з пустаслоўем, з драбнатэм'ем і іншымі хваробамі, што час ад часу псуюць нашы кнігі». У паэме «А дзе ж тая крынічанька» (зборнік пад той жа назвай, 1972) Н. Гілевіч, назваўшы сябе вандроўнікам і паляўнічым за птушкай шчасця — песняю народнай», раскрывае праўдзіва і хораша глыбінную сутнасць народнай паэзіі, паказвае яе ўплыў на чалавека.

Жывеш і будзеш жыць ты,
песня матчына,
Пакуль народа сэрца будзе
біцца!
Мы сваю долю ў свеце
перайначылі
Не для таго, каб на цябе
забыцца!..

Прынцыпы «праўдзівасці, народнасці і партыйнасці савецкай літаратуры», як адзначае ў сваёй аўтабіяграфіі Н. Гілевіч (зборнік «Пра час і пра сябе»), увайшлі ў яго свядомасць і сталі арганічнай базай для творчых пошукаў. Вызначылася і мэта творчасці — для чаго пісаць, і творчы метад — як пісаць. Паэт ён вельмі патрабавальны, асабліва ў адносінах да самога сябе («Б'юся ў муках над радком без літасці»). Паэтыку не толькі нашу народную, а розных эпох і народаў асвоіў грунтоўна — і для фармальных пошукаў у яго вялікі прастор. Але прынцып адзінства формы і зместу, нават у самых

Крыху воддаль
ад вечных турбот і людзей
Маці корміць сваё немаўлятка,
Ні ад каго не тоечы белых грудзей.

Расхінуўшы на свет
свае вочы-ваконцы,
Побач скача дачка —
дзве тугія касы —
Промні ловіць у жменю.
І ціха пад сонцам
Дагарае апошняя кропля расы...

Каб гісторык зрабіўся аднойчы
паэтам,
Ён
са дня нараджэння зямное кары
Да вядомых зямлянам
сямі цудаў свету
У пачатку паставіў бы гэтыя тры.

Покуль жыў будзе свет,
Людзі будуць здзіўляцца
І шукаць
прыгажосці адвечнай сакрэт
У матулі,
што песню пяе немаўляці
У шчаслівых забавах дзіцяці,
У расінцы,
ў якую глядзіцца Сусвет.

## Уладзімір ВЕРАМЕЙЧЫК

●

«Не займайцеся самалячэннем!»—
Папярэджвае строга ўрач.
«Не паддайцеся заспакаенню!» —
Навісае над вершам чытач.
Я лячуся ў гаях і дубровах —
Неблагі кіслародны абмен.
П'ю увечары чай чабаровы —
Не цягаю з аптэк седуксен.
І дымлю дапазна «Беламорам».

К чорту вашы парады, урач!
І працую, працую да зморы,
Каб цябе не падвесці чытач.

## Віктар ГАРДЗЕЙ

●

З даўняе
школьнай чытанкі яшчэ
Тую загадку я памятаю:
«Ліпа цвіце,
Сонца пячэ,
Хлеб даспявае...
Калі так бывае?»

Першым, здаецца, руку я падняў:
— Пчолы ліповы цукруюць мёд летам...
Сёння ж я знаю — не так адказаў,
Мне б тады трэба сказаць было гэтак:
— Калі не задымлена даль палявая
І смертаносным свінцом не мяце,
Так і бывае —
хлеб даспявае...
сонца пячэ...
ліпа цвіце...

## Мікола МІШЧАНЧУК

●

Дайце мне мае дарогі,
За спіну — такі рукзак,
Каб я мог усе трывогі
Ў ім людскія завязаць.

Мог сабраць святыя слёзы
Маці тых, чые сыны
У той пасляваенны грозны
Не вярнуліся з вайны.

Дайце мне мае трывогі
І трывогі тых людзей.
Для каго бясконца доўгі
І пакутны кожны дзень.

Дайце мне такое права:
Боль планеты ўсёй суняць,
Каб была на свеце праўда,
Каб звінела цішыня.

●

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшлі новыя кнігі паэзіі. Змяшчаем іх вокладкі: «Радовішча» М. Аўрамчыка (мастак А. Жалдакоў), «Крынічны луг» В. Матэвушава (мастак А. Малышаў), «Прыгаршчы суніц» М. Дуксы (мастак Ул. Доўгань), «Птушыны грай» М. Федзюковіча (мастак А. Косцін), «Адкрыццё» Ул. Няклясва (серыя «Першая кніга паэта», мастак Т. Мельянец).

# ПАДАРОЖЖА Ў МАЛАДОСЦЬ

ЛІРЫЧНАСЦЬ — характэрная асаблівасць паэзіі Анатоля Астрэйкі. Задушэўнымі, сардэчнымі былі яго вершы, шчырым, мілагучным паўстае ён перад чытачом і ў новым зборніку «Цвіціце, верасы!». Ды інакш і быць не можа, бо нарадзіўся паэт у адным з самых маляўнічых куткоў Беларусі, там, дзе цякуць Немапец, Неман, Уса... Струменяць яны, ціхія і празрыстыя, паміж лугоў, даспелых палёў і меднаствольных бароў.

Гэтую прыгажосць А. Астрэйка ўспрыняў яшчэ з маленства і пранёс яе нерастрачанай да сталых год. І цяпер, з вышыні пражытага, ён вяртаецца назад у незабыўнае маленства:

**Хоць я і аглядаюся назад,**
**Сушу асеннія пракосы,**
**Паклон табе, мой адшумеўшы сад,**
**Другога не хачу я лёсу.**

І жыве памяць аб сябрах-таварышах, з кім у гады вайны змагаўся з ворагам:

**Калі пастаўлю свой будан**
**Не з крапівы, не на пагосце,**
**Дык запрашу я партызан**
**Не ў лебяду, а ў сад у госці.**

Але найбольш поўна, выразна настрой паэта, яго разуменне кошту хлеба і працы бачыцца вось у гэтай мініяцюры:

**Без хлеба нам не абысціся,**
**Ды ён на вербах не расце.**
**Ты папацей і ты стаміся**
**На кожнай палявой вярсце.**

**Зямлю ўзары, пасей зярняты**
**Іх панармі, бы неўмалят,**
**Заплаціць радасцю багатай**
**Табе за ўсё твая зямля.**

Прызначэнне паэзіі і заключаецца ў тым, каб песці людзям прыгожае, светлае, адкрываць тое, чаго мы часам не заўважаем у паўсядзённым жыцці. І задача паэта не захапляцца апісальніцтвам, а знаходзіць вытокі прыгожага. А. Астрэйка мае поспехі ў гэтым кірунку. Ён хораша піша пра вясну, лета. А вось і зіма, якая суадносіцца з жыццём лірычнага героя:

**Цяпер прыйшла зіма круціць снягі.**
**Шумі,**
**мяці і сып завеяй,**
**Ды не чапай асенняе тугі,**
**Пра шчасце хай жывуць надзеі...**

Праўда, апошні радок крыху насцярожвае. Падобныя матывы сустракаюцца і ў іншых вершах, у якіх хаваецца штосьці недасказанае, невыразнае, свайго роду настраёвае. Паэт нібы саромеецца гаварыць на поўны голас, не да канца раскрываецца перад чытачом. А зрабіць яму гэта нішто не замінае. Сум, журба, туга самі па сабе яшчэ нічога не азначаюць, калі яны не прывязаны да канкрэтных праяў жыцця, не нясуць у сабе сэнсавую нагрузку. Калі б аўтар напоўніў іх канкрэтным зместам, то і загучалі б гэтыя вершы зусім па іншаму. Тады б і прыродныя замалёўкі, якімі насычаны амаль кожны верш, былі б больш зразумелымі і запамінальнымі для кожнага, хто любіць лірыку.

Інакш гучаць вершы, у якіх А. Астрэйка вяртаецца да нядаўняга мінулага, да партызанскага жыцця. Тут усё канкрэтнае і зразумелае, бо перажыта аўтарам: «Мінулы час, забыць цябе не можна, і свой будан, і хлінкае балота...».

Стаіць дуб у лясных шатах, а на ствале прозвішчы тых, хто загінуў у барацьбе з ворагам:

**Спыняюся пад дубам тым разгатым,**
**На ім вайны ўжо зараслі рубцы.**
**Сплыць вечным сном каля яго салдаты,**
**Маёй Радзімы слаўныя байцы.**

А. Астрэйка прайшоўся былымі партызанскімі сцежкамі, і паўстае ў яго вершах маладая Случчына, зямля, поўная хараства:

**О, як вясною Случчына цвіце!**
**Сябры мае, прыедзьце падзівіцца.**
**Такой красы не знойдзеце нідзе,**
**Ні ў якіх там далёкіх заграніцах...**

Звяртаецца паэт і да народных прыкмет і паданняў, па-свойму асэнсоўвае іх. Напрыклад, калі над балотам устае густы золкі туман і засланяе сабой усё жывое, нават сонца, кажуць, што гэта чэрці паляць лазню. І вось А. Астрэйка назірае, як запалілі чэрці лазню, «ажно дым плыве здалёк». А восень:

**Туманў сівых сабрала роты,**
**А пасля згрувасціла ў палкі**
**І сваю нямудрую пяхоту**
**Кінула заслонай ля ракі.**

Паядынка з сонцам не вытрымалі ні чэрці, ні восень. Яно абпраменіла зямлю і напоўніла яе святлом: «Паляць лазню на балоце чэрці, хай памыюцца сваёй журбой. А зямлю і сонца, як бяссмерце, над людской нясу я галавой».

Барацьба святла і цемры ўвасабляецца ў многіх праявах жыцця. Трэба толькі прыкмеціць гэта, умець чытаць адвечную кнігу жыцця. У роздуме сталых год паэт зрабіў падарожжа ў сваю маладосць, прынёс адтуль багата вобразаў, паказаў росквіт зямлі. Гэту радасць і настрой ён перадаў чытачу ў сваім новым зборніку.

**Рыгор НЯХАЙ.**

А. Астрэйка. Цвіціце, верасы! Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1975.

складаных паэтычных пабудовах, напрыклад, у вянку санетаў «Нарач», застаецца непарушным. Наогул, Н. Гілевіч насцярожана адносіцца да штучных вымудраў, да ўсякай надгонкі ці то для рыфмы, ці то для рытму, вострa адчуваючы фальш. Ён не адмаўляе выдумкі, фантазіі, без уяўлення не можа быць творчасці, прызнае і любіць рэвалюцыйную рамантыку, але ў сваёй уласнай паэзіі—рэаліст, пакіраваны ў будучыню.

**Паняцце «праўдзівасці» трактуюць па-рознаму. Паспрабую вызначыць адну важнейшую рысу гэтага паняцця. Прачытаўшы некалі раман даволі вядомага сучаснага пісьменніка-рэаліста, я задумаўся над прычынай, чаму яго раман мне не спадабаўся. І падзеі ц'кавыя, і апісанні ярк'я, і характары акрэсленыя, і мова добрая, а вось не дайшло. Пыпісаўшы гэта суб'ектыўнаму ўспрыманню, я забыў аб сваім уражанні.**

**Але праз некаторы час на адным вечары мне давялося слухаць гэтага пісьменніка. Акрылены цёплым прыёмам, ён з апломбам гаварыў пра свой творчы метад і павучаў так: «Пісаць трэба праўдападобна». І мне ўсё стала ясна. Не «праўдзівасць», а «праўдападобнасць». Але ж і хлусня можа быць праўдападобнай. Падробка ў мастацтве — з'ява пашыраная. Праўдзівасць — гэта не толькі больш-менш дакладны паказ рэчаіснасці, інфармацыя, гэта светапогляд, ідэалогія, тая схаваная альбо адкрытая аўтарская прысутнасць, што асвятляе твор знутры, робіць яго жывым, арганічным, блізкім чытачу. Раман мне не спадабаўся, бо ў ім майстэрствам была прыкрыта раўнадушнасць. І калі ў прозе раўнадушнасць можа ўспрымацца часам як аб'ектыўны, «навуковы» падыход, у паэзіі яна адчуваецца асабліва востра.**

**Паэзія ўключае ў сябе майстэрства, але не ўсякае майстэрства ёсць паэзія. Шчырасць — неадменная аснова сапраўднай паэзіі. Напісаны з цыркавым спрытам верш можа здзівіць, але за сэрца не возьме. Каб актыўна ўплываць патрэбна вялікая аўтарская адлача.**

Пры ўсёй разнастайнасці пошукаў (і ў мастацтве, і ў гуманітарных навуках), галоўны кірунак творчасці Н. Гілевіча—паэзія. У гэтым яго талент праявіўся з найбольшай сілай. Эпічных твораў у яго мала, пераважае лірыка, апроч таго ён гумарыст і валодае сцэнічным дыялогам.

Пра сваю новую кнігу «Актавы» ў прадмове аўтар гаворыць: «Склалася гэта кніга не адразу. Першая невялікая нізка васьмірадкоўяў была напісана мною яшчэ ў 1961 годзе. Зрэдчасу звяртаўся я да гэтай формы і пазней. Але пераважная большасць вершаў напісана нядаўна—у апошнія тры-чатыры гады».

У зборнік уключана 120 васьмірадкоўяў. У ім чатыры раздзелы: лірычны роздум—у першым і трэцім, запрашэнні балгарскім сябрам—у другім, і ў чацвёртым—сатырычныя выказванні. Аўтар выбраў гэту форму таму, што яна давала яму поўны прастор, у чатырохрадкоўях альбо двухрадкоўях думцы было б цесна, у санетах — страціўся б імправізацыйны характар выказванняў. Васьмірадкоўе ж дазваляла і разгарнуць думку, і надаць ёй належную вобразнасць. Рытмічная структура, у кожным васьмірадкоўі свая, а таксама вольнае чаргаванне рыфмаў (хоць ёсць і традыцыйнае па формуле — аб аб аб вв), канкрэтызавалі настрой, рабілі яго выразным і арганічна спалучалі з думкай. Мабыць, такая форма здалася аўтару найбольш прыдатнай для пастаўленай мэты.

«Актавы» Н. Гілевіча — гэта лірычная споведзь, спроба найлепшым чынам выказаць сваё запаветнае, філасофія чалавека цвёрдых перакананняў і сталых прынцыпаў, які, углядаючыся ў сучаснасць, стараецца ў меру сваіх сіл быць у перадніх шэрагах змагароў за камуністычную будучыню. Лірычны герой кнігі — сам аўтар, адсюль асаблівая адказнасць за кожную думку, за яе правільнасць і патрэбнасць. Можна было б канспектаваць усе вершы кнігі, выказаўшы коратка прозай сэнс кожнага васьмірадкоўя, настолькі ўсё ў кнізе канкрэтна, але выганяць з паэзіі паэзію — пустая работа. Абаянне кнігі ў яе шчырасці, цеплыні і сардэчнасці. Яе можна чытаць і перачытваць. Безумоўна, не ўсё ў зборніку мае аднолькавую вартасць, нападаюцца і не зусім выразна сфармуляваныя думкі і выпадковыя абразкі, але ў ёй, як у незамутнёнай крыніцы, чытач знойдзе тое добрае, што радуе і акрыляе. Нельга сказаць, што «Актавы» — найбольшае дасягненне аўтара, хутчэй за ўсё гэта падарожжа па сцежках дапытлівага розуму, некаторае падагульненне жыццёвага вопыту.

**Як і ў кожнага сапраўднага паэта, у яго ёсць свой круг асабліва блізкіх тэм, ён не бярэцца абы за што, як гэта робяць літаратурныя аматары. паэзія для яго неабходнасць, спосаб жыцця. Глыбока веручы ў высокае прызванне чалавека, у яго камуністычную будучыню, аптыміст па натуры, ён востра ўспрымае жыццёвыя супярэчнасці, сутыкненні інтарэсаў, розныя перашкоды ў становўчым развіцці грамадства. Вітаючы навукова-тэхнічны прагрэс, тыповую з'яву нашай эпохі, ён уважна прыглядаецца і да таго, што не адразу кідаецца ў вочы. Яго хвалююць маральна-этычныя праблемы, складанасць якіх не знаходзіць лёгкага вырашэння.**

У васьмірадкоўі, з якога пачынаецца зборнік, ёсць формула — «прывесці ў рух энергію сумлення». Фізік-атамнік навучыўся расшчапляць атам, задача паэта — развіваць і выхоўваць лепшае ў чалавеку. Не спажывецкае грамадства, па прынцыпу — здабывай і жыві для сябе, а праноўнае, творчае грамадства, заснаванае на справядлівасці і братняй роўнасці, вабіць паэта. З гэтага пачынаецца і ў гэтым кірунку разгортваецца комплекс ідэй, заложаных у кнігу.

(Заканчэнне на стар. 6).

Генадзь ЛАНЕЎСКІ

# КВЕТКА ШЧАСЦЯ

Каго не зачаруе вясна сваімі гукамі і пяшчотаю фарбаў! Зачаравала яна і жвавага хлопчыка, што з заміраннем сэрца ўслухоўваўся ў звон жаўранкаў, углядаўся ў кволую зеляніну першых лісточкаў, удыхаў пахі свежай раллі і лугавых красак.

Хутар Прудзішча ляжыць сярод поля, якое з усіх бакоў акаймавана сцяной лесу. Недалёка—Даўгінаўскі гасцінец. Па ім штодзень рыпяць фурманкі гандляроў і рамізнікаў.

Тут, вакол хутара, столькі ўсяго дзівоснага, што не ведаеш, чаму аддаць перавагу. Але хлопчыка цягне ў поле, туды, дзе сёння ходзіць за бараною дзядзька Язэп Песляк.

— Мама, ці хутка Язэпу снеданне несці?—пытаецца хлопчык.

І вось маці дае сыну загорнутае ў кужэльную сурвэтку снеданне—акраец хлеба, кавалачак сала ды жбанок гарачага крупніку з малаком.

Прыемна бегчы басанож па вільготнай спяжынцы, хочацца хутчэй прымчаць да таманкога дзядзькі Язэпа. Над галавой трапечуць і звіняць вясеннія жаўранкі. Хлопчык углядаецца ў блакітнае, як азёрная вада, неба.

— Малайчына! — радуецца дзядзька Язэп, спыніўшы каня. — Рана снеданне прынёс.

— Ага, спяшаўся—смяецца хлопчык.

Дзядзька Язэп, прысеўшы на мяжу, развязвае сурвэтку. Над полем—ясная, вясёлая песенная сінеча, гуляе цёплы ветрык, які бывае толькі вясной.

— Дзядзечка Язэп, раскажыце штонебудзь,—сарамліва просіць хлопчык.

— Расказаць... гэта можна, толькі часу ў нас мала,—кажа дзядзька і прымаецца за снеданне.

Пасля снедання дзядзька скручвае цыгарку і высякае крэсівам агонь. Уся каржакаватая постаць Язэпа, калі ён сядзіць на мяжы, шырока расставіўшы ногі ў лапцях, здаецца волатаўскай.

Трэба баранаваць, бо за вясною лета па пятах ідзе.

Разам з дзядзькам Язэпам устае з мяжы і хлопчык. Ён загортвае ў сурвэтку гладыш. А дзядзька тым часам ужо звяртаецца да коніка:

— Ну, пайшлі з табой, родны...

Хлопчык крочыць услед за бараной, за якой ужо курыцца першы пылок. Ён ведае, што Язэп можа расказваць і так, ходзячы за бараной. Вось і цяпер дзядзька Язэп усміхаецца і кажа:

— Добра, раскажу табе, сынку... Было гэта даўно-даўно. Мусіць, спрадвеку людзі святкавалі Купалле—свята бога вады. Гэта дваццаць другога чэрвеня—калі самы вялікі дзень і самая кароткая ноч. Усюды яго па-свойму святкавалі. Расказвае адзін стары лірнік, што быў час, калі Купалле жах на людзей наводзіла... Цяпер на Купалу хлопцы і дзяўчаты запаляць якую мазніцу ды на шасце ўзнімуць. Спяваюць песні, ладзяць гульні і карагоды. Да моладзі старэйшыя збіраюцца. У гэты дзень шмат купаюцца, а ноччу расою ўмываюцца. Дзяўчаты вянкі плятуць ды на ваду пускаюць: чый вянок хутчэй і далей паплыве, тая замуж хутчэй пойдзе—варажба такая. Хлопцы скачуць цераз вогнішча, сваволяць. У Піліпа вароты знімуць ды на Змітрову пуню зацягнуць. А мне аднойчы сенам комін заткнулі, дым у хату так і паваліў,—давялося печ вадой заліваць. Грышкавы калёсы ў хмызняк адвалаклі—паўдня шукаў. А яшчэ на Купалу людзі ідуць у бары, на балоты шукаць папараць-кветку — сабе і людзям шчасце.

— А якая яна, папараць-кветка?

— Хто яе ведае, я яе не знайшоў, хоць у маладосці не раз лазіў па гушчарах. Кажуць, агністая. Яна на Купалле быццам зацвітае ў самую поўнач. Хто знойдзе—стане сам Купалам—будзе ўсё ведаць і магчы.

Барана падскоквае на каменні. Колькі хвілін яны ідуць моўчкі. Дзядзька раз-пораз выкідвае з-пад бараны каменне. А калі поле пайшло чыстае, без камення, хлопчык пытае:

— Ці ёсць яна, тая папараць-кветка?

— Шчасце на свеце, ёсць, толькі яно, кажуць, панамі знойдзена ды ў іншае месца перахавана. А як яго цяпер знайсці—ніхто не ведае.

Дзядзька Язэп пяшчотна гладзіць галоўку хлопчыка.

— Ну, ідзе ўжо дахаты, а то натомішся, ды і маці будзе непакоіцца,—кажа ён.

— Дзякую, дзякую, дзядзечка!

Зямля, абуджаная вясной, набіраецца сілы. Звіняць і звіняць жаўранкі. Веснавая рунь ужо забаўляецца з лагодным ветрыкам.

«Як могуць жыць з людзьмі тыя, што схавалі недзе папараць-кветку—шчасце народа?»—думае хлопчык, і яму здаецца, што пэны павінны жыць у пемры, у глухіх імшарах. Трэба знайсці тую кветку. Трэба зрабіць так, каб усім было добра. Каб банька, Язэп і ўсе сяляне мелі зямлю. Каб заўжды смяялася маці, дзядзька Язэп і ўсе, усе людзі. Хай заўжды будзе шмат песень, цікавых казак і паданняў. Хай заўжды ў людзей будзе вясёлае свята Купалы.

Але хто, апрача птушак, будзе спяваць людзям песні? Дзядзька Язэп расскажа цікавую казку або падание. Але хто знойдзе папараць-кветку — шчасце для народа?—непакоіцца хлопчык.

І тут яму прыходзіць думка: «Трэба шукаць папараць-кветку. Трэба скласці і расказаць людзям цікавыя песні і казкі. Буду я Купалам!».

Гэтая думка моцна ўсхвалявала хлопчыка, і ён спыняецца на пагорку. Перад ім такі родны і прыгожы краявід, і ён, акрылены сваёй радасцю, крычыць сонцу і ветру, звонкім жаўранкам і стомленым аратым, што завіхаюцца на ўзгорках:

— Я знайду папараць-кветку! Буду я Купалам!

І сонечны прасцяг адгукаецца рэхам у барах: «Ку-па-ла! Ку-па-ла!..».

**Аповесць «Цагельня» І. Шальманава—першы буйны твор маладога празаіка. Дагэтуль ён быў вядомы чытачу як апавядальнік і нарысіст. У 1969 годзе выйшаў зборнік яго апавяданняў «Дзень пачаўся», дзе асноўная тэма яго твораў была жыццё і побыт чалавека працы, рабочага чалавека. І ў гэтай аповесці ён расказвае пра жыццё і працу рабочай моладзі на адным з цагельных заводаў горада Мінска.**

**Прапануем вашай увазе ўрывак з гэтай аповесці.**

**Поўнасцю твор друкуецца ў сёмым нумары часопіса «Маладосць».**

ЗНАЧНОЙ Пальцімовіч вярнуўся толькі а дванаццатай гадзіне. На сходзе затрымаўся. І цяпер, хоць быў вельмі стомлены, ніяк не мог заснуць. Яго турбавала тая сутычка, якая адбылася паміж ім і рабочымі прэсавага цэха. І хоць яго ва ўсім падтрымлівала Зінаіда Барысаўна і на сходзе заводскае начальства гаварыла пра яго як пра героя дня, Кастусь усё роўна вінаваціў сябе. Не стрымаўся, упароў гарачку. А можна было зрабіць інакш, рашыць гэтае пытанне больш спакойна. З Віктарам рашыць, са зменным майстрам прэсавага цэха. Заўважыў, што камеры загружаюць браванай цэглай, трэба было спакойна папярэдзіць загрузчыку. Не слухае — хай сабе! — далажыў бы Віктару, а потым зменную выпрацоўку зрэзаў бы тысяч на пяць. О! Тады хай бы паскакалі, даказвалі б сваю праўду. І з Віктарам сябраваў бы па-ранейшаму.

А ён распетушыўся, як хлапчанё. Мо гэта ад таго, што ён, яшчэ зусім нявопытны сушыльшчык, разгадаў тайну, і гэта ўскружыла яму галаву, ці мо проста абурыўся нядбайнымі адносінамі рабочых да працы. Канечне, у гэтым было нейкае апраўданне, але яно не суцяшала Пальцімовіча. З рабочых знімуць прэміяльныя, а Віктару да таго ж уляпілі вымову. Непрыгожа атрымалася. А ён жа лічыўся лепшым сябрам Віктара. Віктар і цяпер, здавалася, не пакрыўдзіўся, размаўляў з Косцем, толькі ўсміхаўся цеяк вінавата.

Косця рыпеў сеткай, варочаўся на ложку.

Апошнія два месяцы з сушылак выгружалі да сарака працэнтаў браку. Зінаіда Барысаўна гутарыла з сушыльшчыкамі і качагарамі, некалькі разоў мянялі рэжым сушкі, а браку не меншала. За нядбайныя адносіны да працы сушыль-

*ЗАМЕСТ РЭЦЭНЗІІ*

# «ПРА ВЕЧНАЕ, ПРА САМАЕ СВЯТОЕ...»

ЛЮБОЎ да матчынага слова, да роднага краю ў Марыі Шаўчонак, дарэчы, як і ў кожнага чалавека, пачалася з маленства. Любіла слухаць яна песні, казкі, народныя паданні. Неяк неўпрыкметку і ў самой з'явілася жаданне напісаць верш. У тых першых, цяпер ужо далёкіх творах, ажывалі лугавыя краскі, блакіт неба.

Вершы школьніцы М. Шаўчонак друкаваліся ў «Піянеры Беларусі», а неўзабаве і часопіс «Бярозка» не пашкадаваў ёй ажно цэлую старонку. Усё гэта радавала, акрыляла.

А потым была вучоба ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, гарачыя спрэчкі аб літаратуры, што адбываліся ў студэнцкім інтэрнаце і на пасяджэннях літаратурнага аб'яднання «Узлёт». І, вядома, па-ранейшаму вершы. Лепшыя з іх змяшчаліся на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў, у калектыўных зборніках. У 1971 годзе выйшла першая кніжка «Белая ластаўка».

Ужо каторы год М. Шаўчонак працуе ў Шчучынскай раённай газеце «Савецкая вёска», піша нарысы, артыкулы, замалёўкі. І па-ранейшаму жыве ва ўладзе паэтычнага слова: выступае з вершамі на старонцы, якую рэгулярна рыхтуе мясцовае літаратурнае аб'яднанне, друкуецца ў «Гродненской правде», «Работніцы і сялянцы»... Піша «пра вечнае, пра самае святое»:

А вечнае — зусім не аднастайнасць,
Яно—і звон крыніц, і шум лясны.
Яно — вось гэты ўзгорак і сасонкі,
І песня жураўліная ў вышы.
На шыбе промень
залацісты,
тонкі.
І стоенасць асенняя душы.

Пад уражаннем гэтай прыгажосці марыў аб светлым дні сваёй старонкі Ўрублеўскі, яна натхняла Цётку і ў яе творчасці з'яўляліся бунтарныя, рэвалюцыйныя настроі.

Радзіма іх — часцінка біяграфіі і М. Шаўчонак. А Шчучыншчына для яе — край адзіны, што асабліва сэрцу мілы, жыць у якім найвялікшая радасць.

«Свята зямлі» — назвала яна другую сваю кніжку, якая толькі што выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Шмат у гэтым зборніку вершаў пра Прыпяцкі край, вершаў-роздумаў, а больш — лірычных, пранікнёных радкоў, у якіх выліваецца вопкі пачуццё, і любоў, што поўняць сэрца аўтара, ва ўсёй паўнаце сваёй перадаецца іншым.

Пра каханне М. Шаўчонак піша адкрыта, магчыма, нават і крыху катэгарычна, аднак падобнае ідзе ад чысціні душы, якая не церпіць фальшы і не можа дараваць падман: «Кавалачкі пісьма і першы снег, і слёзы на далонях і на вейках... Усё ўспрымаю, як у страшным сне і рву не пісьмы — чэрствасць чалавека».

Паэзія яе простая, пазбаўленая маралізатарства і мудрагелістасці, даверлівая ў адносінах да свету і людзей. Простая, але не спрошчаная, бо М. Шаўчонак умее адчуваць слова, яго сэнсавую нагрузку.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

М. Шаўчонак. Свята зямлі. Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1976.

# ДУМЫ АБ ЧАЛАВЕЧАЙ ГОДНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4—5).

Разгледзім некаторыя тэмы, найбольш блізкія паэту. Першаперш—тэма Радзімы, Бацькаўшчыны. Тут людзі і прырода, вернасць і любоў. Кожнаму патрэбен нейкі прытулак, і пры ўсёй магутнасці чалавека, які завалёўвае акіяны і космас, зямля яму радней за ўсё. Кожны народ любіць свой край — гэта натуральна і заканамерна. Вялікі ўкраінскі паэт Паўло Тычына калісьці сказаў: «Поете, любіти свій край не є злочин, коли це для всіх».

За хлеб, што ем, за песні,
што спяваю,
За шчасце звацца імянем
тваім—
Паклон, паклон табе, мой
родны краю!
Ты—мой, я—твой: усюды
і ва ўсім.

І гэта не толькі не супярэчыць інтэрнацыянальным поглядам аўтара, а яшчэ больш іх умацоўвае. Прыхільнасць да Радзімы ў яго пазбаўлена эгаізму, уласніцкага адгароджвання плотам свайго ад чужога. У «запрашэннях балгарскім сябрам» Н. Гілевіч піша паэту Найдану Вылчаву:

Ці не хацеў бы ты, мой
любы браце,
Ізноў пабыць у беларускай
хаце,
На покуці ў застолі
пасядзець
І разам з партызанамі
былымі—
Дзядзькамі і суседзямі
маімі—
Пра вогненную вёску песню
спець?..
Заеду—мама кожны раз
пытае:
«А што ж балгарын твой
не прыязджае?»

Звярніце ўвагу на прастату і яснасць гэтай актавы. Думка развіваецца лагічна, з пэўным вывадам як у санеце (апорная фраза). Рыфма звычайная, ніякіх упрыгожванняў, ніякіх закавырыстых слоў. Жывая народная мова. Гутарка ад сэрца к сэрцу. Такі яго стыль і ў гэтым яго сіла. Не перагружаючы вершаў празмернай дэталізацыяй, ён выдзяляе галоўнае і на ім засяроджвае ўвагу. Думка зліваецца з пачуццём, прырода з чалавекам, хараство з любоўю.

Услаўлялі яго, запляталі
ў вянкі,
Потым кпілі з яго, абазывалі
ўсяляк,
А ён моўчкі цвіце, як і цвіў
праз вякі,
І прызнайцеся шчыра,
нашчадкі сялян:
Ці ж не сумна было б гэтай
сцежкай ісці
Між густой збажыны, каб
хоць рэдка здалёк
Сінім вокам сваім не глядзеў,
не свяціў,
Не трывожыў шчымліва
душу васілёк.

Маральна-этычныя праблемы, паводзіны чалавека ў грамадстве — мабыць, самая галоўная тэма паэзіі Н. Гілевіча. Марачы аб гармоніі і росквіце, аб дружбе і калектыўнай салідарнасці, выступаючы супраць звярыных законаў капіталістычнага свету, зброяй мастацтва абараняючы чалавечую годнасць, аўтар шукае цікавую і ёмкую паэтычную формулу для шырока вядомых ісцін. Прыглядаючыся да з'явы, ён стараецца паказаць яе з іншага, не зусім прывычнага боку, і такім чынам узбагаціць уяўленне аб ёй. Як правіла, гэта яму ўдаецца.

Куды ні глянь—над дахам
строй антэн,
Ва ўсіх кватэрах—свецяцца
экраны,
Сядзі сабе ў цяпле, між
родных сцен,
Як вязень, сам сабою
пакараны, —
Гадай пра сэнс пачутых
перамен,
Перажывай краін далёкіх
драмы...
Табе зрабіўся блізкім цэлы
свет!
А ці бліжэйшым стаў табе
сусед?

У гэтым апісанні гарадской кватэры, усё вядомае, усё тыповае, але нечаканая канцоўка як пражэктарам асвятляе ўвесь верш, надаючы яму глыбіню і актуальнасць. Майстэрства, набытае Нілам Гілевічам на працягу многіх гадоў літаратурнай дзейнасці, непадзельна звязана з жыццём, з грандыёзнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. На яго жыццёвай дарозе ёсць і боль, і смутак, і пакуты, і радасць, і паэт заўсёды ў клопаце, каб не быць лішнім, а ўнесці свой пасільны ўклад у вялікую агульную справу.

Паэт! Гуляй і цешся
рыфмамі!
Але, падобна салаўю,
Не трэба, брат, а вачмі
закрытымі
Бяздумна весці трэль сваю.

У кнізе Ніла Гілевіча «Актавы» шмат харошых вершаў, якія ўзрушваюць і прымушаюць задумацца.

Юрка ГАЎРУК.

Іван ШАЛЬМАНАЎ

# ПЕРШЫЯ СУМНЕННІ

шчык Рапановіч і качагар Хмуровіч былі пазбаўлены месячнай прэміяльнай аплаты на дваццаць пяць працэнтаў. І гэта не памагло. І вось цяпер Косця разгадаў, у чым сакрэт.

Падвозіць паліва сушыльшчыкі сталі незадоўга да прыходу Пальцімовіча, а раней гэтую работу выконваў спецыяльны чалавек. Сушыльшчык увесь час знаходзіўся ў сушыльным цэху. Кіраваў загрузкай і выгрузкай, сачыў за рэжымам сушкі і якасцю загружаемай цэглы. Адлучаўся, бывала, на некалькі хвілін, калі трэба было сказаць качагару, каб павысіў або панізіў тэмпературу ў камерах. Карацей кажучы, сушыльшчык быў гаспадаром сушылкі. Потым паменклатурную адзінку падвозчыка паліва скарацілі і яго абавязкі перадалі сушыльшчыку.

Спачатку сушыльшчыкі адмаўляліся, казалі, што ў іх і так работы па завязку. Але ім павялічылі зарплату, і яны згадзіліся.

На першым часе ўсё было добра, ды потым найшоў брак. А прычына гэтаму была самая простая. Сушыльшчык пачаў больш часу знаходзіцца ў качагарцы. Панізіўся кантроль за якасцю цэглы, якая паступала ў сушылку. І прасаўшчыкі ў пагоні за выпрацоўкай пачалі загружаць камеры бракованай цэглай. Косця гэта заўважыў выпадкова. Звычайна сушыльшчыкі заходзілі ў цэх, як падвязуць у качагарку дзве вагонкі паліва. К гэтаму часу прасаўшчыкі паспявалі загрузіць адну камеру. Косця зайшоў у сушылку раней. Забавахліла сорак сёмая камера. У ёй заўсёды добра сушылася цэгла. Шаснаццаць — дваццаць гадзін рэжыму — і цэгла гатова. А то ўжо другія суткі стаіць пад загрузкай і ніякага знаку, што на рэжыме.

Зінаіда Барысаўна сказала Косцю, каб праверыў шыбер. Можа, абарваўся трос.

Яны з Андрэем нагрузілі дзве вагонкі вугалю, адвезлі ў качагарку. І Косця пабег у сушылку праверыць, што здарылася з сорак сёмай.

Так яно і было, як меркавала Зінаіда Барысаўна. Трос быў стары, пераржаўлены. Цагліна недзе звалілася з рамкі, ударыла па шыберу. Трос абарваўся, і камера выключылася з рэжыму.

У траншэі аж сіне было ад дыму. Косця набраў поўныя грудзі паветра, затаіў дыханне. Хутчэй прывязаў да шыбера трос і... назад.

— А бежуха! Гэта ж во: не пазнала. Як чорт выпэцкаўся.

Перад ім стаяла з поўнай ваганеткай сырца Марыся Задэля. Косця паглядзеў на ваганетку. На ёй ледзь не палова цэглы была патрэсканая. «Дык вось адкуль брак бярэцца!» — здагадаўся Пальцімовіч.

— А ну, гані па звалку! — загадаў Косця.

— Чаготкі я паганю? — Марыся нахабна ўсміхалася.

— А тое, што брак вязеш. Не бачыш хіба?

— А бо-о!.. Людзі, дзівіцеся на яго! Хіба гэта брак? Разбіраешся ты ў браку...

— Я сказаў, што не будзеш загружаць бракам.

— Во начальнік мне знайшоўся! — і Марыся пагнала ваганетку міма Косці. У нейкай лютай злосці ён хапіўся за край ваганеткі і тузануў на сябе. Ваганетка хіснулася, цэгла і рамкі пасыпалася далоў.

— А людцы! — залямантавала Марыся.— Паглядзіце, што ён робіць!

— Ах ты, паразіт! Ты што цэглу б'еш? — на Косцю наступаў дзяжурны слесар Сашка Крывашэй з ломікам у руках. І, пэўна, ён ударыў бы яго, калі б Косця не скочыў за ваганетку.

Сашка Крывашэй быў худзенькі, маленькі, амаль у два разы меншы за Пальцімовіча. Косця трымаў яго за рукі, але Сашка брыкаўся, біўся.

На крык прыбег змены майстар прэсавага цэха Віктар Янкевіч.

— Утаймуй гэтага вар'ята,— сказаў Косця і адштурхнуў слесара.

— Гэта я вар'ят? — не супімаўся Сашка Крывашэй.— Гэта ты...— і да Віктара: — Паглядзі, што ён нарабіў.

— Ідзі, працуй,— сказаў Віктар.— Мы самі разбяромся.

Узрушаны і задаволены сабой, Крывашэй пацёгся да прэса.

— Дык што тут здарылася? — спытаў Віктар у Косці.

— А хіба ты не бачыш, што здарылася? Бракам камеры загружаеш.

— Ну, так ужо і бракам. Можа, і трапілі якія дзве.

— А ты зайдзі ў камеру і паглядзі, што там робіцца.

— Можна і паглядзець. Толькі спачатку давай падніемем ваганетку. Эй ты, герой,— паклікаў Віктар Сашку Крывашэя. — Хадзі намажы ваганетку падняць.

Сашка падышоў неахвотна. Падняслі ваганетку, прыбралі сырэц, які ператварыўся ў груды гліны.

— А цяпер пойдзем паглядзім, якой ты цэглай камеры загружаеш,— сказаў Віктар слесару.

Зайшлі ў камеру, пасвяцілі пераноснай лямпай. Пастаяўшы ў цёплым, цэгла раскісла, і трэшчыны на ёй яшчэ больш кідаліся ў вочы.

— От што, герой,— сказаў Віктар да Сашкі.— Ты б меней з ломікам бегаў, а часцей мунштук чысціў. Зараз жа прачысці як след.

Косця і Віктар зайшлі ў кантору майстра.

— Дык што рабіць будзем?—спытаў Віктар.

— Як хочаш, Віктар, а я буду пісаць дакладную.

— А можа, так уладзім?

— Не, Віктар. Ты сам ведаеш, колькі браку ў нас. Я думаю — не толькі твая змена вінавата. Усё роўна начальства даведаецца.

— Ну то як хочаш.

На сходзе Косця расказаў усё, як было.

●

Каламутная, з рудаватым адлівам вада распасціралася так далёка, што, здавалася, злівалася з небам. Косця выбіваўся з сілы, стараўся даплысць да берагу, якога не было відаць. Яму зрабілася страшна. Што калі не хопіць сілы? І нідзе ніводнай жывой душы. Толькі неба, вада і Косця. Раптам ён заўважыў у небе срабрыстую чайку-крачку. Яна імклівa пранеслася над Косцем і мякка апусцілася на ваду. Косця ўзрадаваўся, нават адчуў прыліў сілы. Ён узрадаваўся крачцы, як жывой істоце, якая апынулася тут, разам з Косцем, на гэтым неабсяжным водным прасцягу, і яшчэ таму, што яго пачала суцяшаць думка: недзе ўжо зусім блізка берег. Ці хто казаў, ці ён сам чытаў недзе, што крачкі лятаюць непадалёк ад берагу.

— Косця! Косця! — нехта паклікаў яго.— Падніма йся. Хопіць д-дрыхнуць.

Толькі цяпер Пальцімовіч прачнуўся. Ён расплюшчыў вочы. Над ім стаяў Віктар Янкевіч.

— Віктар?! Ты?!

— А-а хто ты думаў?

— Добра, што пабудзіў. Думаў, не выплыву.

Віктар жартаваў, смяяўся, размаўляў з ім па-прыяцельску шчыра, нібы Косця і не выступаў на сходзе супраць яго. Нібы і крыўдаваць не ўмее.

— Ты што, зноў заснуў? — Віктар таўхануў Косцю пад бок — Апранайся. Сёння культпаход на танцы.

Косця ўзяў ручнік, мыла і выйшаў. Сюдзёная вада надала бадзёрасці, яснасці думкам. З Юлькай Косця сустракаўся часта, і на рабоце, і заходзіў да яе ў інтэрнат. Браў падручнікі за дзесяцігодку. Яны рыхтаваліся паступаць у інстытут. Два месяцы хадзілі на падрыхтоўчыя курсы, а потым кінулі. І Косця, і Юлька працавалі пазменна. Па два тыдні прапускаць заняткі—карысці ад курсаў мала. І яны рашылі займацца самастойна.

Раз, а то і два на тыдні Косця і Юлька рабілі, як казаў Косця, культпаход у кіно або на танцы. Хадзілі заўсёды ўчацвярых: Віктар са сваёй Галяй Доўдзік (яна, як і Віктар, закончыла індустрыяльны тэхнікум) і Косця з Юлькай.

Юлька... Дзіўная, цудоўная дзяўчына. Неяк яны гулялі каля інтэрната. Быў ціхі вечар.

— Глядзі, Косця, як месячык ад хмарак уцякае. Гэта ён хоча, каб нам было відна.

Разам з ёю і Пальцімовічу здавалася ўсё навокал дзіўным і таямнічым. І ён любіў яе за гэта. Але прызнацца ў сваіх пачуццях баяўся. Юлька, пэўна, здагадвалася пра гэта і дарыла яму сваю душэўную даверлівасць.

— Косця, ты нікому не скажаш? — раптам пытала яна.

— Што?

— Дай чэснае слова, што нікоменьку не скажаш.

— Чэснае слова.

— Я пішу вершы. Толькі ты не смейся.

— Я не смяюся.

— Слухай, які я напісала верш.

І Юлька пачала чытаць:

Прэс тарахціць, цагліны рубіць
жвава;
Па лепце мчыць сырэц вільготны,
гладкі.
Бярэш яго і тут жа, без аглядкі,
Кладзеш на ваганетку, не паспеўшы
нават
Абцерці з твару крупінкі гліны...

У вершы Юлька расказвала пра тое, як цяжка рабіць цэглу. Але затое якія прыгожыя з яе пабудуюць дамы, палацы культуры. Людзі будуць захапляцца прыгажосцю пабудоў, хваліць архітэктара, будаўнікоў, і ніхто не ўспомніць пра цяжкую працу прасаўшчыцы-здымшчыцы. Гаварыла Юлька пра гэта з нейкім смуткам. Потым голас яе мужнеў, гучаў горда:

Ды толькі б дзе ні быў ён,
а свой брусочак гліны—
Хай будзе не такі—знайду сярод
чужых.
Як асабісты штамп,
на кожненькай цагліне
Адбіткі засталіся пальцаў рук маіх.

— Ну як?—пыталася Юлька.

— Цудоўна!—адказаў Косця. — У тонкасцях верша я не разбіраюся, але мне падабаецца. Ты пасылала ў рэдакцыю?

— Не.

— Трэба паслаць. Абавязкова трэба паслаць.

— Я саромеюся.

— От дзівачка. А можа, у цябе талент?

— Так ужо і талент. Проста іншы раз сумна сядзець адной у пакоі. Думкі розныя прыходзяць, у вершык кладуцца.

Толькі тады Касця зразумеў, чаму Юлька ўмее ў звычайным бачыць незвычайнае, а ў простым загадкавае і таямнічае. Нешта падобнае ён назіраў і ў Віктара.

— Віктар, ты сапраўды на мяне не крыўдзішся?—ужо калі ішлі ў дзявочы інтэрнат, спытаўся Косця.

— За што?

— Ды што так атрымалася. Ты думаеш, я не разумею рабочых? Ім зарабіць хочацца. Аднойчы я падлічыў: чатыры здымшчыцы за змену вымаюць трыццаць дзве тысячы цаглін. Кожная цагліна па чатыры кілаграмы. Вось і прыкінь: за восем гадзін адна здымшчыца перакідае па трыццаць дзве тоны. І гэта семнаццаці-васемнаццацігадовае дзяўчо, учарашняя школьніца.

— Не ўсім жа цукеркі ўпакоўваць.

— Яно так. Але я хачу сказаць пра іншае. Дарэмна я тады пагарачыўся: і перад людзьмі сорамна, і перад табой няёмка.

Віктар паглядзеў на Косцю, усміхнуўся.

— А раніцой ты мне больш падабаўся.

— Добры ты хлопец, Віктар.

— Я гляджу на такія рэчы аб'ектыўна. Прабач,—раптам перавёў Віктар гаворку на другое.—Я і забыўся сказаць. Начальства рэкамендуе цябе ў склад бюро камсамола завода.

Хвіліну Косця не мог сказаць ні слова. Цяпер пойдзе па заводзе гаворка, што Косця падседжвае хлопцаў, не шкадуе нават сяброў, прабіваючы сабе дарогу. Есць жа такія кар'ерысты. Іх на першым часе лічаць за адданых, шчырых людзей. А калі разбяруцца, тураць у каршэнь.

Няўжо і Віктар думае, што Косця— падхалім?

— Гэта ж толькі па ка-арысць. Я, ці ведаеш, за-аяву падаў па зва-альнене,—працягваў тым часам Віктар .

— Звар'яцеў?!

— Ніколечкі. Ну па-адумай сам, які з мя-але майстар,—Віктар хваляваўся, — сва-арыцца з людзьмі не ўмею. Р-рабочыя, што захочуць, тое і робяць. Ты думаеш...

Косця бачыў, што гаварыць Віктару было цяжка: твар заліла чырвань, а на шыі ўспухлі жылы.

— Я сам бачыў той брак. Казаў ім. Але ж яны не слухалі. Так што не ты, а я цябе падводзіў. І даўно.

— І куды цяпер?—пасля доўгай паўзы спытаўся Косця.

— Была б шыя—хамут знойдзецца. Пайду слесарам на рамонтны.

Хлопцы звярнулі ў сквер. Канчаўся красавік. Сонца шчыравала заўзята. Дрэвы, якія яшчэ ўчора былі голыя, сёння пакрыліся празрыстай зеляніной. Пахла цёплым туманам, маладой лістотай і травой. Недзе ў бярэзніку спявала берасцянка. Свісталі шпакі. Ад дрэў цягнуліся доўгія цені. Павяваў ціхі ветрык. Вясна ўступала ў самую бурную, прыгожую пару. Гэта ж амаль паўгода прайшло, як прыехаў сюды Косця. Не многа і не мала. Ва ўсякім выпадку, паспеў зжыцца з людзьмі, нібы ведаў іх даўно-даўно, з самага дня нараджэння. І завод з яго клопатамі-турботамі стаў часткай ягонага жыцця.

Раней, калі Косця толькі ўладкаваўся, і падумаць не мог, што будзе вось гэтак перажываць з-за нейкага там браку, цікавіцца жыццём завода. Сюды ён прыехаў, каб паступіць вучыцца далей. Працаваць і вучыцца. На матчыну дапамогу не разлічваў. У той, апрача Косці, было яшчэ трое—канчалі школу. Яму было ўсё роўна, дзе працаваць. Галоўнае, каб мог апрануцца і пракарміць сябе. Але цяпер, калі зведаў працу, пазнаў гэтых простых, па-свойму сімпатычных людзей, ён сам заразіўся іхнімі клопатамі, жаданнямі, іхнімі марамі.

Пазнаў... Пэўна, гэта не тое слова. Проста звыкся, палюбіў іх. Але пазнаць чалавека вельмі цяжка. Што ён ведае пра Віктара? Нічога. А сябравалі. Гаварылі; здавалася, пра самае патаемнае. І раптам адкрываецца, што Віктар не заўсёды быў з ім шчыры. Косця ніяк не мог зразумець таварыша: Да апошняй хвіліны ён быў упэўнены, што першы адкрыў людзям вочы на праўду і моцна перажываў, што давялося пакрыўдзіць Віктара. А на самай справе той даўно ведаў пра ўсё. Дык чаго ж прыкідваўся нязнайкам, калі заходзіў у камеру, каб пераканаць Косцю, што ніякага браку няма?

Косця спыніўся. Потым крута павярнуў назад. Яму хацелася застацца самнасам. Разабрацца ў сабе. Ён ніколі не рабіў паспешлівых вываадаў. Калі хто быў вінаваты перад ім, у думках ён ставіў сябе на яго месца: як бы сам зрабіў? Таму цяпер Косцю захацелася пабыць аднаму. Падумаць, разважыць.

## ВУЛІЦЫ ДАРАГІХ ІМЁН

Бабруйск, вуліца Пушкіна.
Малюнкі Ул. СІБІРАКОВА.

Брэсцкі дывановы камбінат. Здымак зроблен у мастацкай майстэрні камбіната, дзе ідзе абмеркаванне новых дываноў.

НА ЗДЫМКУ: галоўны мастак прадпрыемства Уладзімір Гусеў (справа) з мастакамі Анатолем Мазуркевічам і Мікалаем Сцебленкам.

Фота В. ДУБІНКІ.

# СТАРЭЙШЫ МАСТАК

НЯДАЎНА споўнілася 70 гадоў з дня нараджэння нашага земляка, таленавітага мастака-графіка Валерыяна Дзмітрыевіча Дваракоўскага. В. Дваракоўскі нарадзіўся пад Мінскам у сям'і, якой былі блізкія пытанні мастацтва. Бацька яго, Дзмітрый Каэтанавіч — мастак. Удзельнічаў у выстаўках, выкладаў маляванне ў навучальных установах горада Мінска. У дзіцячыя і юнацкія гады Валерыян Дваракоўскі захапляўся маляваннем і ўвесь вольны час ад школьных заняткаў прысвячаў любімай справе. У 1924 годзе паехаў у Ленінград і паступіў у Акадэмію мастацтваў. Пасля заканчэння акадэміі ў 1929 годзе вярнуўся ў Мінск і заняў пасаду мастацкага рэдактара ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Гады працы ў выдавецтве былі вельмі плённымі, як для самога мастака, так і для выдавецтва. Пры яго дапамозе афармленне выдавецкай прадукцыі пры старой аснашчанасці друкарань таго часу, як у тэхнічных, так і мастацкіх адносінах, было ўзнята на належную вышыню. Ён з вялікай любоўю і веданнем перадаваў сваё ўменне мастакам, якія згрупаваліся вакол выдавецтва, і дапамагаў ім у рабоце. Асабліва гэта адбілася на развіцці і ўдасканаленні шрыфта, галоўнага кампанента канструкцыі вокладкі і кнігі ў цэлым. За час работы ў Белдзяржвыдавецтве ім было афармлена нямала кніг: па мастацкай літаратуры, серый па навукова-папулярных, сельскагаспадарчых і іншых выданнях. Сярод іх можна назваць афармленне кніг першых выданняў: Тарас Гушча (Якуб Колас) — «На прасторах жыцця», «У глыбі Палесся», Язэп Гушча—«Песні на руінах», Зм. Зарэцкі —«У віры жыцця» Янка Купала — «Збор твораў» і іншыя. Вельмі цікава была афармлена кніга Маршака «Пажарнікі», літаграфіраваная адным са старэйшых літографаў г. Мінска — Добрушкісам.

У пачатку трыццатых гадоў па запрошэнню Ленгіза В. Дваракоўскі зноў працуе ў ленінградскіх выдавецтвах, не спыняючы сувязі з беларускай культурай. І тут, паглыбляючы творчыя пошукі ў сваіх знаходках, ён знайшоў нямала пасляваўны, знаходзячыся ў асаджаным Ленінградзе, В. Дваракоўскі працягваў работу ў выдавецтвах і сваёй творчай працай дапамагаў адстойваць яго ад нямецкіх фашыстаў.

Многія кнігі афармленыя В. Дваракоўскім працягваюць жыць на паліцах бібліятэк. Кнігалюбы беражліва захоўваюць іх. Яны ведаюць, што такія кнігі прыносяць шмат радасных мінут. У іх таксама як і ў людзей бывае розны лёс. Хочацца расказаць аб адной з кніг, ілюстраваных В. Дваракоўскім. На міжнароднай выстаўцы «Кніга-75» у Маскве, у раздзеле «Кнігі-ветэраны» сярод кніг апаленых вайной, экспанаваўся твор А. С. Пушкіна — «Яўгеній Анегін». Год выдання — 1937-ы. Пераплёт, тытул, шмуцтытул па малюнках В. Дваракоўскага. Яна належыла камандзіру ўзвода артылерыйскага дывізіёна Ваенна-Марскіх Сіл Ю. М. Непрынцаву; прайшла з ім праз баі па ўсяму Ленінградскаму фронту. У 1968 г. народны мастак СССР Ю. М. Непрынцаў падарыў дарагую сэрцу рэліквію музею А. С. Пушкіна. Мне неаднаразова даводзілася сустракацца і бываць у доме, дзе жылі і працавалі для беларускай культуры два пакаленні мастакоў. Дарэчы, дом захаваўся, а мастакі незаслужана забыты. І даводзіцца пашкадаваць, што некаторыя мастацтвазнаўцы, працуючы над манаграфіямі і гісторыяй беларускага выяўленчага мастацтва, мала даследуюць матэрыялы і не дастаткова сур'ёзна падыходзяць да іх вывучэння. У той час, як выдавецтва «Советское искусство» выдала манаграфію пра В. Дваракоўскага ў 7—8 тамах «Истории народов СССР», у раздзелах, прысвечаных мастацтву БССР і ў некаторых іншых выданнях яму адводзіцца заслужанае месца.

**А. ТЫЧЫНА,**
мастак.

# ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

Журботна застылі ля свежай магілы тры салдаты, даючы маўклівую клятву загінуўшаму таварышу адпомсціць ворагу. Такі сюжэт дыпломнай карціны «Клятва» аднаго з першых выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Георгія Паплаўскага — цяпер вядомага графіка, лаўрэата Міжнароднай прэміі імя Джавахарлала Нэру. Гэта палатно дэманструецца на выстаўцы курсавых і дыпломных работ выхаванцаў мастацкага факультэта, якая адкрылася 2 ліпеня ў Палацы мастацтваў і прысвечана трыццацігоддзю інстытута.

У залах шырока прадстаўлены жывапіс, скульптура, кніжная і станковая графіка, эскізы роспісаў, вітражы, вырабы са шкла і керамікі, дываны, габелены і тканіны, праекты і канструктарскія работы маладых архітэктараў.

— Многія з гэтых твораў адзначаны дыпломамі рэспубліканскіх, саюзных і міжнародных выставак, ВДНГ БССР і СССР, увайшлі ў фонд беларускіх музеяў, абаронены аўтарскімі пасведчаннямі і ўкарапёны ў вытворчасць, — расказвае былы выпускнік інстытута, дэкан мастацкага факультэта, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. А. Грамыка. — Так, праекты інтэр'ераў, прамысловага абсталявання, сродкаў транспарту, бытавых вырабаў, створаныя студэнтамі, выкарыстаны пры афармленні прадпрыемстваў і грамадскіх будынкаў, у серыйным выпуску розпай прадукцыі.

Наборы пасуды, тканіны, габелены і дываны вырабляюцца на шкло- і фарфоравых заводах, прадпрыемствах лёгкай прамысловасці. Прычым, некаторым з іх прысвоены дзяржаўны Знак якасці.

Творы мастакоў-станкавістаў адлюстроўваюць героіку рэвалюцыі і першых пяцігодак, баявое мінулае савецкага народа і сённяшні дзень рэспублікі. Мне б хацелася адзначыць маляўнічыя карціны С. Шафрановіча — «Стачка», Я. Куліка — «Камсамольскі суботнік», Я. Ясвіна — «Бежанцы 1941 г.», Г. Барэйкі — «Хірургі», В. Сумарава — «Плытагоны».

Наведвальнікі выстаўкі змогуць пазнаёміцца не толькі з дасягненнямі маладых жывапісцаў, скульптараў і графікаў, але і як бы зазірнуць у майстэрні, убачыць вучэбны працэс — у некалькіх раздзелах экспазіцыі шырока прадстаўлены акадэмічныя малюнкі, эцюды і эскізы.

Са сцен нашага інстытута, працягвае свой расказ В. А. Грамыка, выйшла нямала вядомых у рэспубліцы і краіне мастакоў, многія выпускнікі працуюць па вытворчасці, у канструктарскіх бюро, выдавецтвах, уваходзяць у мастацкія саветы. Сто сорак былых студэнтаў сталі членамі Саюза мастакоў БССР. Інстытут ганарыцца лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі БССР народным мастаком рэспублікі А. Анікейчыкам, заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі А. Кашкурэвічам, Л. Гумілеўскім і іншымі выпускнікамі, якія ўдастаены ганаровых званняў. Цяпер яны працягваюць справу сваіх настаўнікаў — народных мастакоў БССР А. Бембеля, В. Цвіркі, В. Волкава, А. Глебава, абучаючы студэнтаў інстытута.

Цяпер на дзевяці кафедрах мастацкага факультэта вучацца больш чым 400 мастакоў-станкавістаў і прыкладнікоў. Штогод для народнай гаспадаркі тут рыхтуюцца спецыялісты чатырнаццаці прафесій.

Выстаўкі іх работ мы збіраемся зрабіць традыцыйнымі.

**В. БІРУКОЎ.**
**(Кар. БЕЛТА).**

# ТБ

Глядзіце на наступным тыдні перадачы Беларускага тэлебачання для аматараў літаратуры і мастацтва.

**У панядзелак, 12 ліпеня,** у **14.35** па першай праграме перадача «На IV Міжнародным кінафестывалі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі». У **17.30** запрашаем на канцэрт хору Беларускага тэлебачання і радыё. У **19.45** — прэм'ера тэлевізійнага музычнага спектакля «Блакітная мазурка» паводле аперэты Ф. Легара.

Па другой праграме ў **19.50** — «У нас у гасцях Львоўскі акадэмічны тэатр імя М. Заньковецкай.

**13 ліпеня, у аўторак,** па першай праграме ў **19.00** — прэм'ера тэлевізійнага дакументальнага фільма «Ангола. Барацьба працягваецца».

Па другой праграме ў **18.30** — «Музычны абанемент». Спявае Галіна Калініна.

**14 ліпеня, у серэду,** у **15.20** па першай праграме пацікаўцеся творчасцю П. Пэруды. У **19.00** адбудзецца канцэрт народнай музыкі. У **19.50** — тэлевізійны дакументальны фільм «Рэвадка: сябры і ворагі».

**У чацвер, 15 ліпеня,** па першай праграме ў **18.15** — «Літаратурны тэатр». «Стану песняй у народзе». Перадача падрыхтавана да 100-годдзя з дня нараджэння Цёткі, выдатнай беларускай паэтэсы-рэвалюцыянеркі. У **19.00** — перадача «Творчасць народаў свету». У **19.30** — «Дакументальны экран». Вядучы — паэт Р. Раждественскі. У **22.35** — «Выязны канцэрт». Вы будзеце сведкамі сустрачы эстрадна-сімфанічнага аркестра Беларускага тэлебачання і радыё з работнікамі ДАІ.

Па другой праграме ў **15.25** перадача «М. А. Някрасаў і руская народная песня».

**У пятніцу, 16 ліпеня,** у **18.25** па першай праграме тэлевізійны нарыс расказа пра работу народных універсітэтаў культуры. У **19.05** адбудзецца прэм'ера новага тэлевізійнага дакументальнага фільма «Палесцінцы». Аўтар сцэнарыя Ф. Сейфуль Мулюкоў. Уступнае слова перад фільмам зробіць намеснік старшыні Савецкага Камітэта салідарнасці краін Азіі і Афрыкі, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР В. Л. Кудрэўцаў.

У **20.05** слухайце эстрадную праграму з удзелам народнага артыста СССР Л. Уцёсава «Калі прыходзіць маладосць». У **22.35** запрашаем на канцэрт навучэнцаў Маскоўскага акадэмічнага харэаграфічнага вучылішча.

Па другой праграме ў **15.40** вы пазнаёміцеся з творчасцю савецкага паэта Іраклія Абашыдзе.

**У суботу, 17 ліпеня,** у **12.10** па першай праграме пачнецца 2-я перадача «Жывапіс Францыі» з цыкла «Па музеях і выставачных залях». Вы пазнаёміцеся з шэдэўрамі, што захоўваюцца ў Дзяржаўным музеі імя А. С. Пушкіна.

З надзеямі ў музычным жыцці беларускай сталіцы вас пазнаёміць «Камертон» у **14.50.** У **18.15** спявае А. Салаўяненка. Упершыню на тэлеэкране ў **19.50** вы ўбачыце спектакль па п'есе А. Гладкова «Маладосць тэатра» ў пастаноўцы Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Вахтангава. У 22.45 — канцэрт артыстаў зарубежнай эстрады. Глядзіце і слухайце японскі квартэт «Боні Дзякс».

У **14.00** па другой праграме дакументальны фільм «Вялікі тэатр учора і сёння».

**У нядзелю, 18 ліпеня,** па першай праграме пачнецца чарговая цыклавая перадача «На вуліцы Нежданавай». На гэты раз тут збярэцца маладыя салісты Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Саюза ССР. Вядучая — музыказнаўца Вольга Дабрахотава.

# СВЕТЛАЕ, ЧАЛАВЕЧНАЕ...

ЗДАВАЛАСЯ, адбыўся цуд. Кветка жыла. Насуперак усяму. На самым краі варонкі. Яе белыя пялёсткі не спалучаліся ні з пабурэлай зямлёй, ні з перакручанымі бярозамі, абгарэлае голле якіх, нібы рукі, цягнулася да неба, заклікаючы да помсты. Тут зусім нядаўна ішоў танкавы бой. Лейтэнант Мінейка чуў выбухі снарадаў, пранізлівыя посвісты куль.

Усёй сваёй істотай адчуваў ён гарачы подых бою з бразгатаннем танкавых гусеніц, крыкамі людзей. Нашы рваліся наперад, вораг адкатваўся назад.

Кветка ацалела. Побач дымілася разварочаная снарадамі зямля. Мінейка прысеў каля варонкі, задумаўся.

Успомніліся Гатчына, дзе прайшлі школьныя гады, блакадны Ленінград, адкуль пайшоў ён у ваеннае вучылішча. Мінейка яшчэ раз зірнуў на кветку, усміхнуўся: улюбёныя сябруюць з рамонкам.

Мастак лічыць, што калі б яго памяць, яго сэрца захавалі толькі трагедыю вайны, яе горкі вопыт, ён не стаў бы жывапісцам. «Пакуты робяць чалавека жорсткім, сушаць душу,— разважае Мінейка.— Вядома, пейзія ўзрушэнні, цяжкасці загартоўваюць, умацоўваюць характар, але зусім не абавязкова, каб біяграфія мастака была напоўнена толькі імі. Радасці, сустрэчы, прыгажосць, праца, прырода, адным словам тая кветка, якую я ў сорак чацвёртым убачыў на краі варонкі, — вытокі натхнення для мяне».

Зразумела, цяжка знайсці выяўленчыя сродкі, якія маглі б цэласна і паэтычна выказаць свет, у якім мы жывём. Цяжка, але можна. Пра гэта задумваешся, разглядаючы творы Ул. Мінейкі. Першыя работы, напісаныя пад непасрэдным уплывам яго настаўніка В. В. Волкава. Маленькая жанравая карціна «Зняпацку» і скрупулёзныя эцюды да яе, жывапісныя накіды, выкананыя ў творчых паездках на новабудоўлі і калгасы Беларусі — гэта пачатак доўгіх і пакутлівых пошукаў свайго «я» ў мастацтве.

Першым крокам мастака ў асваенні ўласнай тэмы — тэмы трывожнага гераічнага юнацтва нашых бацькоў і дзядоў, якія будавалі Савецкую ўладу на сяле,—былі палотны «Па сваёй зямлі», «Трывожнае юнацтва», «Быліна», якія ў свой час добра «прагучалі» на выстаўках.

Карціна «Сейбіты» — працяг гэтай тэмы. Цэнтральную частку палатна займае група сейбітаў, учарашніх чырвонаармейцаў, якія пачалі сумесную работу на агульным полі. Цёмна-чырвоная тлустая зямля, упершыню разараная без межаў, распасцерлася да небакраю. Спадзяванні, упэўненасць — на тварах сяляк, прадстаўнікоў вёскі часу вялікіх змен. Задума карціны «Сейбіты» ўзнікла ў канцы 60-х гадоў. Усё палатно пісалася ў 70-х гадах. Яно — пра час і пра чалавечнасць, пра гуманізм. У карціне — цэнтральны вобраз жанчыны, мадонны першых савецкіх пяцігодак. Пластычнае вырашэнне вобраза прыгожае, у ім яскрава праступае галоўная ідэя палатна, якая канкрэтызуецца ў сюжэтных каментарыях-клеймах, якія адлюстроўваюць розныя сцэны жыцця паслякастрычніцкай Беларусі.

Не стварэнне партрэта маці было мэтай аўтара. Гутарка ідзе ў ёй пра значна большае: пра непарыўныя сувязі пакаленняў і эпох, пра неаддзельнасць лёсу краіны і яе людзей...

— Я не імкнуўся, не мог ставіць сваёй задачай расказаць пра час, сведкай якога сам не быў, — гаворыць мастак. — Але мне вельмі хацелася, калі я працаваў над палотнамі пра 20-я гады, перадаць у іх, што той дзіўны, векапомны час не проста старонка гісторыі, а і маё жыццё... І яшчэ — што ўсе мы, колькі б нам ні было гадоў, маем дачыненне да адзінай вялікай біяграфіі — біяграфіі Радзімы. А каб гледачы мяне лепш зразумелі, я і назваў галоўную сваю карціну пра тую эпоху «Мая маці».

Шмат увагі, асабліва ў апошні час, надае мастак жанру партрэта. Ён стварыў вялікую галерэю жывапісных і графічных партрэтаў людзей інтэлектуальнай працы, дзеячаў навукі і мастацтва, калгаснікаў, студэнтаў. Пачуццё меры, густ дыктуюць яму тыя грані і адценні ў стварэнні аблічча чалавека, якія вельмі важныя ў паэтычным мастацтве: ствараюць тончэйшыя нюансы вобраза, ажыўляюць партрэт, напаўняюць яго трапяткім жыццём.

Вось «Партрэт члена-карэспандэнта АН БССР В. Б. Несцярэнкі». Прыгожы гэты чалавек. І позірк пільны, крыху прыжмураны — прывык думаць аналітычна, дакладна, беспамылкова. У яго поглядзе, накіраваным проста на нас, заключана настойлівае, звернутае да самога сябе пытанне. Халодны фон, прачэрчаны пяроўнымі ўзмахамі пэндзля, стварае адчуванне велізарнай, трывожнай прасторы. Партрэт характэрны перш за ўсё імкненнем чалавека пазнаць самога сябе.

Крэда Мінейкі ясна выступае амаль у кожным створаным ім партрэце. Але немалаважную ролю пры гэтым мае дакладнасць індывідуальнай характарыстыкі. Яны вельмі розныя, яго партрэтуемыя — паглыблены ў сябе фізік В. Барысевіч у палотнах «Вучоны» і «Партрэт В. А. Барысевіча», адкрыты і ў той жа час стрыманы ў праяве сваіх пачуццяў Ю. Сушко; сканцэнтраваныя ў сваіх роздумах А. Радзялоўскі і У. Каралёў...

Індывідуальны характар у спалучэнні з тыповымі рысамі часу — вось галоўнае для мастака, які стварае вобраз героя нашага часу. Мінейка ў карціне «Рабочая нарада» імкнуўся ўшчыльную наблізіцца да вырашэння гэтай цяжкой задачы. Ён знайшоў і непаўторнае аблічча для кожнага персанажа, і пераканаў нас у тым, што ўсе яны— вучоныя-фізікі, людзі актыўнай думкі. І тым больш непрыемна, што палатно ўсё ж не стала цэльным — яшчэ адно пацвярджэнне таго, як цяжка пісаць групавы партрэт. Мастак не змог зрабіць палатно эмацыянальным, не выказаў аўтарскіх адносін да сваіх персанажаў. Таму яно выглядае крыху халодным і разважлівым, без таго ўнутранага аўтарскага гарэння, з якім была створана карціна «Вучоны». У карціне «Вучоны» (В. Барысевіч), мне здаецца, намечаны шлях мастака да новых пошукаў вялікай кампазіцыйнай і колернай выразнасці, шлях, які, магчыма, заўтра прывядзе яго да новых поспехаў. Акрамя таго, гэты партрэт, хаця і не прэтэндуе на «актуальнасць», тэмы, пацвярджае, што мастаку блізкае ўнутранае, духоўнае жыццё партрэтуемага. І гэта, у першую чаргу, нягледзячы на незавершанасць асобных месц, вызначае мастацкія якасці твора, спыняе ўвагу гледача.

Пейзажы. Іх у Мінейкі шмат. Некаторыя работы, як «І зноў лета», «Дзень гасне», «Першая зеляніна», «Блакітны вечар», «Вясна на Прыпяці», «Нараджэнне вясны» ўнутрана закончаны. Гэта, калі хочаце, лірычныя матывы, якія інакш не маглі быць выказаны, акрамя як у нешматслоўным сюжэце, з перавагай уражання над дзеяннем. Сувязь з акаляючым, абвостранае адчуванне жывога імгнення — вось прывабныя рысы лепшых работ Мінейкі ў гэтым жанры. Ён піша прыроду па-рознаму. Тонкае адчуванне яе разнастайнасці прымушае яго мяняць не толькі фарбы, але і сам мазок, сам характар выражэння ўласных уражанняў. Таму і розныя ў яго па ўспрыманню матывы, між іншым, як і розныя па ўспрыманню і яго нацюрморты, прысвечаныя роднай зямлі.

Цяпер, калі на юбілейнай выстаўцы мастака ў Палацы мастацтваў былі сабраны ў адной экспазіцыі творы Мінейкі, мы атрымалі магчымасць меркаваць пра яго творчасць у цэлым, а галоўнае — паглядзець на свет яго вачамі, ацаніць яго майстэрства, зразумець яго перамогі і пяўдачы.

Мастацтва У. Мінейкі—добрае, светлае, чалавечнае і сучаснае. Яно аблюстроўвае наша жыццё і мінулае, адфільтраванае праз сённяшнюю прызму людзей, што жывуць побач; асяроддзе і прыроду, у якой мы знаходзімся; тое дзіўнае і добрае, чаго мы часам не заўважаем; тую кветку, якая ўвасабляе сабою вечную перамогу жыцця.

Б. КРЭПАК.

Фізікі: В. Каралёў, В. Барысевіч, А. Радзялоўскі.

У. Мінейка. «Мая маці».

Літаратурная пятніца

**«ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЦЬ ТЭЛЕВІЗІЙНЫХ І РАДЫЁВЯШЧАЛЬНЫХ ПРАГРАМ».**

**«Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады»**

**Як вядома, рэжысура цяпер набывае ўсё большае значэнне ў ідэйна-мастацкай арганізацыі кінатвора, тэатральнага спектакля, тэлевізійнай праграмы, радыёперадачы. Што азначае— арганізацыя пастаноўкі? Тут адыгрывае вялікую ролю кожны кампанент — кампазіцыя, мантаж, размеркаванне тэксту сярод выканаўцаў, музычнае афармленне... Бывае, ад таго, хто выконвае ролю галоўнай дзейнай асобы або піша музыку, адразу ж вызначаецца характар будучага гучання спектакля, фільма, радыёп'есы. Таму рэдакцыя «Літаратуры і мастацтва» палічыла мэтазгодным наладзіць творчую размову пра актуальныя праблемы рэжысуры на радыё. Для ўдзелу ў ёй былі запрошаны галоўны рэжысёр Беларускага радыё Ігар Лапцінскі, рэжысёр перадач на сельскагаспадарчыя тэмы Тамара Старасценка, заслужаны дзеяч культуры БССР Таццяна Аляксеева, галоўны рэжысёр рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач Соф'я Гурыч, рэжысёр вяшчання для моладзі Георгій Ляшэвіч, рэжысёр прамысловай рэдакцыі Уладзімір Багалюбскі, рэжысёр музычных перадач Ірына Андрэева, рэжысёр дзіцячых перадач Галіна Малумава, рэжысёр перадач рэдакцыі прапаганды Валерыя Несцяровіч і рэжысёр зарубежнага вяшчання Сяргей Стэфановіч. Першае слова — дыктару радыё і пазаштатнаму карэспандэнту «ЛіМа» Адзе Каламінскай.**

# АЎДЫТОРЫЯ—МІЛЬЁНЫ

КАЛАМІНСКАЯ. З удзельнікамі размовы мы сустракаемся часта: напярэдадні перадач і пасля іх, на запісах і ў перапынках паміж запісамі (як вядома, большасць буйных перадач на радыё запісваюць на магнітафонную стужку, а потым яны гучаць у эфіры). Клопат у аўтараў, выканаўцаў, у тым ліку і дыктараў, і рэжысёраў на радыё агульны: як мага лепш, на высокім ідэйна-мастацкім узроўні выконваць указанні XXV з'езда КПСС.

За 50 гадоў работы калектыў Беларускага радыё набыў вялікі творчы вопыт і ў галіне радыёрэжысуры. Склаліся мастацкія традыцыі, ідзе пошук новага. Узбагачаецца арсенал выяўленчых сродкаў. Змены адбываюцца і ў метадах работы з выканаўцам — з дыктарам і акцёрам. Усе работнікі адчуваюць неабходнасць найбольш даходлівага, яркага, свежага ўвасаблення радыёінфармацыі (у шырокім разуменні гэтага слова).

Мая першая сустрэча з рэжысёрам?.. Помню, зайшоў у нашу маленькую дыктарскую (яшчэ на Рэвалюцыйнай вуліцы) чалавек невялікага росту, зусім лысы. Усмешлівы твар, дапытлівыя вочы. Прывітаўся ветліва. «Разумееце, запісаць трэба некалькі слоў, зусім мала»,—сказаў, крыху расцягваючы і нібы друкуючы па складах словы. І да мяне: «Вы свабодная, зможаце?» Я была свабоднай, але — ці змагу я?.. Тэксту было старонкі паўтары. Па тагачасных маіх паняццях гэта здавалася неверагодна многа!.. Чытаю — музычны каляндар. Расказвалася пра музычныя прэм'еры, канцэрты, пра новых выканаўцаў-гастралёраў. Матэрыял напісаны з захапленнем — гэта адчувалася ў свабоднай пабудове фразы, у прыўзнятым тоне аўтарскіх параўнанняў, асацыяцый. Адным словам, тэкст спадабаўся, здалося, што я «змагу».

За шклом у апаратнай — мой першы рэжысёр Павел Аўрамавіч Данілаў. Чамусьці доўга (так мне здалося) не пачынаўся запіс. Я ўжо два або тры разы прачытала ўвесь тэкст, ведала яго амаль напамяць, а яны там усё гавораць за шклом: «яны» — гэта гукарэжысёр, аператар і рэжысёр. У той момант, калі я пачала амаль пазяхаць, пачуўся голас Паўла Аўрамавіча: «Ну, што ж, пачнём. Пачытайце на пробу. Мы настроім апаратуру».

І я пачала чытаць. Напамінаю, тэкст мне вельмі падабаўся, і я, як і трэба было чакаць ад пачынаючага дыктара, літаральна захлыналася ад захаплення. І тут на дапамогу прыйшоў рэжысёр. Ён цярпліва растлумачыў мне, што ў тэксце ўжо ёсць аўтарскія эмоцыі — добры настрой, аўтарская квяцістая мова — вось тут дыктару лепш за ўсё быць больш стрыманым, хоць тон і настрой павінны заставацца мажорнымі. Так упершыню я зразумела, што існуе выканаўчы грэх «перасаліць» тэкст, а дакладней— «перасаладзіць». Ідзе гэта ад добрага жадання маладога выканаўцы быць у добрым настроі, падабацца слухачам, ад натуральнага пачуцця задавальнення, якое прыносіць і добры тэкст, і музыка. А што атрымліваецца: «перадаў» эмоцый, меру не знайшоў — выдаў дыктарскі брак.

Трэба сказаць, што работа дыктара з рэжысёрам — гэта шматгранны творчы працэс, у якім урок атрымліваюць абедзве творчыя адзінкі. На Беларускім радыё працуюць 10 рэжысёраў, 10 чалавечых індывідуальнасцей! Кожны з нас, выканаўцаў-дыктараў, па два і тры разы ў дзень сустракаецца з рэжысёрам на запісу перадач. Шматлікія «ўрокі» ператвараюцца ў шматгранную «школу», школу рэжысуры і выканання...

ЛАПЦІНСКІ. Гутарку пра нашы агульныя абавязкі я хачу падмацаваць некаторымі цікавымі выпіскамі з маіх спыткаў. Вось: «Рэжысёр — гэта чалавек, які валодае здольнасцю назіраць, умець думаць і будаваць сваю работу так, каб яна ўзбуджала ў гледача думкі, патрэбныя сучаснасці» (Станіслаўскі). Яшчэ выпіска з Неміровіча-Данчанкі: «Рэжысёр—істота трохаблічная... Ён — тлумачальнік, ён жа—паказвае як іграць; так што яго можна назваць рэжысёрам-акцёрам або рэжысёрам - педагогам. Рэжысёр — люстра, якое адлюстроўвае індывідуальныя якасці акцёра. Рэжысёр — гэта арганізатар усяго спектакля...». На маю думку, гэтыя выказванні поўнасцю адносяцца і да рэжысёраў радыё. Але, безумоўна, не вычэрпваюць асаблівасці нашай работы. Рэжысёр радыё разлічвае ўсю работу на слыхавое ўспрыманне. Гэтым мы адрозніваемся ад сваіх калег у тэатры, кіно, на тэлебачанні У нас няма такой стабільнасці форм, якая ёсць у тэатры, у кіно. Мы абавязаны пастаянна шукаць новыя формы, інакш радыё пагражалі б сум, застой.

Светапогляд радыёрэжысёра, як і кожнага савецкага мастака, перш за ўсё ў арганічнай патрэбнасці сродкамі сваёй прафесіі прымаць актыўны ўдзел у выхаванні чалавека новага камуністычнага грамадства. Гэта—і асабістая патрэбнасць, і грамадзянскі абавязак. Але працуеш ты па «чужым» тэксце. Знаёмішся з літаратурным матэрыялам—узнікае задума, «бачанне» перадачы. Усё пачынаецца з задумы. Без загадзя вызначанай формы.

КАЛАМІНСКАЯ. Ігар Васільевіч, а калі правесці такі эксперымент: адзін і той жа тэкст дадзім пяці розным рэжысёрам. Баюся, атрымаем пяць амаль аднолькавых перадач. Тэкст «пацягне» на аднолькавае рэжысёрскае вырашэнне.

ЛАПЦІНСКІ. Упэўнены ў адваротным. Нараджэнне задумы — працэс глыбока суб'ектыўны, творчы, ён працякае ва ўсіх па-рознаму. У, адпаведнасці са сваёй мастакоўскай індывідуальнасцю рэжысёр адчувае характар будучай перадачы, атмасферу, эмацыянальнае зерне... Тады ўсё канкрэтызуецца ў вобразы. У нас, напрыклад, быў такі выпадак. Рэжысёр працаваў з выканаўцамі над увасабленнем нарыса пра нягоды вайны; выканаўцы наігрывалі нешта сентыментальна чуллівае. Рэжысёр кажа: «Разумееце, гэта было даўно, вастрыня гора прайшла ўжо. Цяпер нават пра самае жудаснае на вайне людзі расказваюць стрымана. Эмацыянальны напал павінен быць унутраным. Але пастарайцеся гэта вельмі ясна ўбачыць — гарыць збожжа, гарыць поле, чуюцца разрывы снарадаў, людзі здрацвелі. І раптам рывок — трэба дзейнічаць!..» Дакладна вызначаны рэжысёрам настрой добра адчулі выканаўцы перадач. Атрымалася!..

НЕСЦЯРОВІЧ. Дарэчы, працуючы з прадстаўнікамі розных прафесій, пераконваешся, што яны—інжынеры, юрысты, настаўнікі,— бывае, адкрываюць прынцыпова важную для сябе ісціну акурат пасля выступлення па радыё. Праслухаюць сябе «з эфіра» і здагадваюцца, што яны сказалі добра, што не зусім так . У нашай рабоце наогул выратоўвае спецыялізацыя. Працуеш над пэўнымі тэмамі і ўжо ведаеш, што трэба падказаць выканаўцу, як працаваць і з тымі, хто ўпершыню выступае перад мікрафонам.

СТАРАСЦЕНКА. Мае перадачы—гэта «Сельская раніца», «Вячэрнія зарніцы». Разлічаны яны ў асноўным на сельскага слухача, гучаць у ранішнія і познія вячэрнія гадзіны, калі калгаснікі, механізатары ўжо дома. Форма часопіса зададзена, але тэксты розныя, яны і дыктуюць мастацкае вырашэнне, вызначаюць эмацыянальнае гучанне матэрыялу. Мы запісваем выступленні перад мікрафонам аграномаў, механізатараў, калгаснікаў. Даводзіцца памагаць на запісу дакладна вымаўляць словы (асабліва рабіць націскі ў словах). Так што рэжысёр—гэта і служба мовы на радыё. У гэтых адносінах для нас пастаянныя і верныя кансультанты і памочнікі — нашы стылісты і дыктары.

БАГАЛЮБСКІ. Я ўспамінаю з задавальненнем тыя работы, калі мы добра рэпеціравалі, працавалі над тэкстамі прамысловых, дзіцячых і сельскіх перадач — даўно гэта было... А так карысна выканаўцу разам з рэжысёрам яшчэ да запісу выявіць галоўную лінію тэксту, вызначыць другарадныя моманты, сумесна адчуць эмацыянальную атмасферу. Тады перад мікрафонам выступаюць людзі, якія ведаюць, што яны хочуць сказаць і як гэта трэба рабіць. І мая задача не «націскаць» на выканаўцу, а пільна сачыць, ці ўсё правільна.

Было б намнога лягчэй працаваць, калі б мы атрымлівалі матэрыял разнастайны па форме, выдатна зроблены, чыста літаратурна, без штампаў. Хочацца, каб эфір быў размовай па шчырасці, а не сумным «сходам». Бывае так: у матэрыяле адчуваеш крыўдны штамп, а пераадолець яго сродкамі рэжысуры і выканаўцаў вельмі цяжка. Бывае, перадачы робяцца ў нас па прынцыпу «канвеера», лепш было б без мітусні рыхтаваць жывыя, непасрэдныя перадачы. Дыктар, як і акцёр-выканаўца, павінен ведаць загадзя, да запісу, пра што ён будзе гаварыць і для каго. Вось у міжнароднай палітычнай праграме «Планета-75» раней быў пастаянны вядучы — заслужаны артыст рэспублікі Мацвей Федароўскі. У гэтай перадачы ён—і палітычны каментатар, і расказчык, і наш, слухачоў, субяседнік. Пакрысе крышталізаваўся вобраз сучасніка, які востра і дакладна рэагуе на падзеі ўсёй планеты. Працаваць у гэтай праграме рэжысёру і акцёру было добра: назапашаны вопыт сумеснай работы ў адным і тым жа жанры, знойдзена ўзаемаразуменне... Мы не думаем, што ў «Планеце» ўсё было на вышыні. Увесь час ідзе пошук: як зрабіць перадачу яшчэ больш сур'ёзнай, больш разумнай, даверлівай і даступнай. Над гэтым працуюць і рэдактары перадачы (А. Гарэлік і А. Трызна). Мы вельмі цэнім узаемаразуменне. Але, на жаль, зараз вядучыя часопіса розныя. Думаю, перадача ад гэтага страціла шмат...

СТЭФАНОВІЧ. Я чалавек яшчэ мала «абстраляны» ў радыёрэжысуры. Але і для мяне ўжо відавочна, што кантакт з выканаўцамі неабходны. Больш таго, я вельмі востра адчуваю, калі партнёры-выканаўцы не захапіліся адной задачай, калі яны паміж сабой не ўстанавілі творчыя кантакты. Дарэчы, тады знікае і непасрэднасць выказвання перад мікрафонам. Няхай прафесіяналізм адчуваецца як норма вымаўлення слоў, як прыемны голас, але манера павінна быць індывідуальнай, як гэта бывае ў жыцці, непасрэднай...

АЛЯКСЕЕВА. Ну, я, здаецца, вопытны радыёрэжысёр, ды вельмі часта бываю незадаволеная не толькі выканаўцамі, але і сабой. Што мяне больш за ўсё хвалюе? Часта ў перадачах выканаўцы працэсам гаварэння падмяняюць працэс перажывання, працэс асэнсавання зместу, сутнасці матэрыялу. Мала ўмець падзяліць тэкст на лагічныя кавалкі, на лагічныя звенні і сумленна вычытваць гэтыя звенні і гэтыя кавалкі. Робіцца расплывістым нават адрас такіх перадач. Для каго яны? Калі адрас перадачы недакладны, ідзе нейкае абстрактнае і неакрэсленае гучанне. Хацелася б, каб выканаўцы больш дакладна адчувалі жанр: чытанне вершаў у кампазіцыі, напрыклад, і чытанне вершаў у нейкай агляднай перадачы, дзе вершы толькі ілюструюць пэўны тэзіс, пацвярджаюць думку, павінны адрозніваццa...

Карысна, відаць, і падказваць чытальніку, працаваць метадам «паказу з голасу». Ні ў тэатры, ні на радыё ніхто не адмяняў гэты прыём у рэжысуры. Іменна з голасу рэжысёра выканаўца можа «схапіць» тое, чаго чакаюць ад яго...

КАЛАМІНСКАЯ. Сапраўды, цяжка словам адразу трапна зрабіць заўвагу выканаўцам. Адсюль — паказ... Але хоць практыка «паказу з голасу», і традыцыйная, не заўсёды яна можа быць эфектыўнай. Нельга паўтараць інтанацыйна тое, што табе падказаў рэжысёр—вынік наўрад ці каго з нас задаволіць. Праўда, мы яшчэ не накапілі дастатковую і неабходную колькасць тэрмінаў, слоўных формул, якія адлюстроўвалі б усе адценні нашых узаемаадносін, але калі рэжысёр гаворыць: «Падмінай тэкст пад сябе», я ведаю, што трэба «гаварыць ад сябе, ад свайго «я»; калі рэжысёр гаворыць.

МАЛУМАВА. На жаль, адценні ў такіх рэпліках бываюць зусім неакрэсленымі, акцёр разумее нас хутчэй інтуітыўна. Што і як падказвае рэжысёр, калі ролю Зайчыхі таленавіта, з вялікім гумарам іграе Стэфанія Станюта? Можна толькі здагадвацца. Была ў Стэфаніі Міхайлаўны Станюты і выдатна выкананая ёю роля... Курыцы. Вельмі добра працуюць у дзіцячым радыётэатры Рыма Маленчанка, Рэгіна Дамброўская, Маргарыта Громава, Вера Кавалерава.

АЛЯКСЕЕВА. Наогул, вельмі многае з таго, што калісьці было намі зроблена, сёння б я ўжо ў эфір не давала. Сёння тое ж трэба рабіць зусім інакш. Манера мастацкай радыёразмовы са слухачом мяняецца. У нашай рабоце нельга адмаўляцца ад мінулага, ад нажытага вопыту, ды ісці трэба, думаецца, ў глыбіню, каб перадача, зробленая намі, трапляла не толькі ў вуха, але ў самае сэрца. Эмацыянальны зарад павінен захапляць слухача! Мне здаецца, што няма такога ўдзячнага і выдатнага «гледача» на свеце, як радыёслухач.

Можа, гэта некалькі сентыментальна, але толькі ад'едзешся ад дому, шчаслівы пачуць недзе там далёка наша радыё, нашы радыёгаласы...

МАЛУМАВА. Пад гэтымі словамі падпісаліся б многія і многія работнікі радыё. Ведаеце, пачынала я свой творчы шлях як актрыса тэатра імя Я. Купалы, але ўжо шмат гадоў працую рэжысёрам радыё і шчаслівая: гэта работа прыносіць супраўднае творчае задавальненне і акцёрам, і выканаўцам...

ГУРЫЧ. Не менш цікава даведацца пра ўражанні таго «гледача», які слухаў тваю пастаноўку. Помню, як хвалявалі мяне і маіх калег водгукі на нашу буйную творчую работу, героіка-рамантычную радыёэпапею, прысвечаную Вялікай Айчыннай вайне, — «Векапомныя дні» Міхася Лынькова (у 6 частках). У радыёп'есе «Векапомныя дні» больш як 20 масавых сцэн, і кожная з іх вы-

магала свайго вырашэння і па-акцёрску, і па гучанню. Трэба было стварыць цэласны драматычны твор, каб ён не толькі абуджаў пачуцці, але і даваў вобразнае ўяўленне аб сітуацыях, абставінах, месцы і часе падзей.

Як мы працуем над п'есай? Дакладна гэтак жа, як у тэатры, па тых жа законах творчасці. Спачатку рэпетыцыйны перыяд, «застольны», так сказаць. Толькі ўсё гэта карацей, больш дынамічна. Радуе, што акцёры тэатра, занятыя на радыё, ад ролі да ролі растуць, работа на радыё дапаўняе, пашырае іх творчы дыяпазон. Па-мойму, нават уплывае на іх работу на сцэне. На радыё яны могуць сыграць іншы раз і тыя ролі, якія ім процілаказаны ў тэатры па знешніх дадзеных. Скажам, у пастаноўцы «Крык у начы» народны артыст рэспублікі Расціслаў Янкоўскі раскрыўся ў зусім незнаёмай і незвычайнай для слухача-гледача якасці. Думаецца, што многаму навучылася на радыё заслужаная артыстка рэспублікі Марыя Захарэвіч.

Памагае ў рабоце па стварэнню каларыту п'есы, безумоўна, музыка. Так, да п'есы «Самы высокі паверх» паводле прозы А. Савіцкага музыку напісалі Ігар Лучанок і Яўген Грышман. Песні ў выкананні Віктара Вуячыча і Тамары Раеўскай арганічна ўвайшлі ў тканіну спектакля, у яго атмасферу. Творчая работа Ігара Лучанка была адным з кампанентаў агульнага пафасу «Векапомных дзён». Песня «Бацькоўскі парог», выкананая Віктарам Вуячычам, стала наогул папулярнай...

Пра што я мару? Можа, нам варта стварыць радыётэатр з радыёакцёраў. Гэта была б акцёрская трупа, якая дасканала разумела б спецыфіку радыё, максімальна ўлічвала гэтую спецыфіку, працавала прафесіянальна...

АЛЯКСЕЕВА. А мне здаецца, што радыётэатр патрабуе іменна тэатральнага акцёра з адпаведнымі здольнасцямі. Паглядзіце ў Маскве, на Усесаюзным радыё: толькі тры акцёры знайшлі сябе як радыёныканаўцы — гэта Літвінаў, Бакарова, Кансоўскі. Толькі гэтыя трое поўнасцю прысвяцілі сябе радыётэатру, хоць Кансоўскі яшчэ і кінаакцёр, і акцёр тэатра.

ГУРЫЧ. Вельмі пажадана наяўнасць спецыяльнай трупы радыёакцёраў. Не сакрэт жа, што час на радыё—адна з дзейных асоб у нашай рабоце, і не лічыцца з гэтым ніяк нельга. Чаму працаваць у залежнасці ад вольнага часу таго або іншага артыста?

Тое ж і з радыёдраматургіяй. Нашы пісьменнікі, драматургі вельмі рэдка пішуць спецыяльна для эфіра, для радыё. Гэта лічаныя работы — Аркадзя Пінчука «Такая служба», Уладзіміра Мехава «Гавайская легенда», Валянціна Лукшы «Інтэгралы на цэгле»... яшчэ 2—3 п'есы і — усё. Хацелася б напрасіць нашых беларускіх драматургаў, камедыёграфаў: пішыце п'есы спецыяльна для пастаноўкі на радыё! Аўдыторыя ў мільёны радыёслухачоў скажа вам вялікае дзякуй...

НЕСЦЯРОВІЧ. Добрым аргументам на карысць працы для радыётэатра можа быць высокая якасць нашых пастановак. Драматург павінен верыць, што яго п'есу сыграюць выдатныя артысты. «Акцёры, якія будуць расфарбоўваць усё, што хочаш, і гаварыць слова «пяшчотнасць» пяшчотна, а слова «бура» адпаведным чынам— гэта акцёры мінулага...» — так сфармуляваў сутнасць сучаснага напрамку ў майстэрстве акцёра выдатны педагог і рэжысёр, народны артыст СССР Барыс Бабачкін. Усё гэта яшчэ больш адносіцца да чытальнікаў і артыстаў на радыё, дзе слова — адзіная форма, адзіны змест думкі.

ЛЯШЭВІЧ. Можа, таму, што я прыйшоў на радыё як гукарэжысёр, гукаафарміцель, але пераважна «чую» матэрыял перадачы і выканаўцаў яшчэ да запісу. На жаль, не заўсёды ўдаецца ажыццявіць сваю задуму. Па-першае, абмежаваны час (пра гэта гавораць усе рэжысёры); па-другое, бывае, да мяне прыходзіць дыктар пасля запісу іншых перадач або пасля перадач у эфіры — ён стаміўся... Па-чалавечы: ці маю права я ад яго патрабаваць «другое дыханне». Ведаеце, я думаю, павінны быць не толькі творчыя стымулы. Вядома, усе мы жывём адзінай думкай — зрабіць цікавую перадачу. Але дзесяткі, сотні перадач застаюцца незаўважанымі, дзесяткі, сотні нашых знаходак нікім не абагульняюцца, нікім не адзначаюцца, а для творчых людзей гэта вельмі важна. Ды і ў друку рэцэнзуюцца толькі адзінкі з нашага рэпертуару. Той самы «канвеер», пра які гаварыў Багалюбскі, часта зніжае якасць нашай работы.

Для мяне ў асобе дыктара і акцёра важна перш за ўсё — што ён за чалавек. Так, так, іменна, што за чалавек — мой субяседнік ля мікрафона? З якога ён жыцця, з якім светапоглядам, з якім чалавечым багажом. Ён — добры? Клапатлівы? Чулы да сяброў? Не ўсміхайцеся, гэта вельмі важна! Артыст—асоба!

КАЛАМІНСКАЯ. Правільна! А мяне, як выканаўцу, наогул цікавіць асацыятыўнае мысленне рэжысёра, уменне праз літаратурны вобраз паказаць і падказаць выканаўцам верную трактоўку жыццёвай з'явы, матэрыялу, факта. Тут і музыка, на маю думку, патрэбна не ілюстрацыйная, а здольная абуджаць у нас усіх фантазію, асацыятыўныя ўяўленні...

АНДРЭЕВА. Вядома, музыку, асабліва песню, любяць і добра прымаюць мільёны радыёслухачоў. Розную па жанрах музыку — гэта важна. Мне пашанцавала: я працую з рэдактарскім калектывам, які глыбока і ўсебакова ведае музычную літаратуру, валодае музычнай культурай. Зразумела, цяжкасці ўзнікаюць. Вось хоць бы выпадак, калі запісвалася для радыё першая ў нашай практыцы беларуская аперэта Юрыя Семянякі «Пяе «Жаваранак». Як вядома, аперэта — жанр лёгкай музыкі. А тут аперэта на гераічную тэму, з драматычнымі, нават трагедыйнымі калізіямі. Вырашана было на ролю галоўнай гераіні Ірыны, якую ў тэатры выконвала заслужаная артыстка рэспублікі Наталля Гайда, запрасіць паралельна другую выканаўцу — народную артыстку рэспублікі Лілію Давідовіч (яна павінна была працаваць перад мікрафонам у размоўным жанры). Складана сур'ёзныя драматычныя кавалкі тэксту кампанаваць з аперэтачнымі арыямі — музыка «не хацела» манціравацца з тэкстам, бо не выцякала з яго. Працавалі доўга, пакутвалі шмат. І хоць работу нашу прынялі, і ў эфіры яна прагучала ўдала, да гэтага часу няма пачуцця поўнага задавальнення. А сцэнарый перарабілі спецыяльна для радыё (аўтар радыёварыянта — Інга Алфімава), і музычную тканіну давялося прыстасоўваць... Мабыць, такі вопыт не будзе марны...

ЛАПЦІНСКІ. Такім чынам, праблемы, нявырашаныя задачы, задумы, пакуты творчасці, удачы і—зноў пошук, пошук штодзённы, ад перадачы да перадачы, пошук калектыўны, нястомны. Такая наша служба!

## ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА

# НА ПОКЛІЧ СЭРЦА

К. Саннікава, Ц. Сяргейчыка і Р. Кашэльнікавай, Я. Глебаўскай і С. Станюты, Л. Шынко і А. Радзялоўскай...

МАРЫЯ Сяргееўна Бялінская — з ліку купалаўцаў. Па духу яе творчасці, па адданасці псіхалагічнай праўдзе паводзін і па мастацкай завершанасці пластычнага малюнка — па ўсіх прыкметах яе сцэнічнага стылю вы адразу адзначаеце гэта. А варта прамовіць — «Бялінская» ў асяроддзі знаўцаў беларускай сцэны, і адразу ж у адказ прагучыць імя-песня: «Афелія».

Чаму?

**Таму што «Гамлет» на віцебскай сцэне—спектакль, які стаў легендай. Аб ім пішуць і спрачаюцца, ім цікавяцца новыя пакаленні, пра яго просяць абавязкова расказаць мемуарыстаў. Тыя, каму пашчасціла бачыць прэм'еру гэтага шэкспіраўскага спектакля 1945 года, і дагэтуль помняць эмацыянальнае ўзрушэнне, якое панавала ў глядзельнай зале, калі з грудзей Гамлета—Малчанава вырываўся стогн, падобны да гімна: «Я любіў Афелію, любіў — і сорак тысяч братоў, з усім сваім каханнем братнім са мною не зраўняюцца...». Штосьці знікала канчаткова ў гэтым свеце для яго разам з Афеліяй. І калі ён пры жывой Афеліі яшчэ стрымліваў сваю руку, якая прагна шукала зброю для помсты каралю і яго памагатым, то цяпер, без Афеліі, ніштo не магло стрымаць яго рашучасць... І па ўсіх інтанацыях даверлівага голасу М. Бялінскай у ролі Афеліі, па яе непасрэднасці, якая часам мяжуе з дзіцячым інфантылізмам (а той мяжуе нават са злачынствам у адносінах да каханага Гамлета) верылася ў глыбіню пачуцця прынца Дашкага да гэтай дачкі прыдворнага чыноўніка. Яна была «не такая», як усе навокал, у Эльсіноры, і «не такая», як усе еўрапейскія нявесты прынца.**

Афелія адгукалася на кожны покліч лёсу сэрцам. Так іграла М. Бялінская. А вакол і побач з Гамлетам усе іншыя ўступалі з ім у дыялог па разліку, з хітрыкамі, са сваёй эгаістычнай логікай і рацыянальнымі прагнозамі на будучыню. І калі ў гэтым асяроддзі бяздушнага механічнага разліку з'яўлялася яна, ён цягнуўся да яе збалелай і закатаванай душой: «Афелія? — О, німфа, памяні мае грахі ў тваіх малітвах...». Бо яе малітвы—ад сэрца.

Натура Афеліі, якой яе іграла М. Бялінская, адцяняла філасофскі змест пакут і шуканняў Гамлета, бо і лёс гэтай дзяўчыны гучаў песняй, абарванай злым механізмам барацьбы за трон, за ўладу. І яна ж, гэтая Афелія, даўшы бацьку згоду шпіёніць за Гамлетам, сама гасне назаўсёды яшчэ да таго, як яе паглынуць хвалі ракі... Гамлет губляе Афелію двойчы, і двойчы ён пераконваецца, што на яе палююць кароль і яго памагатыя, што і яна — ахвяра. Таму ўзнімаючы шпагу на Клаўдзія, ён помсціць і за гэтую цнатлівую душу.

Цікава, што амаль адначасова з «Гамлетам» коласаўцы іграли гогалеўскага «Рэвізора», дзе Гамлет пераўтвараўся... ў Бобчынскага, Афелія ж — у... Марыю Антонаўну Сквазнік-Дмуханоўскую. Тую самую, што і верыць у раптоўнае каханне да яе Івана Аляксандравіча Хлестакова, і не верыць, бо сталічныя насмешнікі толькі тое і робяць, што смяюцца з правінцыяльных... І тут, у гэтай ролі не такой ужо і дурнаватай, як гэта здаецца ўсім («Ах, мамачка, там напісана, што гэта пана Загоскіна твор»,—папраўляе яна маці, калі тая паведамляе аб сваім знаёмстве з «Юрыем Міласлаўскім», напісаным Хлестаковым і выдадзеным ім нібы пад псеўданімам), актрыса разумела сэрца гераіні. Ёй хочацца стаць жонкай сталічнага франта. Таму ў яе «прыстасаваннях» былі ўсе адценні пачуццяў—ад замілавання, ад шаленства і да высакароднага абурэння («Гэта ўжо занадта!..»—пацалунак Хлестакова ў яе плячо). І так смела пераходзіла актрыса ад аднаго стану ў іншы, што думалася: а такая Марыя Антонаўна не разгубілася б у Піцеры, яна, бадай, памагла б свайму Івану Аляксандравічу рабіць афёры. Нечакана? Што ж, і А. Ільінскі разам з тым жа П. Малчанавым былі па-творчы самабытнымі ў ролях Хлестакова і Бобчынскага ў спектаклі, пастаўленым у 1945 годзе рэжысёрам Н. Лойтарам.

Тлумачылася такая смеласць у трактоўках класічных роляў той школай, якую прайшлі заснавальнікі Другога БДТ (цяпер—тэатр імя Якуба Коласа): яны вучыліся ў мхатаўцаў акурат у той перыяд, калі пад уплывам рэвалюцыйных змен у грамадстве дзеячы мастацтва шукалі новага сацыяльна-творчага напаўнення вядомых вобразаў мінулага. Дастаткова сказаць, што Беларуская тэатральная студыя набывала характар самастойнага тэатра ў Маскве тады, калі К. Станіслаўскі здзіўляў усіх наватарскім «прачытаннем» ролі генерала Крупіцкага ў камедыі «На кожнага мудраца хапае прастаты», у спектаклі, які так абрадаваў У. І. Леніна!

Малады імпэт і творчы неспакой былі выхаваны ў М. Бялінскай і яе аднакашнікаў па студыі і сталі рысай мастакоўскага аблічча П. Малчанава і А. Ільінскага, М. Міцкевіча і К. Саннікава, Ц. Сяргейчыка і Р. Кашэльнікавай, Я. Глебаўскай і С. Станюты, Л. Шынко і А. Радзялоўскай...

Пэўным пераломам у творчасці М. Бялінскай была роля Марыі Аляксандраўны Ульянавай («Сям'я» І. Папова). Ад маладых гераінь яна пераходзіць на ролі характарныя.

І адразу ж дэманструе багацце псіхалагічнага арсенала, шчодрасць сваёй акцёрскай палітры ў раскрыцці натур, якія больш грунтоўна трымаюцца на зямлі, зведалі гора і здатныя мудра ўзважыць свае крокі і крокі сваіх блізкіх у барацьбе за «месца пад сонцам». Вядома, кожная з жанчын, чый вобраз ствараецца М. Бялінскай на купалаўскай сцэне, па-свойму разумее «месца пад сонцам», і гэта надзвычай тонка даследуецца актрысай. Глушачыха («Людзі на балоце») зусім не падобная на Зінаку («У мяцеліцу»), а Раіса Фёдараўна («Дзесяць сутак за каханне») не мае нічога агульнага з Настассяй Пятроўнай Бялугінай («Жаніцьба Бялугіна»).

**...Чаму важна падкрэсліць менавіта гэта—«не маюць», замест таго, каб сказаць аб тым, што кожны з гэтых персанажаў «мае»? Ёсць прычына. Звычайна, актрысы такога амплуа іграюць ролі маці або бабулі. Чулых да патрэб сваіх дзяцей, іх абаронцаў перад гневам бацькі або іншых яніх суперникаў. І тут ёсць рэальная пагроза паўтарацца. Варта пабываць на спектаклях з удзелам М. Бялінскай, і вы пераканаецеся: ў адваротным: кожны яе сцэнічны характар—адметны тып чалавечага «я». Тэмпераментныя і інтанацыйныя фарбы расвечваюць натуру непаўторную, нібы «выхапленую» артысткай з вялікага натоўпу прататыпаў, які яна назірала і назірае ў рэальным жыцці. І кожнай дадзена свая мастацкая праўда, у кожнай спалучаюцца нюансы і штрыхі, якія складаюць аблічча менавіта вось гэтай жанчыны.**

Таму М. Бялінскай верыш у кожным яе кроку на сцэне. Яе вочы, бывае, гавораць не менш выразна, чым слова; яна ўмее захапіць залу шчырым смехам сваіх гераінь і скалануць стрыманай слязой; яна спявае славу матчынаму пачуццю і выкрывае заганы злачыннай душы. Яна разнастайная ў сваёй перакананасці. Сталы мастак, майстра высокага прафесіянальнага ўзроўню.

**В. ІВІН.**

# ПРЫЕХАЛІ АРТЫСТЫ Ў ГАРНІЗОН

З вялікім поспехам гастралірує ў Беларусі Севастопальскі рускі драматычны тэатр імя А. В. Луначарскага. Днямі тэатр вынзджаў у адзін з авіяцыйных гарнізонаў. Артыстаў сустрэлі прадстаўнікі камандавання, воіны-выдатнікі паднеслі кветкі, памятныя сувеніры.

Госці пазнаёміліся з ваенным гарадком, пабывалі ў пакоі баявой славы, паслухалі расказ афіцэра-прапагандыста аб баявым шляху праслаўленай гвардзейскай ардэнаноснай часці.

Вечарам у перапоўненай зале Дома афіцэраў адбылася сустрэча артыстаў з воінамі. Галоўны рэжысёр тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў УССР У. Яснагародскі сказаў:

— З першых дзён свайго існавання наш тэатр паставіў перад сабой мэту: быць верным традыцыям горада-бастыёна рускай марской славы на Чорным моры, прапагандаваць гісторыка-рэвалюцыйнае мінулае Радзімы, гераізм савецкага народа ў гады ваенных выпрабаванняў. Мы рады, — працягваў рэжысёр, — што паказваем свае спектаклі на зямлі гераічнай Беларусі, што сустракаемся з нашчадкамі баявых традыцый франтавікоў.

Затым адбылося вялікае шэфскае прадстаўленне, у якім разам з артыстамі тэатра з горада-героя Севастопаля прынялі ўдзел гасцюючыя ў Беларусі майстры сцэны іншых гарадоў Савецкай Украіны.

Воіны горача дзякавалі артыстам за гэтую сустрэчу, за вечар дружбы, за цікавыя і змястоўныя выступленні. Начальнік гарнізона ўзнагародзіў калектыў Севастопальскага рускага драматычнага тэатра Ганаровай граматай.

**Я. МАЛЫ.**

**НА ЗДЫМКУ (злева направа): заслужаны дзеяч мастацтваў УССР У. ЯСНАГАРОДСКІ, артыстка В. ЗАЙЦАВА, народны артыст СССР Л. ТАРАБАРЫНАЎ, заслужаная артыстка УССР В. ЗАКЛУННАЯ, народны артыст СССР А. СЯРДЗЮК сярод воінаў.**

Фота Я. МІЦЕЛІЦЫ.

# ГАЛОЎНАЕ — ДОБРЫ ХАРЭОГРАФ

## ДУМКІ ПАСЛЯ АГЛЯДУ

У СЕСАЮЗНЫ фестываль самадзейнай мастацкай творчасці працоўных выходзіць на фінішную прамую: восенню ў рэспубліцы пачынаецца трэці, заключны тур гэтага святочнага спаборніцтва, агляд нераможцаў конкурсаў у абласцях. Артысты-аматары і кіраўнікі калектываў у апошні час правяраюць сваю баявую гатоўнасць, ліквідуюць недахопы, прыкідваюць сілы супернікаў. Работнікі ж дамоў мастацкай самадзейнасці і народнай творчасці, члены журы аналізуюць зробленае на першых двух этапах, дэталізуюць умовы, удакладняюць крытэрыі ацэнкі. Матэрыял для роздуму і практычнай дзейнасці ёсць ва ўсіх, бо ўжо дастаткова выразна выявіліся характэрныя асаблівасці сёлетняй работы ўдзельнікаў самадзейнасці, яе асноўныя вартасці і праліки.

Ёсць над чым падумаць шматлікаму атраду беларускіх харэографаў. Пра гэта гаворыць хоць бы агляд танцавальных калектываў сталіцы, які прайшоў параўнальна вядаўна. Узровень самадзейнага танцавальнага мастацтва ў Мінску ўвогуле адлюстровае яго становішча і асноўныя параметры ў рэспубліцы (выключэнне складаюць толькі сельскія танцоры-аматары, у якіх свае спецыфічныя праблемы і клопаты), таму лепшым народным ансамблям сталіцы гастойную канкурэнцыю складаюць вядомыя калектывы Віцебска, Брэста, Магілёва, Гродна, Гомеля і іншых гарадоў рэспублікі, таму размова аб харэаграфічнай творчасці мінскіх ансамбляў можа аказацца карыснай для ўсіх, хто мае адносіны да самадзейнага танцавальнага мастацтва.

Што ж перш за ўсё звярнула на сябе ўвагу на гарадскім аглядзе, якія рысы характэрныя сёння для творчага аблічча харэаграфічнай самадзейнасці?

Можна шмат гаварыць аб надзвычай высокім узроўні выканаўчага мастацтва артыстаў-аматараў. І час, здаецца, толькі дадае лісця ў лаўровы вянок беларускіх калектываў: за апошнія гады многія з народных ансамбляў танца дэманстравалі сваё майстэрства за рубяжом — ім горача апладзіравалі гледачы Балгарыі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Францыі, Партугаліі, ФРГ і многіх іншых краін свету.

Лепшыя з мінскіх самадзейных калектываў зноў парадавалі гледачоў сваім выдатным мастацтвам. І ў гэтым плане хочацца адзначыць перш за ўсё тэхнічнасць, чысціню і выразнасць танца ансамбля «Крыжачок» Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, буйны тэмперамент танцораў Мінскага трактарнага завода, высокую культуру і сучаснасць манеры ансамбля «Вясёлка» Палаца культуры Белсаўпрофа, стараннасць і творчы энтузіязм артыстак калектыву «Зорка» Палаца культуры тэкстыльшчыкаў, узросшы ўзровень выканання ансамбляў танца «Крыніцы» Мінскага аўтамабільнага завода і «Купалінка» Дома культуры ўпраўлення бытавога абслугоўвання. Некалькі слабей выглядаў народны ансамбль танца «Дружба» Беларускага політэхнічнага інстытута. Яго ўдзельнікам яўна не хапала свабоды валодання выразнымі сродкамі, якая прыходзіць толькі ў выніку доўгай практыкі і сістэматычных трэніровак. (У параўнанні з папярэднімі аглядамі ў большасці калектываў палепшылася якасць музычнага суправаджэння, з большым густам пачалі афармляцца касцюмы і дэкарацыі).

Але пры ўсёй важнасці гэтых складаемых харэаграфічнага мастацтва мне хацелася б сёння гаварыць не аб узроўні выканаўчага майстэрства, музычнага суправаджэння і мастацкага афармлення. Больш востра, на мой погляд, стаіць цяпер пытанне аб якасці кіраўніцтва самадзейнымі калектывамі — аб узроўні работы балетмайстраў. Менавіта ад іх залежаць, у асноўным, усе памянёныя кампаненты, а таксама рэпертуар, накіраванасць творчых пошукаў, мастацкая каштоўнасць пастановак. І тут да харэаграфічнага кіраўніцтва беларускай самадзейнасці можна прад'явіць нямала прэтэнзій.

Найперш — за акрэслеваю інертнасць мыслення.

Адной з асноўных задач сёлетняга Усесаюзнага фестывалю мастацкай творчасці працоўных з'яўляецца стварэнне новых твораў, якія адлюстроўваюць сучаснае жыццё і гераічнае мінулае нашай краіны, расказваюць аб рэвалюцыйных і працоўных здзяйсненнях савецкага народа. Такіх пастановак на гарадскім аглядзе было паказана, прама скажам, нямнога. Некалькімі творамі адгукнуліся на гэтае патрабаванне часу толькі асобныя калектывы і найбольш маштабна — народны ансамбль танца «Лявоніха» пад кіраўніцтвам М Чысцякова, які паказаў харэаграфічныя кампазіцыі «Герої Брэсцкай крэпасці», «Свята ўраджаю», «Слава працы», «Дружба народаў». Высокага патрыятычнага гучання дасягнула таксама пастаноўка «Подзвігу народа жыць у вяках», створаная ў народным ансамблі «Вясёлка» балетмайстрам В. Ямінскім і прысвечаная мужнасці воінаў Савецкай Арміі. Цікава задуманай аказалася і літаратурна - харэаграфічная кампазіцыя Ю. Варанцова «Час, наперад!» у ансамблі «Зорка», дзе ў паэтычна-абагульненай форме было паказана мінулае і будучае працы беларускіх тэкстыльшчыц.

Большасць на кіраўнікоў самадзейных калектываў палічылі за лепшае ісці пракладзеным шляхам і паказалі праграму з традыцыйных народных танцаў! Хоць яркія, цудоўна выкананыя нумары паказаў, да прыкладу, народны ансамбль танца «Крыжачок» пад кіраўніцтвам М. Лашны, адсутнасць пастановак на рэвалюцыйную, сучасную тэматыку, непрадуманая кампаноўка праграмы значна знізілі агульную ацэнку калектыву і прывялі да таго, што універсітэцкія танцоры занялі ніжэйшае месца, чым ансамблі больш слабыя ў выканаўчых адносінах.

Крытэрый «работа балетмайстра» ўключаны цяпер разам з іншымі важнейшымі характарыстыкамі ў ацэначны ліст, які запаўняецца на кожны калектыў членамі журы.

Вялікую ролю адыгрывае ўменне кіраўніка калектыву выкарыстаць, напрыклад, багацці нацыянальнага фальклору. На жаль, менавіта тут немалыя прэтэнзіі можна прад'явіць да нашых балетмайстраў. Калектыўная харэаграфічная думка часта застаецца на месцы і не выходзіць за рамкі звыклых, стандартных уяўленняў. Ужо не адзін раз крытыкай і самімі харэографамі адзначалася, што беларуская харэаграфічная народная творчасць распрацоўваецца марудна, што на сцэне з'яўляюцца ўвесь час адны і тыя ж назвы, што танцы паступова ўсё больш губляюць свае лакальныя асаблівасці, каларытныя дэталі, робяцца падобнымі адзін на адзін, як вырабы паточнай вытворчасці. Але сіла бяздумнага пераймання, прывычка да стэрэатыпу такая, што часам пачынае здавацца, нібыта ўсе парады і рэкамендацыі марныя.

Паводле падлікаў, зробленых падчас, дамінуючае месца ў нацыянальным рэпертуары калектываў займаюць розныя варыянты полькі. Затым ідуць «Лявоніха», «Бульба», «Крыжачок», «Юрачка», кадрылі і... больш нічога. У той жа час многія беларускія народныя танцы ніколі не бачылі сцэны (успомнім хоць бы «Жабку», «Суботу», «Мяцёлачку», «Даўжка», «Вераб'я», «Зязюлю», «Качана», «Закаблуку», «Магеру», «Шастак» і г. д.). Паўтор адных і тых жа назваў, адных і тых жа прыёмаў і нават цэлых пастановак вядзе да абяднення беларускага танца, да стандартызацыі прыёмаў і сродкаў.

Незалежна ад назвы танца, балетмайстры вельмі часта ў фінале яго выкарыстоўваюць элементы ператанцоўвання, трукавыя рухі, хаця яны да месца далёка не ўсюды і не заўсёды. Многія з харэографаў не валодаюць драматургічнай формай, — пачаўшы танец, яны не ўмеюць яго прадоўжыць, не ведаюць, як закончыць. Здзіўляе, што, адчуваючы абмежаванасць выразных сродкаў, балетмайстры шукаюць выйсце не ў звароце да фальклору, не ў вывучэнні яго, а ў капіраванні чужых пастановак, альбо, што не лепш, у высмоктванні нечага з уласнага пальца. На сёлетнім гарадскім аглядзе, скажам, некалькі танцавальных калектываў паказалі нумар «Гусары». Ведаючы, што ў беларускай харэаграфічнай народнай творчасці існуе танец з такой назвай, можна было чакаць, што балетмайстры пакажуць яго сучасную інтэрпрэтацыю. Пастаноўкі ж гэтыя аказаліся злепкамі з мюзік-хольных танцаў стылізаваных гусар-дзяўчат часоў вайны з Напалеонам. Адкуль, а галоўнае — навошта з'яўляюцца гэтыя эстрадныя падзелкі ў рэпертуары ансамбляў народнага танца?

А на аснове ж фальклорных «Гусарыкаў», паказаных у свой час этнаграфічным калектывам з вёскі Харошкі Магілёўскага раёна, балетмайстры М. Дутчанка і В. Гаявая змаглі паставіць нядрэнны нумар. Але, і яны нешта ў апошні час спыніліся ў сваіх пошуках, згубілі колішнюю «фальклорную хвалю», якая прынесла ім поспех.

Не заснаваная на сапраўдным фальклоры фантазія балетмайстраў, часта становіцца нежыццёвай, абстрактнай. На сцэне мы рэдка бачым, напрыклад, сапраўдныя карагоды, на якія так багата творчасць беларусаў. Але затое пачкамі ставяцца «селезні» па рэцэптах Краснаярскага ансамбля, выдумляюцца і ставяцца розныя «Дубочкі», «Васілёчкі», «Яблынькі», «Кветачкі» і г. д. На фоне безаблічнай гэтай «масавай вытворчасці» натуральна выглядаюцца танцы, у якіх знойдзена хоць нешта сваё, арыгінальнае. Напрыклад, Кадрыльная і Табольская полькі ў пастаноўцы М. Харламава, «Сельскі Дон Жуан» Ю. Варанцова, «Вязанка» і «Бараўская кадрыля» Л. Тушынскага. Гэтыя дзве апошнія работы хочацца пахваліць асабліва, між іншым, як і ўсю ўдумлівую, культурную работу Л. Тушынскага ў танцавальным калектыве маторнага завода.

Многія праліки сёлетняга агляду, ды і ўсяго самадзейнага танцавальнага мастацтва рэспублікі, звязаны, мне здаецца, перш за ўсё з недастатковай кваліфікацыяй кіраўнікоў аматарскіх калектываў. У нас сёння харэографаў, якія працуюць у галіне народнага танца і якія маюць вышэйшую адукацыю, можна пералічыць па пальцах. Са спецыяльнай вышэйшай адукацыяй — і таго менш. А менавіта ж культура і веды з'яўляюцца важнейшымі спадарожнікамі таленту. Менавіта іх узровень і аб'ём у многім вызначаюць і адносіны да фальклору, і ўменне яго творча пераасэнсоўваць, і пачуццё сучаснасці.

Даўно наспела ў нас неабходнасць рыхтаваць уласныя кадры харэографаў, «вышэйшае танцавальнае кіраўніцтва» самадзейнасці. Цяпер быццам бы, нарэшце, з'явілася і магчымасць для гэтага: у Мінску адкрыўся інстытут культуры. Але адкрыццё ў ім харэаграфічнага аддзялення чамусьці затрымліваецца, хаця тут дарагі не толькі кожны год, але і кожны месяц. Арганізацыя ў інстытуце культуры кафедры харэаграфіі садзейнічала б таксама канцэнтрацыі ў адзіным месцы ўсіх разрозненых пакуль намаганняў беларускіх харэографаў, распрацоўцы агульнай методыкі, правядзенню навуковых даследаванняў. Тэарэтычныя пытанні народнай харэаграфіі ўсё яшчэ з'яўляюцца слабым звяном у нашым мастацтвазнаўстве. Недастатковая ўвага да іх тэарэтыкаў і практыкаў тармозіць развіццё самадзейнай танцавальнай творчасці.

**Юлія ЧУРКО,**
доктар мастацтвазнаўства.

У Крычаўскім раённым Доме культуры створаны самадзейны танцавальны калектыў «Лявоніха». У ім удзельнічаюць працоўныя горада і раёна, вучні старэйшых класаў. «Лявоніха» неаднаразова выступала з канцэртамі перад рабочымі прадпрыемстваў і хлебаробамі раёна. І заўсёды ансамблю спадарожнічае поспех.

На здымку: салістка ансамбля «Лявоніха» інжынер мясакамбіната Валянціна Грыневіч (у цэнтры) са сваімі сяброўкамі.

Фота В. БЫСАВА.

Той, хто бачыць выступленні ансамбля «Палессе», заўсёды зачароўваецца тэмпераментнымі харэаграфічнымі пастаноўкамі, своеасаблівымі танцавальнымі нумарамі. А з якім захапленнем выконваюць артысты з Пінска шматлікія танцы народаў нашай краіны! І гэты святочны настрой абавязкова перадаецца гледачам.

На здымках: танцуе «Палессе».

Фота Ф. РЫЧАГОВА.

# ЗАХАПЛЕННЕ

...І на гэты раз канцэрт удзельнікаў мастацкай самадзейнасці Светлагорскага Палаца культуры хімікаў закончыўся выступленнем дзіцячага танцавальнага калектыву. «Тапатушкі» — так называўся танец. Ён настолькі спадабаўся гледачам, што, здавалася, шчырым апладысментам не будзе канца.

А пакуль дзеці ў рознакаляровым танцавальным адзенні выбягалі, каб падзякаваць за цёплы прыём, побач з баяністам, які акампаніраваў танцорам, стаяла чарнявая рухавая жанчына. Яна толькі што з палёгкай уздыхнула — танец скончыўся. А яшчэ хвіліну назад жанчына з напружаннем сачыла за кожным сваім выхаванцам, непрыкметна для гледача падказвала чарговыя рухі.

Цяпер яна была задаволена і дзецьмі, з якімі так настойліва працавала, і сваім памочнікам— баяністам Уладзімірам Блізняцом.

Дзіцячым танцавальным калектывам кіруе Антаніна Фларыянаўна Сазонава, былая салістка танцавальнай групы ансамбля «Шахцёр».

Калі выйшла ў фае, яе абкружылі людзі, пачалі віншаваць з поспехам...

А пачыналася ўсё так.

...Светлагорск Антаніне Фларыянаўне спадабаўся адразу. Асабліва Палац хімікаў, дзе ёй давядзецца працаваць. Пайшла ў школы, да дзяцей. Расказала ім аб прыгажосці танца. А потым сама здзівілася: на першыя заняткі прыйшло больш чым шэсцьдзесят хлопчыкаў і дзяўчынак. (Заўважым, сёння народным танцам ў Сазонавай навучаецца 75 дзяцей).

Было гэта ў верасні 1973 года. А ў сакавіку 1974—у дзень святкавання Міжнароднага жаночага дня, як бы ў падарунак сваім маці і старшым сёстрам, дзіцячы танцавальны калектыў выканаў «Танец кветак» і беларускую «Бульбу». Гэта было цудоўна! Для многіх нечакана.

— Як вы маглі так хутка ўсё зрабіць? — пыталіся ў Антаніны Фларыянаўны.

— Праца, праца і праца, — сціпла адказвала кіраўнік.

Што датычыцца працы, то многія могуць пазайздросціць Сазонавай у яе стараннi. У рабоце яна не лічыцца з часам. Трэба, значыць будуць дадатковыя заняткі з тымі, хто не засвоіў таго ці іншага элемента ў танцы. Хапае ў кіраўніка і настойлівасці. Гадзінамі можа працаваць, а свайго даб'ецца.

І яшчэ адна асаблівасць у рабоце Сазонавай...

Людзі, якім пашчасціла быць на занятках у Антаніны Фларыянаўны, звычайна кажуць: «Ну і строгая яна, патрабавальная!»

І гэта праўда. Але, чаму ж не бягуць ад яе дзеці, а, наадварот, — адбою няма: прыміце танцаваць, ды прыміце. Таму не бягуць, што Антаніна Фларыянаўна ўсім сэрцам любіць іх, ведае, як падысці да кожнага. Бадай, усе яны, дзеці, адчулі пяшчотнасць сваёй настаўніцы. Хлапчукі і дзяўчынкі бачаць, як стараецца для іх яна. Іншы раз пры стварэнні новага танца Сазонава некалькі варыянтаў прапануе юным танцорам.

— Дзеці, як лепш? — спытае ў іх.

І калі большасць назаве той варыянт, які найбольш спадабаўся, ён і застанецца.

Хутка пачнуцца заняткі. А пакуль Антаніна Фларыянаўна дзеліцца сваімі планамі.

— Думаю зрабіць «вянок» беларускіх танцаў. Ды і літоўскі на прыкмеце. І яшчэ мара— «Мяцеліцу» паставіць, ды такую, каб аж дух займала...

— Як жа вы спраўляецеся адна з такой колькасцю дзяцей?— міжволі здзіўляюся я.

Антаніна Фларыянаўна хітравата ўсміхаецца.

— Цяжка, вядома. Але ж не хочацца аддаваць сваіх дзетак у іншыя рукі, прывыкла і палюбіла я іх. У кожнага чалавека свой педагагічны падыход...

Мы крыху памаўчалі, і я падумаў, як добра было б, калі б танцы дзіцячага калектыву суправаджаў не адзін баян, а, скажам, невялікі аркестр. Ці ёсць у Палаца культуры такая магчымасць? Бясспрэчна, ёсць. І, напэўна, варта было б падумаць аб гэтым.

**Я. КАРНЕЕЎ,**
настаўнік.

г. Светлагорск.

# АНСАМБЛЬ МЕДРАБОТНІКАЎ

Больш як 10 гадоў пры Светлагорскай райбальніцы існуе калектыў мастацкай самадзейнасці. Ён карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод працоўных Светлагоршчыны. Медработнікі выступалі ў Доме культуры энергетыкаў Васілевіцкай ДРЭС, на сцэнах Порыцкага і іншых дамоў культуры. Канцэрты артыстаў-аматараў прагледзелі хлебаробы амаль усіх калгасаў і саўгасаў раёна.

Калектыў мастацкай самадзейнасці Светлагорскай райбальніцы не раз выходзіў пераможцам у конкурсных аглядах. У мінулым годзе за паспяховае выступленне на раённым аглядзе ён быў заахвочаны раённым аддзелам культуры паездкай на мемарыяльны комплекс «Хатынь».

Актыўны ўдзел у рабоце ансамбля прымае рэнтгенолаг бальніцы Мікалай Бірукоў, старшыня раённага камітэта Таварыства Чырвонага крыжа Людміла Зенчанка, старшая медсястра хірургічнага аддзялення Валянціна Сакоўнікава, медсястра лораддзялення Ніна Чарнякова, медсёстры Галіна Сышчанка, Марыя Акулёнак, Лідзія Дзевісенка і іншыя.

**І. СТЭЛЬМАХ.**

# ЮБІЛЕЙ ШКОЛЫ

Дзіцячай музычнай школе № 5 горада Мінска споўнілася 20 год. За гэты час да цудоўнага свету музыкі педагогі школы далучылі звыш 700 чалавек, якія атрымалі пачатковую музычную адукацыю. Многія з выпускнікоў скончылі сярэднія і вышэйшыя музычныя навучальныя ўстановы, сталі вядомымі прафесіянальнымі артыстамі, музыказнаўцамі, культасветработнікамі, выкладчыкамі.

Шмат робяць педагогі школы для прапаганды музыкі сярод насельніцтва, выступаючы на прадпрыемствах, ва ўстановах горада з лекцыямі і канцэртамі. Пры школе створаны харавыя калектывы навучэнцаў малодшых і старэйшых клясаў, хор хлопчыкаў, аркестры народных інструментаў, баяністаў і акардэаністаў, ансамблі скрыпачоў, цымбалістаў, гітарыстаў. Вялікую выхаваўчую і арганізатарскую работу праводзяць іх кіраўнікі—С. Дайнека, Л. Фітэрштэйн, А. Польчыкаў, Н. Савіна, І. Зіневіч, В. Скірда. Другі год працуе універсітэт культуры для бацькоў, дзе яны слухаюць лекцыі аб мастацтве, музычныя творы ў выкананні вучняў.

Нядаўна ў Палацы культуры Мінскага камвольнага камбіната адбыўся справаздачны канцэрт навучэнцаў школы, прысвечаны яе дваццацігоддзю. Гледачы цёпла і сардэчна прымалі кожны нумар юбілейнай праграмы.

**Л. СЯНЮТА,**
музыказнаўца.

# АЎТАЗАВОДСКІЯ ТРУБАЧЫ

Сапраўдным прапагандыстам і папулярызатарам духавой музыкі ў горадзе Жодзіна стаў самадзейны духавы аркестр Палаца культуры Беларускага аўтамабільнага завода, якому прысвоена званне «народны». Самадзейныя аркестранты прымаюць удзел у святочных маршах-парадах, мітынгах, народных гуляннях, святах песні і працы, провадах моладзі ў рады Савецкай Арміі, у тэматычных вечарах-сустрэчах з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Нязменнымі ўдзельнікамі аркестра з'яўляюцца свідравальшчык С. Ярахавец, электразварщык М Казырэнка, слесар І. Клімовіч, токар А. Урублеўскі. Многія выхаванцы калектыву сталі прафесіянальнымі музыкантамі. Сярод іх—педагогі Маладзечанскай і Крупскай музычных школ К. Качанкоў і Я. Барэйка і іншыя.

У калектыве аркестра вядзецца пастаянная выхаваўчая і вучэбная работа, накіраваная на павышэнне выканаўчага майстэрства і культурнага ўзроўню яго ўдзельнікаў. Гэта і дапамагае калектыву выконваць складаныя музычныя творы.

Жодзінскія аркестранты былі ўдзельнікамі і лаўрэатамі ўсесаюзных, рэспубліканскіх і абласных аглядаў-конкурсаў і фестываляў.

Вялікая заслуга калектыву духавога аркестра і яго вядомага кіраўніка Эдуарда Пятровіча Сінькевіча ў тым, што на працягу трох год Палац культуры жодзінскіх аўтазаводцаў заваёўвае пераходны Чырвоны сцяг Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных і абласнога Савета прафсаюзаў за поспехі ў культурна-масавай рабоце на вёсцы.

**А. РАДЗІВІЛАЎ,**
рэдактар Рэспубліканскага Дома мастацкай самадзейнасці Белсаўпрофа.

# ІГРАЮЦЬ БАЯНЫ

Ужо некалькі гадоў радуе слухачоў аркестр баяністаў Маладзечанскага музычнага вучылішча. Народная, класічная, сучасная музыка — усё падуладна баяну. Трагічны бетховенскі «Эгмант», гарэзлівыя «Мушкецёры» Глебава, чароўныя ніяркі Хачатурана—ды хіба пералічыць усё тое, што ажыло пад пальцамі баяністаў. У аркестры ў асноўным навучэнцы народнага аддзялення вучылішча. Для іх гэта і ўдасканаленне прафесіянальнага майстэрства, і далучэнне да галоўнай справы свайго жыцця—несці мастацтва людзям.

Удзельнікі калектыву штогод мяняюцца—заканчваюць вучылішча, раз'язджаюцца па накіраванню. Але спадзяецца дырыжор аркестра загадчык аддзялення народных інструментаў Рыгор Сарока, што ўзнікнуць у яго вучняў свае калектывы, дзе б яны не былі. Дарэчы, сам Р. Сарока скончыў гэтае ж вучылішча, потым Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А. В. Луначарскага і вось стаў за дырыжорскі пульт у той жа зале, дзе калісьці пачынаў свае першыя крокі.

Аркестр баяністаў вучылішча вядомы не толькі слухачам Маладзечна, ён усё часцей і часцей становіцца жаданым госцем у іншых раёнах Міншчыны. Разам з аркестрам выступае вакальны квартэт выкладчык вучылішча. Іх галасы гучалі ўжо ва многіх гарадах рэспублікі, за яе межамі.

Іграюць баяны. Рэпеціруюцца новыя творы. Наперадзе новыя сустрэчы з удзячным слухачом.

**М. БАСКІН.**

*З ПОШТЫ «ЛіМа»*

# КНІГА З... НАГРУЗКАЙ

Самая вялікая радасць для кнігалюба — набыць кнігу, якую даўно шукаеш. Нарэшце, мне пашчасціла. 2-га ліпеня, праходзячы ля кіёска, што побач з інстытутам фізічнай культуры, заўважыў у вітрыне аповесць Э. Хемінгуэя «Стары і мора».

Спыніўся. Папрасіў паказаць мне гэтае выданне. Пагартаў старонкі. Паліграфічнага браку не было. «Бяру!» — сказаў я, а кіяскёр загадкава ўсміхнулася, нетаропка ўзяла з другога стосіка брашурку ды сказала: «З вас 50 капеек». Я не здзівіўся гэтаму «вынаходніцтву», продажу з... нагрузкай.

Абурыла мяне іншае. Абурыла тое, што даецца ў нагрузку. Гэта было выданне пра нашага знакамітага земляка касманаўта Пятра Клімука. Я не заўважыў гэтай брашуры. Калі б мне кіяскёр прапанавала набыць яе, я, безумоўна, ахвотна ўзяў бы брашуру.

**Віктар ПУЖЭВІЧ.**

# ШТУКАРСТВЫ ПАШТАВІКОЎ

Я даўні падпісчык і чытач штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Кожную пятніцу чакаю прыходу паштальёна. Чытаю газету ўважліва, знаёмлюся з навінамі літаратурнага і культурнага жыцця.

Але вось работа слуцкіх паштавікоў вельмі засмучае. У апошні час стаў атрымліваць толькі палову «ЛіМа». Што гэта значыць? Адну пятніцу в паштовай скрынкі вымаю першы сшытак (старонкі 1—8), у другую да мяне трапляюць ужо старонкі 9—16. У чым справа? Ніяк не магу разгадаць сакрэтаў штукарстваў слуцкіх паштавікоў.

**Рыгор РОДЧАНКА,**
настаўнік.

# «БЕЗ НАДЗЕІ НА ДРУКАВАННЕ...»

## *Ліст Янкі Лучыны Доўнар—Запольскаму*

6 ЛІПЕНЯ споўнілася 125 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта-дэмакрата Янкі Лучыны (І. Неслухоўскага). Думаецца, што чытачам будзе прыемна пазнаёміцца з лістом яго М. Доўнар-Запольскаму, што захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве УССР у Кіеве і дасюль не быў вядомы шырокай грамадскасці і даследчыкам гісторыі беларускай літаратуры.

Як вядома, з маладых гадоў М. Доўнар-Запольскі даследаваў гісторыю і культуру свайго народа. Будучы па спецыяльнасці гісторыкам, ён тым не менш цікавіўся кожным парасткам на беларускай літаратурнай ніве.

З 1886 года, калі ў Мінску пачала выходзіць грамадска-літаратурная газета «Минский листок», Доўнар-Запольскі наладжвае з ёй сувязь, пачынае друкаваць там свае працы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі. Праз газету ён пазнаёміўся і з творчасцю Я. Лучыны, які з першага нумара змяшчаў на рускай і беларускай мовах свае вершы, а таксама пераклады з У. Сыракомлі.

20 лютага 1894 года Доўнар-Запольскі, які канчаў гісторыка-філалагічны факультэт Кіеўскага ўніверсітэта, напісаў Я. Лучыну пісьмо, у якім прасіў таго даслаць творы, апублікаваныя і неапублікаваныя, каб паспрабаваць іх выдаць асобнай кнігай.

У архіве і знойдзены адказ паэта на ліст, які напісаны па-руску. Вось яго змест у маім перакладзе:

«Ласкавы Пане!

Ліст Ваш ад 20 лют(ага) гэтага года я атрымаў. З асаблівай прыемнасцю зараз жа бяруся за пяро, каб адказаць Вам.

Думка пра выданне маіх беларускіх вершаплётных пачынанняў асобнымі брашуркамі даўно ўжо прыходзіла мне ў галаву, ад многіх маіх знаёмых я таксама чуў яе неаднойчы. Па сутнасці, аднак, мне здаецца, няма ў мяне пакуль нічога арыгінальнага, што варта было б асаблівых затрат і клопатаў на выданне. Хіба што выдаць мае пераклады вершаў Л. Кандратовіча? Дык зноў жа ці будзе гэта магчыма: цэнзура зверне ўвагу на крыніцу і не прапусціць.

Зрэшты я не адмаўляюся прапанаваць Вам ці каму б Вы пажадалі тыя нешматлікія мае практыкаванні, якія друкаваліся ў календарах Слупскага і «Минском листке» ў часы яго іншага накірунку. Сёе-тое я мог бы яшчэ дадаць новага, што ўжо валяецца ў мяне ў папяровым хламе, а, можа, і яшчэ, паднатужыўшыся, напішу.

Сам ініцыятарам выдання не магу быць, але калі б яно збылося спрыяць пастараюся.

Ці не будзе Ваша ласка неўзабаве паведаміць мне, калі акажуцца шанцы на выданне. Без мэты, гэта значыць без надзеі на друкаванне, мая і без таго **кульгавая** муза **маўчыць зубы сцяўшы,** (падкрэслена Я. Лучынаю і напісана ім па-беларуску — **Я. С.**).

Гатовы да Вашых паслуг І. Неслухоўскі.

Адр. Губ. г. Мінск,
Кантора Цягі Л. Р. чыг.
Івану Люцыянавічу
Неслухоўскаму
25 лют. 1894 года».

Даследаванне архіва, безумоўна, будзе працягвацца, бо трэба даць адказ на пытанні, якія ўзнікаюць пасля прачытання карэспандэнцыі:

1) Ці пасылаў Я. Лучына свае творы Доўнар-Запольскаму? 2) Калі пасылаў, дык што? 3) Калі пасылаў, дык дзе тое пасланае? 4) Што ж там было ў Лучыны ў «папяровым хламе»? 5) Дзе яно ўсё падзелася? Ці нельга адшукаць і г. д.

Ад сябе магу дадаць, што частка спадчыны паэта ў свой час была надрукавана ў 1932 годзе ў другім нумары часопіса «Нёман», што выходзіў у Вільні.

**Янка САЛАМЕВІЧ.**

---

*Зарубежнае* **АПАВЯДАННЕ**

**Нарадзіўся 14 красавіка 1916 г. у Кракаве.**

**Аўтар аповесцей «Дні паражэння», «Апаленыя агнём», «Крошкі вясельнага торта», «Каменныя табліцы», «З таго берага», шэрагу зборнікаў апавяданняў і папулярных кніг для дзяцей і юнацтва.**

**Яго творы перакладзены на мовы сацыялістычных краін, у тым ліку і на беларускую мову. Неаднаразова быў у Мінску, дзе мае многа сяброў і прыхільнікаў.**

**Лаўрэат шэрагу прэмій, кавалер ордэнаў, дэпутат сейма, прымае актыўны ўдзел у грамадскім і культурным жыцці Польскай Народнай Рэспублікі.**

**Апавяданне, якое прапануем увазе чытачоў, надрукавана ў зборніку «Нясмелы навачоны». Тэму для яго аўтар пачэрпнуў у Індакітаі, дзе, як ён кажа, чалавек з болем вырываецца з перажыткаў мінулага.**

Войцех ЖУКРОЎСКІ

# БРАМЫ БЕЗДАНІ

У ТУЮ ноч Чэн Ю амаль не спаў. У яго галаве нараджаліся з'едлівыя, дасціпныя адказы цяпер, калі ўжо было позна. Ён шаптаў іх, смакуючы або сціскаючы зубы, адганяў непрыемныя заўвагі адпакашнікаў, як камароў, што лезуць назойліва з жаласлівым гудзеннем ля вуха. Западаў у кароткі сон і прачынаўся ад боязі праспаць чаканую пару. Падбягаў да акна, але чырвоны, як твар п'яніцы, месяц толькі трохі пасунуўся ў бок эўкаліптаў ля храма — набліжалася поўнач, аб чым сведчылі галасы неўняў, што кукарэкалі на плоскіх дахах дамоў.

Юнак яшчэ раз перажываў учарашнюю знявагу. Ён не адчуваў сябе горшым ад тых, што пагардліва адштурхнулі яго. Чэн Ю паходзіў са старой, але збяднелай сям'і, заслугі якой у мінулым неаднаразова адзначаліся высокімі пасадамі, настаўнікі і майстры ўлічвалі гэта пры прысваенні яму навуковай ступені.

Экзамены ён здаў добра, аднак на ўрачыстую вячэру яго не запрасілі. Абодва старыя вучоныя ледзьве кіўнулі яму галавой, а вясёлы сябрук Куан Лі ляпнуў веерам па плячах, падганяючы яго хутчэй знікнуць.

Мабыць, яны цяпер канчаюць бяседу. Іхнія твары пачырванелі ад падагрэтага шаосінскага віна і губы блішчаць ад тлустай свініны. Яны гучна сёрбаюць чай, са смакаваннем жуюць зялёныя лісцікі. Іх шасцёра, як раіць стары звычай. Абодва вучоныя, у якіх соль мудрасці асела на скронях, пасадзілі паміж сабой вясёлую, як воск паслухмяную дзяўчыну, глядзяць на яе сваімі слязлівымі вочкамі і падбухторваюць да жартаў. Два ж выпускнікі, якіх старыя раз-пораз сунімаюць то выразам твару, то ўзнятым пальцам, заляцаюцца да маладзенькай дзяўчыны, удовінай дачкі. Свабода куртызанкі пабуджае дзяўчо да свавольстваў. Абедзве вабяць ледзь не наперагонкі. Раптам нечаканы свіст дразда, разбуджанага ў падвешанай пад столлю клетцы, сунімае маладую, яна абрывае непрыстойную песню, яе шчокі гараць румянцам.

Разахвочаныя старэчы, хаця кахане для іх з'яўляецца ўжо толькі накрэсленым адным мазком пэндзліка знакам, праводзяць дзяўчо дамоў. Такім шляхам яны не паставяць пад сумненне пачуццё мужчынскай годнасці. У добрым самаадчуванні яны выцягнуцца на цыноўках і ў ласкавым сне заблытаны знак кахання кампенсуецца карцінай пагодлівай вясны, напевам фантана і радкамі вялікага Лі-Тої-По.

Юнакі ж павядуць куртызанку і на заснуўшай вуліцы зазвініць яе смех, як сярэбраная бразготка. Вызваленыя ад папрочных позіркаў настаўнікаў, напоўненыя пажадлівай нецярплівасцю, як сабакі, спушчаныя са шворкі, яны чапляюцца за яе спадніцу. І яна запрашае іх на кубачак чаю. Вядома, што ў такіх жанчын ёсць сяброўкі, на якіх дастаткова толькі свіснуць. Яны не будуць спрачацца, абдораць іх шчодра, насыцяць. Хлопцы заснуць пад музыку, падобную да сумнага гуку кропляў, што падаюць у фарфоравую ўрну, калі сціхае навальніца. Яшчэ з-пад стомленых вежк, з-за адхінутых шаўковых занавесак, у мігценні ліхтарыка яны зловяць зрокам залацістыя пахучыя жасмінам грудзі з падмаляванымі саскамі, але абмотаныя спом далоні ўжо не змогуць да іх дацягнуцца.

Чэн Ю гвалтоўна падняўся з пасцелі. Яны адракліся ад яго. Падыходзіў толькі для чытання вершаў, як камень да вастрэння пажоў, быў прыдатны ў якасці праціўніка ў дыскусіях, быў нават пажаданы на пагулянках, як весялун, гаварун, але на выпускную вячэру яго не запрасілі.

Не зважаючы на тое, што перад экзаменам яны столькі разоў хадзілі па выкладзеных каменнямі паркавых сцежках і, трымаючыся за далоні, абмяркоўвалі, кім хто будзе, што ім прынясе будучыня. Багатыя сябрукі заўсёды вызначалі яму невысокае месца, хаця і бачылі яго побач з сабой, але пакорлівага, як цень ля нагі.

А юнак лічыў сябе абраннікам лёсу, наканаваным здзяйсняць гераічныя подзвігі. Ён верыў, што прозвішчу Ю верне славу, захопіць багацці аднолькава лёгка, як з гліняпага посуду налівае алей у лямпу, калі агеньчык пачынае мігцець.

Аднакашнікі насміхаліся з яго. Іхнія бацькі былі высокімі чыноўнікамі і судовую справу ведалі так добра, што паміж жорсткіх законаў маглі прапіхнуць любое шарлатанства. Часта перад уваходам у іх дамы прыслужнікі спрэчных бакоў чакалі з кошыкамі, закрытымі шоўкам, ды зайздроснымі позіркамі імкнуліся высветліць вартасць падарункаў, ад якіх залежыў прысуд.

Бацькі іншых юнакоў пазычалі пад застаў, займаліся ліхварствам і грошы заўсёды вярталіся ў іх кішэні з барышом.

А час быў неспакойны. Горад захаплялі генералы. Сышоўшы з коней, растапырыўшы ногі, яны аб'яўлялі, які хочуць атрымаць выкуп. І калі б прынесеная ў лакавых шкатулках сума была пералічаная нават тройчы, усё роўна салдаты бушавалі па хатах, разбівалі скрынкі, грабілі, ажно лямант і дым уздымаліся ў паднябессе.

«Буду генералам, — помстліва думаў Чэн Ю, — струшчу горад, як шкарлупу арэха і вылушчу залатое зерне».

Аднак, каб стацца мандарынам, трэба было купіць пасаду, а каб зрабіцца генералам, трэба плаціць пенсію лучнікам і коннікам.

Не ўсміхалася яму пачынаць кар'еру пісарчуком у банкаўскай канторы, адвакацішкам, якому, калі свежапісаны акт пасее попелам, утыкаюць зняты з раменьчыка дзіравы мядзяк, за які нават жабрак дзякуе пляўком.

Пачынаць салдатам? Каб горла зрабілася жорсткае ад чырвонага пылу і арагавелыя пяткі трэскаліся ў маршах? Ён бачыў, як генерал, пягледзячы на гнеўныя заклікі бубена рыхтавацца да абароны, ціхенька вышмыгваў у паланкіне, а галовы капуноў, захопленых новым агрэсарам, каціліся па каменнях рынку, як дыні.

«Чаму банкіры не лямантуюць, калі трэба плаціць даніну, а плач чуецца толькі ў майстэрнях, крамах і хатах сялян? Чаму для генерала і пераможная, і праіграная бітва прыбаўляе золата і славы ў той час, як коннікі з адсечанымі рукамі, пехацінцы без ног і сляпыя лучнікі павінны жабраваць стукацца ў дзверы?»

«Не, я не здатны караскацца па больш крохкіх чым салома прыступках кар'еры, — думаў Чэн Ю, — я мушу адразу стаць на мармуровай ступені, на непарушным месцы».

Яго сцябаў смех астатніх вучняў. Іх дражніла спакойная ўпэўненасць юнака ў тым, што будучыня ляжа яму пад ногі каляровай і мяккай дарогай.

— Давядзецца табе папрасіць у дасканалых, — здзекваліся яны. — Выкарыстай штогодняе свята... Чакай ля варот храма, можа, дэманы і паслухаюць цябе...

Над горадам, абапертая на абрывістую скалу, высілася пагада. Яе рагатыя дахі, пакрытыя пазалотаю, гарэлі ў сонцы. За алтаром знаходзілася брама, што вяла ў бездань. Адтуль біла гарачыня і смярдзела сеграй, а калі напружыць слых, — даходзілі перамешаныя галасы, крыкі і лямант нябожчыкаў.

З гэтага падзямелля раз у год выходзілі дэманы і пранікалі ў цёмныя манахаў, вычараных трыццацітрохдзённым пастом і пакутамі. Адчыняліся літыя з бронзы брамы храма. Выбягалі апантаныя, імчаліся на вуліцы. Перакульвалі ларкі, латкі і, коўзаючыся па гародніне, хваталі пропаведзямі. Некаторыя пранікалі ў цела жанчын і тыя ў той дзень рабіліся ад іх цяжарнымі. Вось так нараджаліся вучоныя, заканадаўцы, правадыры і паэты... Іншыя ўваскрашалі нябожчыкаў — проста б'ючы кулаком прымушалі іх уцякаць, сляпым жа дазвалялі ўбачыць закапаныя посуды, напоўненыя манетамі. Часта аднак апантаныя знеслаўлялі, лаяліся, ад іх рук разваліваліся сцены палацаў, ад іх позіркаў каласы рысу напаўняліся сажай, яны выклікалі віхуру са скручаным лісцем і рыжым пылам, або навальніцу з градам жаб і вужак. Ашалелыя доўга вар'яцелі на вуліцах, перш чым іх пасінячаных, знясіленых, дрыжачых, з ратамі, поўнымі крыві і сліны, не адносілі на цыноўках у халодны змрок храма.

Чэн Ю не баяўся заступіць дарогу апантанаму, папрасіць ласку здзяйснення. Занадта доўга ён чакаў.

Аднак навука пасеяла ў ім сумненне і ён баяўся асароміцца верай у забабоны. А калі сябрукі кпілі з яго? Можа, усё гэта, што балабоняць пра апантаных, — байкі старых ды паэтаў для тых, хто нездольны дзейнічаць? Для іх Цэнь Люць гуляе, падкідваючы палымянае сонца, а яны чуюць толькі гук музыкі, толькі шолах зменных краявідаў.

— Кладзіся і спі, — пагардліва гаварыў сабе юнак, тузаючы расплеценыя валасы, — застанешся адным з многіх, лісцем сярод лістоты, а звацца будзеш — безыменны.

Зноў дзень будзе пачынацца крыкам вадавоза, дробным, жаласлівым тэпаннем маці, вохканнем старой служанкі, шорахам пальмавага веера, што служаць для распальвання агню. А за акном — гартанныя пахвалы маэстра па фехтаванню і грукат трэніровачных палак, тупат суседскіх хлопцаў, булькане ў клаачнай яме, з якой сяляне чэрпаюць фекаліі і наліваюць у цэбры... Не, не! Сёння ён мусіць пераступіць граніцу будзённасці! Сёння ён выйдзе на сустрэчу з лёсам!

Месяц са здзеклівай усмешкай на азызлым твары прасунуўся паміж эўкаліптамі, скрыўлены рог даху пагады выразна вымалёўваўся ў мігатлівым святле, як дзюба джонкі, увязаў у лёгкіх імглах.

— Ужо час, — прамармытаў юнак. Ён абуўся. Туга падперазаў поясам халат. Папаласкаў рот, плюнуў у далоні і прыгладзіў валасы на скронях.

З паходняй па бамбукавай палцы ён рушыў у напрамку храма. Звілістыя вулачкі вялі яго на вышыню. Разам з ценямі ночы ўцякалі апарцывелыя сабакі, што разграбалі кучы смецця, выкінутага з-за глуха зачыненых чырвоных брам дамоў.

Неба ўзнялося і пасвятлела. Юнак паскорыў крок.

Перад храмам тоўпіліся прагныя цудаў жабракі. Хлопец адсунуў жанчыну, якая чакала, каб дотык апантанага парушыў яе бясплоднае ўлонне. Смела пераступіў ужо страціўшыя ча-

*НАШЫ КАНСУЛЬТАЦЫІ*

# ІДУЧЫ НА ПЕНСІЮ

**ПАРАДАК НАЛІЧЭННЯ ПЕНСІІ ШТАТНЫМ ЛІТАРАТУРНЫМ РАБОТНІКАМ**

У адпаведнасці з п. 47 Палажэння аб парадку прызначэння і выплаты пенсій па дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню штатным літаратурным работнікам газет, часопісаў, ТАСС, выдавецтваў, радыё і тэлебачання пенсія налічваецца, зыходзячы з усяго заработку, уключаючы як службовы аклад, так і тыя грошы, якія выплачваюцца ім з фонду літаратурнага ганарару тых установаў, у якіх яны знаходзяцца ў штаце. Пры гэтым агульная сума заработку ўлічваецца ў межах не звыш 220 рублёў у сярэднім у месяц.

Калі службовы аклад указаных работнікаў перавышае 220 рублёў у месяц, то пенсія ім налічваецца, зыходзячы са службовага акладу, без уліку ганарару.

Ганарар, які ўлічваецца пры налічэнні пенсіі, уключаецца ў заработак таго месяца, у якім фактычна было праведзена налічэнне гэтага ганарару.

Прыведзены вышэй парадак налічэння пенсіі распаўсюджваецца на ўсіх штатных літаратурных работнікаў выдавецтваў, часопісаў, газет, ТАСС, агенцтва друку «Новости», радыё і тэлебачання, непасрэдна звязаных з творчай літаратурнай работай, у тым ліку і на кіруючых работнікаў, галоўных рэдактараў, адказных сакратароў, а таксама на загадчыкаў рэдакцый кніжных выдавецтваў, часопісаў і газет, фотакарэспандэнтаў, мастакоў, рэтушораў, перакладчыкаў і інш.

Ён не распаўсюджваецца на тых штатных работнікаў, якія не звязаны з творчай літаратурнай работай, напрыклад, карэктараў, тэхнічных рэдактараў, выпускаючых і інш. Ім пенсія выплочваецца на агульных падставах.

Дапамога па часовай непрацаздольнасці штатным літаратурным работнікам налічваецца, зыходзячы з заработку, вызначаецца па правілах п. 47 Палажэння, незалежна ад прычыны часовай непрацаздольнасці.

**ПАРАДАК ВЫПЛАТЫ ПЕНСІІ ПА СТАРАСЦІ ЧЛЕНАМ ТВОРЧЫХ САЮЗАЎ**

Працуючым пенсіянерам пенсія па старасці выплочваецца ў памеры 15 рублёў у месяц, калі іх заработак пасля прызначэння пенсіі не перавышае (не лічачы сумы пенсіі) 100 руб.

Пенсіянерам, для якіх устаноўлены больш льготныя ўмовы выплаты пенсіі па старасці ў перыяд работы, пенсія выплочваецца ў парадку, прадугледжаным спецыяльнымі рашэннямі.

Пенсіі пісьменнікам, кампазітарам, работнікам выяўленчага мастацтва, крытыкам - л і т аратуразнаўцам, перакладчыкам, мастацтвазнаўцам, музыкантам і іншым членам творчых саюзаў выплочваюцца з улікам атрыманага імі аўтарскага ганарару. Пры гэтым сумы аўтарскага ганарару ўлічваюцца ў тым месяцы, у якім яны фактычна выплачаны. Калі член творчага саюза на працягу месяца атрымаў некалькі сум ганарару ад розных установаў, то пенсія выплочваецца з улікам агульнай сумы, атрыманай на працягу дадзенага месяца.

Ганарары, атрыманыя за разавыя выступленні ў перыядычным друку (газетах, часопісах і г. д.), разглядаюцца як выплаты аднаразовага або выпадковага характару і не ўлічваюцца пры выплаце пенсіі.

Пенсіянеры абавязаны паведамляць раённым органам сацыяльнага забеспячэння аб атрыманні імі ганарару.

Правіла аб тым, што не ўлічваецца заработная плата за работу ў якасці часовага рабочага або служачага ў межах двух месяцаў у каляндарным годзе, прымяняецца да пенсіянераў — членаў творчых саюзаў толькі ў тым выпадку, калі яны паступаюць на работу ў якасці часовага рабочага або служачага.

**А. ХВАСТОЎ,**
кандыдат юрыдычных навук.

---

лавечы кшталт ногі пракажонага, якога сюды прывезлі на маленькім вазку. Світала. Пагасіў ліхтар. Датыкнуўся да пакрытых драконамі, адлітых з бронзы варот храма. Былі слізкія ад холаду.

— Багі зусім не цікавяцца нашым лёсам, — шаптаў ён. — І слушна, бо чым жа мы, смяротныя, з'яўляемся для іх? Нашы радасці і пакуты — пераменлівасць аблокаў, зморшчыны на вадзе... Але ты, Куін Лінь, Ласкавая Пані, твае два знакі гавораць, Пані, што глядзіш зверху, о Пані, што чуеш галасы ўсіх — дай мне тое, чаго я дамагаюся, аб чым малю...

Гвалтоўна распалялася неба. Месяц адскочыў, бялеў, як адарваны паветраны змей. Днела.

Юнак уздрыгнуў. З глыбіні храма даляцелі нечалавечыя крыкі апантаных манахаў. Нарастала грукатанне драўляных сандаляў. Надбягалі. Зварухнуліся вароты, націснутыя плячыма ашалелых. Нібы флейты заскрыпелі завесы.

На фоне збялелага неба вырысоўваліся дзве худыя з растапыранымі пальцамі рукі манаха. Ён стаяў з узнятай галавой, пуставокі, як статуя, павярнуўшы твар да блакітнай бездані.

Па прыступках, загароджваючы яму дарогу, паўзлі пракажоныя, карабкаліся хворыя. Усе яны галасілі, скардзіліся, прасілі.

Перш чым апантаны хацеў скокнуць на вуліцу, Чэн Ю дабег да яго, моцна ўчапіўся за парванае адзенне, стаў на калені і ўсклікнуў:

— О дасканалы! Выслухай мяне!

Манах павольна павярнуў паголеную галаву.

— Чаго ты хочаш? — спытаў ён гнеўным голасам.

—Дай мне магчымасць нагінаць шыі магутных, бліскаць лязом над галовамі! Хачу мець заўсёды поўную далонь срэбра! Хачу быць славутым!

Грымаса горкай усмешкі скрывіла твар апантанага.

— Многа ты, нахабнік, хочаш загрэбці! Але няхай будзе, хай збудзецца... Перадам я табе часцінку сваёй дасканаласці!

З глыбіні храма выбягалі іншыя манахі, з лопатам шырокіх рукавоў, з расхінутай вопраткай, яны як пугай секлі сустрэчных тоўстымі рукавіцамі, валілі выспяткамі, раўлі як тыгры.

— Раз трапіў я ў гэтае смяротнае цела, то дзеля адной тваёй просьбы не пазбаўлю сябе асалоды разбіць яго аб сцены горада... Аднак усё, што выходзіць з мяне — суцэльная дасканаласць...

Манах адабраў у бліжэйшага жабрака місачку, зробленую з какосавага арэха, прысеўшы, падсунуў яе пад сябе і падаў юнаку.

—Вось табе здзяйсненне! Тут усё — мары і жаданні! На! Жары! Хлябай гэта — гыркнуў апантаны, утыкаючы місачку ва ўмольна выцягнутыя рукі юнака.

Зараз жа, як віхура, манах паімчаўся ўніз па лесвіцы, б'ючыся аб сцены будынкаў.

Чэн Ю схапіў посуд, акунуў пальцы правай рукі і паднёс іх да губ... Смярдзелі.

Здзеклівы рогат апантанага нёсся далёка. Горкае пачуццё расчаравання і агіды выварочвала ўсе вантробы хлопца. Ён адштурхнуў далёка міску, ажно пырснула з яе за каменныя ўсходы.

Але, коцячыся, міска блішчала ў першых промнях сонца, як быццам пакрытая золатам. Юнак зірнуў на далонь — пальцы зіхцелі. Значыцца, гэта было толькі выпрабаванне яго веры?

Ён вяртаўся дамоў задуменны.

Не прайшоў год і ўсе яго пажаданні здзейсніліся. Дэманы ж адорваюць нас, каб паказаць, наколькі мізэрны нашы пажаданні. Іх ласка часта ідзе нам не на карысць, а на шкоду.

Чэн Ю шэптам загадваў, а ўладары і магнаты пакорліва, без пераканяў выконвалі ўсе яго ўказанні. Паклаўшы далонь на патыліцу ён лёгка нагінаў галовы генералаў. Над нахіленымі шыямі ён свабодна махаў лязом, а ў яго кішэнях было многа срэбраных манетак. Ён стаў найбольш славутым не толькі ў горадзе, але ва ўсёй правінцыі Куэйчаў — цырульнікам.

Вырашыла ўсё адна рука. Нават менш — тры пальцы: вялікі, указальны і мізенны, што акунуліся ў дасканаласць.

З польскай мовы пераклаў
Пятро СТЭФАНОВІЧ.

---

Тарнаская газета

Савось АВОСЬ

# АНТЫБАЙКІ

## КАНКРЭТНЫ КЛОПАТ

Зязюлі хацелася надта
Наседзець самой антыяйкі,
Каб вывесці антыпернатых
Для антыбайкі.

## ПА ТЭМУ

Байкар
Сабраўся на Байкал
Пабачыць омуля жыўцом,
Ды па дарозе на вакзал
Сустрэўся з байкаспажыўцом.
Байкар
Прачнуўся ў роднай хаце,
Як дробны часцік у тамаце,
І ўславіў
Бульбу з селядцом.

## СТАНОЎЧЫ ПЕРСАНАЖ

Літфондаўскі сабака
Жук
У Доме творчасці
У лесе
Не ўдзельнічаў у літпрацэсе.
Не ціснуўся пішчом
У друк.
Для байкі
Персанаж станоўчы,
Не да пісьмовага стала —
Бліжэй трымаўся да сталоўкі,
Бо костка
Стымулам была.
Брахаў на лес
І слухаў шум,
У хмыз не лез
Шукаць задум.
А па душэўнай прастаце
Знаходзіў нешта
У хвасце.

Анатоль КУДЗЯН

# ПРАДВЕСНІК СВЯТА — ВОДАР МЫЛА

(НОВАЯ ПРЫКМЕТА)

Запахла святам на зямлі,
Абновай, мылам і духамі.
«З верша Галіны Каржанеўскай «Свята».

Парада ёсць, каб не праспаць
Прыход да нас чырвонай даты:
Запахла мылам — значыць свята,
Пара абноўку адзяваць.

Браты БАРОЎКІ

# НАВАТАРСТВА

— А-а, знаёмы аўтар! Добры дзень! Сядайце, калі ласка. Памятаю, як жа! Першы сказ гучаў так: «Ён устаў, падышоў да пісьмовага стала, узяў сшытак, аўтаручку і пачаў, як звычайна, пісаць вершы». Коратка, канкрэтна, дакладна, але ж — стандарт. Мастацкая і мемуарная літаратура наскрозь прабіта падобнымі штампамі. А чытачу падавай наватарства, экзотыку, сякія-такія выкрутасы, калі хочаце, каб галаву паламаць прымушала.

— Калі ласка, таварыш рэдактар, зірніце. Я перапрацаваў у святле вашых вельмі слушных парад.

— Так — так, памер той жа. Гэта выдатна, вельмі добра, бо я страх не люблю даўгаццё. Чытаю ваш новы варыянт: «Неён устаў, падышоў да некухоннага няпрэсла, не кінуў неяльбом, неаўтакарандаш і не... не закончыў пісаць няпрозу». Гм, гм, м — так. так. Штосьці ёсць, я вам скажу. Калі і ўвесь тэкст вытрыманы ў гэткім жа стылі, то пойдзе. Надрукуем на свой страх... Наватарства без рызыкі — гэта не наватарства. Праўда, так'я сякія словы не зусім зразумелы, «Неён» і «некухоннага» — гэта, зразумела, «ён» і «пісьмовага». А вось далей. Што такое «няпрэсла».

— Значыць, пісьмовы стол, таварыш няаўтар.

— Ага. Напэўна, лавядзецца тамсям даць зносні, а наогул — наватарства на далоні.

— Цу, вельмі доўна, паважаны рэдактар. Вашу няногу!

Людміла ТАЦЬЯНІЧАВА

# ГУЛЬНЯ

Малыя гуляюць у лётчыкаў,
У будаўнікоў, машыністаў,
У геолагаў-разведчыкаў,
У касманаўтаў, танкістаў.

Хлопчыкі любяць гэта.
(Дайце ім гульні сур'ёзныя).
Не гуляюць толькі ў паэтаў.
У паэтаў гуляюць... дарослыя.

Пераклаў М. СКРЫПКА.

Анатоль ГАРМАЦЮК

# ЖОНЧЫНА ЗАГАДКА

ГУМАРЭСКА

Жонка мужу пазваніла:
—Сёння я паліто купіла!
—Зноў сабе?
—Табе, мой любы...
Муж скрывіў гаркава губы.
—Ну чаго так нерваваццa?—
Загулі сябры па працы.
—Ох, не ведаеце, людзі,
Вы маёй кабеты...
Калі мне шнуркі набудзе,
Сабе ж—бранзалеты.
Так... Не будзе мне спакою
Ані ўдзень, ні ўночы.
Мне паліто яна купіла...
Што ж сабе захоча???

Пераклаў з украінскай А. СТАВЕР.

Мікола ЛОЙКА

# БАРАДА

Як нафта, вугаль, ці руда
З глыбінь далёкіх барада...
Па ёй цякуць віно і мёд,
Калі здаволены ўжо рот.
Нібы рубель у пухкі воз
Уросся шчыльна ў яе нос.
Прыемна, добра!
Не бяда,
Што трохі старыць барада.
Затое бачна — вы мужчына!
А гэта важная прычына:
Па невядомай беднаце
Яна ж не ў кожнага расце.
Яна, як яркае выслоўе,
Не сведчыць нейкага саслоўя,
Насіце ж, хлопцы, на здароўе
Ад воч па пояс бараду
Непадуладную суду!

---

# НАДРУКАВАНА Ў «НАСТАЎНІЦКАЙ ГАЗЕЦЕ»

Нумар газеты за 3 ліпеня адкрываецца перадавым артыкулам «Адпачынак і праца—побач». Змешчаны таксама матарыялы «На пасяджэнні калегіі Міністэрства асветы БССР», падборка «Інфармацыя ў нумар», карэспандэнцыя загадчыцы кабінета беларускай мовы і літаратуры Магілёўскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў Л. Міцькавец «Дапамога маладой змене», інфармацыі І. Дзенісевіча «Добры пачатак» і І. Шанькова «Абмяняліся вопытам».

Пад рубрыкай «Партыйнае жыццё: первічная арганізацыя» з артыкулам «Грані эфектыўнасці» выступае сакратар партыйнай арганізацыі Стара-Барысаўскай школы-інтэрната Барысаўскага раёна Г. Барысава. Друкуюцца і артыкулы настаўніка Мар'інагорскай сярэдняй школы № 3, заслужанага настаўніка БССР В. Арлова «Крокі новага прадмета» і А. Кірпічэнкава, У. Касабокава «Акрэсленасць перспектывы».

Чарговае пасяджэнне «Клуба педагагічных сустрэч» «Настаўніцкай газеты» адбылося ў Мінску. У ім прынялі ўдзел выхавацелі і загадчыкі дзіцячых садоў горада, настаўнікі пачатковых класаў, супрацоўнікі гарадскога інстытута ўдасканалення настаўнікаў, Рэспубліканскага метадычнага кабінета, Міністэрства асветы БССР, выкладчыкі педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і педагагічнага вучылішча сталіцы, ветэраны дашкольнага выхавання. Пра яго расказвае спецыяльны карэспандэнт І. Крупеня.

Разнастайныя матэрыялы традыцыйнай старонкі «Патрыёт».

Першая старонка нумара, які выйшаў 7 ліпеня, «У Палітбюро ЦК КПСС. Аб выніках Берлінскай канферэнцыі камуністычных і рабочых партый Еўропы», перадавы артыкул «У авангардзе — камуністы», справаздача з пасяджэння прэзідыума Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, падборка «Весткі з Віцебшчыны».

З іншых публікацый чытача зацікавіць артыкул кандыдата філасофскіх навук Д. Радзюка «Мы — інтэрнацыяналісты», дасланы на конкурс газеты.

Пад рубрыкай «Літаратура — падручнік жыцця» выступае намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Нясвіжскай школы-інтэрната Я. Саковіч—«Запазычана ў перапавікоў». «Фразеалогія Кандрата Крапівы» — артыкул Т. Трыпуцінай і М. Тондзеля.

Змешчан «Стол даведак», аб'явы «Куды пайсці вучыцца».

# СУСТРЭЧЫ, ПОШУКІ, АДКРЫЦЦІ.

ГУЧАЛІ ВЕРШЫ, ГУЧАЛІ ПЕСНІ...

ТУТ ВЫХОЎВАЮЦЦА МУЗЫКАНТЫ

МАРШРУТЫ МУЗЫЧНАГА ЛЕТА

## Свята ў Вязынцы

Каторы ўжо год на радзіме вялікага песняра беларускай зямлі Янкі Купалы адбываецца паэтычнае свята. І кожны раз яно напаўняецца ўсё новым зместам. Сёлета, напрыклад, задумвалася як свята працы, паэзіі і песні, прысвечанае 32-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Яшчэ з самай раніцы 4 ліпеня на аўтобусах, электрычках рушылі сюды святочна апранутыя людзі. З Мінска, Маладзечна, Радашковіч... Шмат сярод іх было ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы, грудзі якіх упрыгожвалі ордэны і медалі.

Старшыня калгаса «Светлы шлях» Маладзечанскага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы Ул. М. Калачык сказаў з добрай радасцю на твары:

— Мы сюды, у Вязынку, да Купалавай хаты прыязджаем у пачатку ліпеня нават без запрашэння. Людзі палюбілі гэтае свята, яно сапраўды зрабілася народным. Адзначаючы дзень вызвалення, шануючы памяць вялікага Купалы, сёння мы тут будзем падводзіць таксама і вынікі працы за першае паўгоддзе. Сярод гэтых людзей, — паказвае ён на працаўнікоў палёў, ферм, — шмат тых, кім ганарыцца маладзечанская зямля. Я назаву толькі некаторых. Гэта у першую чаргу, Соф'я Сямёнаўна Кананович з калгаса імя Леніна, якая за шэсць месяцаў надаіла ад кожнай каровы па 2.332 кілаграмы малака, Ніна Філімонаўна Казлоўская з саўгаса «Яхімоўшчына», на рахунку якой таксама немалы працоўны плён — яна надаіла па 2.200 кілаграмаў малака. З вялікім поспехам працавалі гэтай вясной механізатары, такія як Шамільь Міхайлавіч Мухарскі з саўгаса «Маладзёўшчына», Анатоль Аляксандравіч Сянько з калгаса «Герой працы», Уладзімір Якаўлевіч Ганчарык з саўгаса імя Прытыцкага...

У Вязынцы ўсё нагадвае пра Купалу. Прыхільнікі паэзіі вялікага песняра бясконцым патокам ідуць у хату, дзе дзевяноста чатыры гады назад нарадзіўся паэт. Ля помніка, што стаіць крыху воддаль, шмат кветак.

І як заўсёды, на гэтым свяце шмат столікаў, на якіх прадаюць кніжкі Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, І. Мележа, І. Шамякіна, І. Навуменкі, В. Быкава, М. Аўрамчыка, Р. Барадуліна і іншых беларускіх празаікаў і паэтаў.

Нарэшце, пачынаецца ўрачыстасць. Другі сакратар Маладзечанскага райкома партыі В. А. Ляшковіч дае слова старшыні райвыканкома М. Я. Грыцуку.

— Сёлета, — гаворыць ён,— свята адзначаецца ў абстаноўцы асаблівага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага рашэннямі XXV з'езда роднай Камуністычнай партыі. Працоўныя з гаючым адабрэннем сустрэлі рашэнні з'езда і цяпер з вялікім творчым энтузіязмам ажыццяўляюць іх. У працоўных калектывах разгарнулася масавае сацыялістычнае спаборніцтва за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, за выкананне і перавыкананне народнагаспадарчага плана і сацыялістычных абавязацельстваў першага года дзесятай пяцігодкі.

Шмат цёплых слоў пра Купалаву зямлю, пра яе людзей-працаўнікоў сказаў у сваім выступленні госць з братняй Літвы, першы сакратар Укмергскага райкома партыі Алексас Рыдуліс.

Затым на свяце гаспадарыць паэзія. Адзін за адным да мікрафона на адкрытай эстрадзе падыходзяць беларускія паэты. Вершы, прысвечаныя Купалу, Радзіме, героям дзесятай пяцігодкі натхнёна чытаюць Е. Лось, Ю. Свірка, В. Іпатава, І. Васілеўскі. У літаратурнай частцы свята прынялі таксама ўдзел члены літаратурнага аб'яднання «Купалінка» пры маладзечанскай аб'яднанай газеце «Святло камунізму» — журналіст М. Міцкевіч, настаўнік С. Белы і іншыя.

Працягвалі свята працы, паэзіі і песні самадзейныя артысты. У іх выкананні гучалі беларускія народныя песні, творы савецкіх кампазітараў.

Таццяна ЧЫГРЫНАВА.

Добра вядома ў рэспубліцы прадукцыя Аршанскай фабрыкі мастацкіх вырабаў. Цацкі з саломкі, разьба па дрэву, карункі, ткацтва, дэкаратыўныя кветкі — усё гэта, зробленае ў выглядзе сувеніраў, прыцягвае ўвагу пакупнікоў сваёй прыгажосцю.

Фота М. ХУТАРЭЦКАГА. (БЕЛТА).

## «ДАСВЕДЧАНЫЯ І АКРЫЛЕНЫЯ...»

Плошчу Свабоды мінчане часта называюць музычнай. І гэта не выпадкова: спецыяльная музычная школа, музычнае вучылішча, Саюз кампазітараў БССР, кансерваторыя — усё гэта робіць яе своеасаблівай, непаўторнай. Калі б вы не ішлі па ёй, заўсёды пачуеце гукі музыкі, тут яна нараджаецца, тут выхоўваюцца музыканты, якія нясуць гэтую цудоўную і вечную музыку ва ўсе куткі нашай рэспублікі. Аб музыкантах-прафесіяналах, выпускніках Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага гэтага года расказаў рэктар кансерваторыі, народны артыст БССР Уладзімір Уладзіміравіч АЛОЎНІКАЎ.

— Сёлетні выпуск нашай кансерваторыі, — гаворыць Уладзімір Уладзіміравіч, — 36-ы. Што ж, узрост, як бачыце, сталы. З усёй адказнасцю можам сказаць — зроблена за гэты час нямала. Цяжка знайсці такое месца ў рэспубліцы, дзе б не працавалі нашы выпускнікі. І нам, іх настаўнікам, заўжды прыемна чуць пра іх творчыя пошукі, адкрыцці, поспехі. Вось чаму ўсе мы хвалюемся, калі выпускаем у вялікае жыццё маладых спецыялістаў: ці дастойныя яны высокага звання савецкага музыканта, ці здольны яны данесці да людзей усе тыя веды, якія атрымалі тут і, што самае галоўнае, ці не згубяць, ці пранясуць праз усё жыццё сваю любоў да музыкі, малады запал і натхненне?..

Думаецца, большасць сённяшніх выпускнікоў адказвае гэтым запатрабаванням. Зарука таму — высокія адзнакі, якія атрымалі выпускнікі на дзяржаўных экзаменах. Гэта нас вельмі радуе. Я пералічу толькі некалькі прозвішчаў старшынь экзаменацыйных камісій гэтага года, і вы зразумееце, колькі адказнасці стаяла перад маладымі музыкантамі. Гэта загадчык кафедры навуковага камунізму БДУ імя У. І. Леніна прафесар, доктар філасофскіх навук М. Г. Круцько, прафесар Ленінградскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М. А. Рымскага-Корсакава А. А. Бальшыянаў, прафесар Дзяржаўнай кансерваторыі Літоўскай ССР С. А. Сандзецкіс, прафесар Маскоўскага музычна-педагагічнага інстытута імя Гнесіных А. Л. Іохелес і загадчык кафедры гэтага ж інстытута, дацэнт С. З. Трубачоў, загадчык кафедры камернага ансамбля Дзяржаўнай кансерваторыі Літоўскай ССР, заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі, прафесар Ю. І. Фледжынскас, народны артыст БССР А. М. Генералаў і іншыя... Як кажуць, каментарыі не патрэбны. Вось чаму ў гэтым годзе асабліва прыемна было ўручаць лепшым з лепшых чырвоныя дыпломы. Сярод выпускнікоў пяць выдатнікаў — гэта Святлана і Іван Кундзянкі, Вольга Нікалаева, Ірына Ермалінская і Алена Сердзюкова. Трэба адзначыць, што ўсе яны не толькі выдатна займаліся на працягу ўсяго часу, а прымалі самы актыўны ўдзел у грамадскім жыцці курса і кансерваторыі.

Возьмем для прыкладу сям'ю Кундзянкоў. Абое — імянныя стыпендыяты, пераможцы VI Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, Святлана — дыпламант V Рэспубліканскага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў. Зусім нядаўна пыйшла прыемная вестка з Масквы: Іван Кундзянок здаў экзамены ў асістэнтуру музычна-педагагічнага інстытута імя Гнесіных. Не менш цікавая і другая сямейная пара (дарэчы, на выпускным курсе восем сем'яў) — Наташа і Ігар Хатылёвы. Яны добрыя студэнты, актыўныя камсамольцы і, таксама, як і Кудзянкі — пераможцы першай катэгорыі Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук. Наташа і Ігар па размеркаванню едуць на работу ў маладое Наваполацкае музычнае вучылішча. Упэўнены, што і там яны пакажуць сябе з найлепшага боку. Нельга не сказаць і пра такіх па-сапраўднаму таленавітых хлопцаў і дзяўчат, як, напрыклад, Ніна Харужэнка (вакал), Леанід Фіцерштэйн (баян), Яўген'я Сяргей (віяланчэль), Леанід Нікольскі (вакал), Валерый Селін (аркестравае дырыжыраванне), Эдуард Петрашкевіч (скрыпка)... Усе яны пераможцы і лаўрэаты самых розных музычных конкурсаў, наш гонар і надзея.

Калі гаварыць пра своеасаблівасць, адметнасць 36-га выпуску, то трэба адзначыць не зусім звычайнае размеркаванне на аддзяленні дырыжораў-харавікоў. Справа ў тым, што сёлета некаторыя выпускнікі аддзялення пачнуць работу непасрэдна ў калектывах, прычым, у калектывах вядомых і моцных. Людміла Ран паедзе ў Гомельскую вобласць у Юраўіцкі народны хор, Сяргей Барысаў — у Жодзіна кіраўніком харавой капэлы Палаца культуры БелАЗа, Яўген Хлус — у Оршу, кіраўніком мужчынскага хору Дома культуры завода лёгкага машынабудавання... Выпускнікі разумеюць усю адказнасць і складанасць справы, якая стаіць перад імі. У горад Ліду, у самае маладое ў рэспубліцы музычнае вучылішча мы пасылаем адразу 17 нашых выпускнікоў. Хочацца верыць, што маладыя музыканты, куды б яны ні паехалі, дзе б яны ні працавалі, заўжды будуць памятаць аб вялікім грамадзянскім абавязку творчага чалавека.

...Прагучалі апладысменты ў вялікай зале кансерваторыі. Апошні раз ім апладзіравалі свае: студэнты малодшых курсаў, настаўнікі, бацькі. Магчыма заўтра ім прыйдзецца слухаць апладысменты ў філармоніі ці ў оперным тэатры... Хто ведае?.. Ясна адно, тыя веды, што набылі за гады вучобы ў кансерваторыі яе выхаванцы, застануцца з імі на ўсё жыццё. А яшчэ застанецца работа ў будаўнічых атрадах, шэфскія канцэрты ў калгасах і на прадпрыемствах рэспублікі, агляды, конкурсы, застануцца сябры-аднакурснікі і любімыя настаўнікі, застануцца назаўсёды.

## У ЛІПЕНІ НА ЭСТРАДЗЕ

Ажыўлена сёлета на гастрольных маршрутах эстрадных калектываў. Першыя дні ліпеня ў Мінску сустрэлі пасланцы сучаснай грузінскай песні — з Масквы, дэбютаваўшы на сталічнай сцэне ў цяперашнім артыстычным складзе, да нас прыехаў маладзёжны вакальна-інструментальны «Ансамбль-75» пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Грузінскай ССР Р. Бардзімашвілі. Аматары гэтага жанру пазналі ў выканаўчай манеры гасцей штосьці ад славутага «Арэра», праўда, з новым антуражам і ў новым рэпертуары.

«А гэта, мабыць, і не выпадкова, — адказвае Раберт Бардзімашвілі, — бо я некалі кіраваў... «Арэра». Цяпер новы ансамбль склалі выхаванцы Тбіліскай кансерваторыі. Сярэдні ўзрост артыстаў — 22 гады. Мы не фармальна носім імя — «маладзёжны»... Гэта вызначае і нашы рэпертуарныя шуканні. Дыяпазон вялікі. У першым аддзяленні «Ансамбль-75» выконвае фальклорныя творы і песні сучасных грузінскіх кампазітараў; у другім — песні народаў свету і класіку «ад Баха, Паганіні, Ліста» да тых, хто толькі заваёўвае прызнанне як класік...»

Пасля Мінска грузінскія артысты едуць у Рыгу і Ленінград.

Тым часам афішы запрашаюць нас на канцэрты заслужанай артысткі Малдаўскай ССР Марыі Кадрану. Яе мінчане добра ведаюць. На гэты раз яна знаёміць слухачоў з навінкамі свайго рэпертуару — песнямі пра каханне, пра гарачыя парыванні юнага сэрца, пра абавязак чалавека перад памяццю аб бацьках, што ратным подзвігам праславілі нашу сацыялістычную Айчыну. Спявачка і яе акампаніятары таксама арыентуюцца на маладога слухача, які так ахвотна запаўняе канцэртныя залы ў летні час. Праз тыдзень пачынаюцца выступленні Ленінградскага парад-рэвю, разнастайная праграма якога пазнаёміць гледачоў з дыпламантамі ўсесаюзных аглядаў і фестываляў цырковага і музычнага мастацтва, з сучаснымі мадэлямі мод (гэта складае асобны мастацкі нумар — «100 сучасных...»), з новымі песнямі савецкіх кампазітараў.

З замежных гастралёраў звяртаюць на сябе ўвагу калектывы з Англіі і Японіі. З краіны ўзыходзячага сонца вязуць свае песні артысты джаз-аркестра «Кінгз-Роа» пад кіраўніцтвам Хідэта Канаі з удзелам салістаў Каору Чыга і Юнка Нака. Два вакальна-інструментальныя ансамблі — Доўлі і Мун Лайт — пазначылі сталіцу Беларусі ў сваім маршруце, Ленінград — Вільнюс — Тбілісі — Баку.

НА ЗДЫМКУ — выступае «Ансамбль-75».

Фота Ул. КРУКА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63858 АТ 01264

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела вывучэнчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Хведар ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Барыс БУР'ЯН, Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Ігар ДАБРАЛЮБАЎ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Віктар ПРАТАСЕНЯ, Іраіда САНКОВА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО, Віктар ШЫМУК (адказны сакратар), Рыгор ШЫРМА